НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

Д. А. Крывашэй

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ГЕРМАНСКАЙ АКУПАЦЫІ

*(чэрвень 1941 – ліпень 1944 г.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
«Беларуская навука»
2009

УДК 94(476)“1941/1944”
ББК 63.3(4Беи)62
К85

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук, прафесар Э. Р. Іофе,
доктар гістарычных навук, прафесар А. М. Літвін,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт С. Я. Новікаў

*Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006—2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» (навуковы кіраўнік праграмы — доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ISBN 978-985-08-1014-4**

© Крывашэй Д. А., 2009
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2009

*Маім бацькам – паляку і беларусцы, –*
*гады дзяцінства якіх прыпалі на перыяд вайны,*
*прысвячаю*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

Тэма Вялікай Айчыннай вайны да цяперашняга часу – адна з самых унікальных. Нягледзячы на значную колькасць напісанага, некаторыя пытанні застаюцца маладаследаванымі. Сярод апошніх і гісторыя шматлікіх нацыянальных супольнасцей Беларусі ў час германскай акупацыі. Пад вызначэннем «нацыянальныя супольнасці» ў дадзеным даследаванні аўтар разумее групы нятытульных этнасаў, якія з даўніх часоў пражывалі, знаходзіліся ў пастаянным міжкультурным кантакце, аказвалі ўплыў на гістарычныя працэсы на Беларусі. Ва ўмовах трохгадовага панавання на Беларусі нацысцкай акупацыйнай палітыкі адбылася радыкальная трансфармацыя лёсаў і свядомасці шматнацыянальнага насельніцтва краіны. Вядома, што ў часы сацыяльных узрушэнняў, найбольш значнымі з якіх з'яўляюцца войны, пачуцці нацыянальнай тоеснасці, разуменне сваёй адметнасці актуалізуюцца. Рост этнічнай самасвядомасці прыводзіць да аб'яднання па нацыянальнай прыкмеце, дыферэнцыяцыі грамадства на «сваіх» і «чужых». Як адзначае Н. М. Лебедзева, «калі разбураецца сацыяльная ці дзяржаўная ідэя, на змену ёй прыходзіць больш старажытная і магутная форма структуравання свету – этнічная»[1]. Складаныя рэаліі шматнацыянальнага грамадства Беларусі германскія акупацыйныя ўлады імкнуліся выкарыстаць на сваю карысць, прымяняючы вядомую тактыку «падзяляй і ўладар». Прыярытэты нацыянальнай

[1] Лебедева, Н. М. Введение в этническую и кросс-культурную психологию / Н. М. Лебедева. – М.: Ключ-С, 1999. – С. 11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітыкі былі дакладна вызначаны: дамінаванне сапраўдных арыйцаў, анямечванне і эксплуатацыя некаторай часткі славянскіх народаў, генацыд у адносінах да народаў-ізгояў (яўрэяў, цыганоў) і «лішніх» славян.

На сёння ў Беларусі шмат напісана аб генацыдзе яўрэяў і толькі закранута праблема генацыду цыганоў. Ёсць публікацыі, якія прысвечаны палякам, аднак гісторыя ўкраінцаў, літоўцаў, немцаў (фольксдойчэ), латышоў і татараў амаль цалкам застаецца па-за ўвагай навукоўцаў. Маладаследаванымі з'яўляюцца пытанні арганізацыі і ўтрымання небеларускіх навучальных устаноў, дзейнасці нацыянальных таварыстваў, правядзення культурных мерапрыемстваў.

У дадзенай працы ставіцца задача на прыкладзе гістарычных лёсаў нацыянальных супольнасцей раскрыць характар нацыянальнай палітыкі германскіх акупацыйных улад у розных зонах акупацыі Беларусі (рэйхскамісарыятах «Остланд» (Генеральная акруга Беларусь) і «Украіна» (генеральныя акругі Валынь-Падолія і Жытомір), акрузе Беласток (правінцыя Усходняя Прусія) і зоне тылу групы армій «Цэнтр»), правесці параўнанне гістарычных фактаў, з'яў і працэсаў.

Другім важным момантам у праведзеным даследаванні з'яўляецца вывучэнне спецыфікі нацыянальна-культурнага становішча народаў краіны, выяўленне і асвятленне асноўных вузлоў нацыянальных і этнасацыяльных праблем, якія існавалі сярод мясцовага насельніцтва.

Адразу неабходна заўважыць, што па-за ўвагай засталіся такія старонкі гісторыі, як удзел прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей у партызанскіх атрадах, дзейнасць літоўскіх, латышскіх і іншых паліцэйскіх батальёнаў на тэрыторыі Беларусі. Аўтар толькі ўскосна закранае пытанне дзейнасці Арміі Краёвай і калабарацыйных узброеных фарміраванняў кшталту Рускай вызваленчай арміі, брыгады Камінскага, казацкіх фарміраванняў.

Займаючыся такім складаным пытаннем, як нацыянальнае, аўтар усведамляў, што ў акрэслены перыяд існавалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праблемы з самаідэнтыфікацыяй насельніцтва, адбывалася пастаяннае яго перамяшчэнне. Гэтыя акалічнасці не дазваляюць вызначыць дакладную колькасць асобных нацыянальных груп, змушаюць вельмі асцярожна ставіцца да дадзеных перапісаў, якія праводзіліся падчас акупацыі.

Паводле падлікаў нямецкіх даследчыкаў, на тэрыторыі Беларусі (у межах чэрвеня 1941 г.) пражывалі 10 600 тыс. чалавек. З іх 7880 тыс. (74,3%) беларусаў, 935 тыс. (8,8%) яўрэяў, 925 тыс. (8,7%) палякаў, 590 тыс. (5,6%) рускіх, 162,5 тыс. (1,5%) украінцаў, 90 тыс. (0,9%) літоўцаў, 6,5 тыс. (0,06%) немцаў[1].

У кнізе на аснове матэрыялаў з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных архіваў Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, а таксама Архіва актаў новых у Варшаве, звестак перыядычнага друку перыяду акупацыі, успамінаў сучаснікаў асветлены пытанні палітыкі генацыду яўрэйскага насельніцтва, захадаў па ўмацаванні ролі прадстаўнікоў нямецкай супольнасці, становішча палякаў, украінцаў, рускіх, цыганоў, татараў, літоўцаў і латышоў. Недастатковасць і фрагментарнасць базы крыніц не дазваляюць гаварыць аб усебаковым раскрыцці праблемы. На жаль, не ўдалося адшукаць дастаткова поўных звестак па гісторыі цыганоў і латышоў.

Аўтар спадзяецца, што прапанаванае ўвазе чытача даследаванне паспрыяе больш грунтоўнаму вывучэнню гісторыі нацыянальнай палітыкі акупацыйных улад, а таксама ліквідуе некаторыя «белыя плямы» ў асвятленні лёсаў нацыянальных супольнасцей Беларусі.

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 510. – Воп. 1. – Спр. 108. – Арк. 45–46.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# *Глава 1*

## ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД

Гістарыяграфія гісторыі культуры нацыянальных супольнасцей Беларусі ў гады нямецкай акупацыі (1941–1944) дастаткова сціплая. У шматлікай літаратуры па пытаннях Вялікай Айчыннай вайны аб розных аспектах азначанай тэмы згадваецца толькі ў кантэксце больш значных праблем.

У **беларускай гістарыяграфіі** неабходна вылучыць серыю кніг «Памяць», у некаторых з якіх можна адшукаць інфармацыю па гісторыі нацыянальных меншасцей ў гады акупацыі. На жаль, дадзеная праблема не знайшла адлюстравання ні ў энцыклапедыі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941–1945» (1990), ні ў шасцітомнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (1993–2003). Асаблівасцям нацыянальнай палітыкі акупантаў прысвечаны асобны раздзел калектыўнай працы «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945»[1]. У дадзеным даследаванні згадваецца пра асобую палітыку адносна фольксдойчэ, «польскую акцыю» 1942 г., стварэнне на акупіраванай тэрыторыі Беларусі падраздзяленняў Рускай вызваленчай арміі, Рускай нацыянальнай народнай арміі, Саюза рускай моладзі. Не абышлі ўвагай аўтары і пытанні «ўкраінізацыі» беларускага Палесся, палітыкі акупантаў адносна татараў. Асобны параграф прысвечаны генацыду яўрэйскага насельніцтва. Пра вынішчэнне цыганоў у тэксце толькі адзін сказ[2]. Праведзены аналіз дазволіў аўтарам зрабіць

[1] Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. коллектива), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко [и др.]. – Минск: БЕЛТА, 2005. – С. 139–148.

[2] Тамсама. – С. 140.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вывад аб тым, што «ў галіне міжнацыянальных узаемаадносін акупацыйныя германскія ўлады ў Беларусі побач з каланізацыйна-вынішчальнымі метадамі, генацыдам прымянялі і больш гнуткія падыходы. У нацыянальнай палітыцы гітлераўцаў быў задзейнічаны старажытны прынцып «падзяляй і ўладар», прымяняліся тэрытарыяльныя маніпуліраванні, ціск на розныя нацыянальныя групы насельніцтва і ваеннапалонных, выкарыстанне нацыяналістычных калабарацыяніцкіх узброеных фарміраваняў»[1].

Грунтоўнаму даследаванню вытокаў, заснавання, палітычнай сутнасці і структурнай пабудовы, колькаснага складу і дзейнасці прагерманскіх маладзёжных саюзаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі прысвечаны дысертацыя і манаграфія А. А. Кавалені[2]. У сваёй працы сярод іншага гісторык спыняецца на праблемах унутрысаюзнага жыцця і агітацыйна-прапагандысцкай дзейнасці арганізацый, створаных з ліку небеларускага насельніцтва Беларусі, – Саюза татарскай моладзі і Саюза рускай моладзі. Падобным праблемам – прапагандысцкім аспектам маладзёжнай палітыкі і школьнай справы нямецкай акупацыйнай улады на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь – прысвечаны даследаванні А. Мігуновай[3].

У дысертацыі А. М. Літвіна[4] даследуецца гісторыя станаўлення, палітычная сутнасць, структурная пабудова,

---

[1] Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945. – С. 148.

[2] Каваленя, А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць / А. Каваленя. − Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1999.

[3] Мігунова, А. Прапагандысцкія аспекты маладзёжнай палітыкі і школьнай Справы нямецкай акупацыйнай улады ў Генеральным Камісарыяце Беларусь у 1941–1944 гг. / А. Мігунова // Пытанні гісторыі, метадалогіі і методыкі выкладання: зб. навук. арт. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1998. – Вып. першы. – С. 167–175; Яна ж. Прапагандысцкая і культурна-асветніцкая дзейнасць нямецкай акупацыйнай улады ў генеральнай акрузе Беларусь (1941–1944): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. А. Мігунова; БДПУ імя М. Танка. – Мінск, 1999.

[4] Літвін, А. М. Антысавецкія ваенна-палітычныя фарміраванні на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1944 гг. Вытокі. Структура. Дзейнасць: аўтарэф. дыс. ... докт. гіст. навук: 07.00.02 / А. М. Літвін; НАН Беларусі. Ін-т гіст. – Мінск, 2000; Ён жа. Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супрацiву і калабарацыі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2000.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

колькасны склад, баявая і прапагандысцкая дзейнасць антысавецкіх ваенна-палітычных фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў гады акупацыі. Для нашага даследавання асабліваю цікавасць уяўляе інфармацыя аб латышскіх, украінскіх і літоўскіх паліцэйскіх фарміраваннях, аб дзейнасці казакаў.

Феномен калабарацыянізму, яго формы, маштабы і асаблівасці на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі даследаваў І. Сервачынскі[1]. Ён прыйшоў да высновы, што калабарацыянізм у Беларусі не адыграў істотнай ролі, якая магла садзейнічаць умацаванню пазіцый нямецкіх акупацыйных улад.

Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў акупіраванай Беларусі разглядаюцца ў артыкуле А. Кавалені і А. Мацко[2]. Нацыянальную палітыку нямецкіх акупацыйных улад на Беларусі асвятляе ў сваіх працах Д. Блізнюк[3]. Даследаванне апошняга пабудавана на параўнанні нацыянальнай палітыкі акупантаў на тэрыторыі заходніх і ўсходніх абласцей Беларусі. Аўтарам робяцца вывады аб тым, што «на тэрыторыі Заходняй Беларусі нацыянальная палітыка акупацыйных улад мела сваю спецыфіку. Тут яны стваралі і выкарыстоўвалі для сваіх мэт напружанасць паміж польскай і беларускай этнічнымі супольнасцямі. [...] Перыяд акупацыі вельмі негатыўна паўплываў на характар і развіццё грамадства і падштурхоўваў яго ў бок канфліктаў і непаразуменняў»[4]. Аўтар падрабязна спыняецца на праявах дадзенага канфлікту, асвятляе яго культурны аспект, таксама звяртае ўвагу

---

[1] Сервачинский, И. Ю. Коллабарационизм на оккупированной территории Беларуси (июль 1941 – август 1944 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / И. Ю. Сервачинский; БГУ. – Минск, 1999.

[2] Каваленя, А. А. Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945) / А. А. Каваленя, А. Н. Мацко // Нац.-дэмаграф. працэсы на Беларусі. – Мінск, 1998. – С. 30–57.

[3] Блізнюк, Д. І. З гісторыі нацыянальнай палітыкі нямецкіх акупацыйных улад на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы навук. канф., Мінск, 6–7 снеж. 2001 г. / У. І. Навіцкі, М. С. Сташкевіч. – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 278–281; Ён жа. Нацыянальная палітыка акупантаў на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. / Д. І. Блізнюк // Вес. НАН Беларусі. – 2003. – № 2. – С. 62–67.

[4] Блізнюк, Д. І. З гісторыі нацыянальнай палітыкі. – С. 281.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на праблему выжывання ў час акупацыі, у прыватнасці на тое, што атрыманне працы часта залежала ад нацыянальнасці прэтэндэнта: «Нацыянальнае паходжанне таксама мела выключна важнае значэнне для людзей, якія працавалі настаўнікамі, медыкамі і служачымі цывільных улад. Для гарадскога жыхара быць прадстаўніком таго ці іншага народа давала магчымасць у некаторай ступені лепш жыць»[1]. Даследчык піша аб выпадках змены нацыянальнасці для ўладкавання на працу.

Пытанні прапагандысцкай і культурна-асветніцкай дзейнасці нямецкай акупацыйнай улады ў Генеральнай акрузе Беларусь даследаваў У. І. Кузьменка[2]. Гісторыі нямецка-фашысцкай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі прысвечана дысертацыя У. Ф. Раманоўскага[3].

Арганізацыя і дзейнасць школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў на захопленай тэрыторыі Беларусі з'яўляецца тэмай даследавання М. Г. Жылінскага. Аўтар на шырокім архіўным матэрыяле паказвае сутнасць палітыкі акупацыйных улад у справе развіцця асветы. Пры гэтым побач з характарыстыкай становішча ў Генеральнай акрузе Беларусь даследчык робіць агляд практыкі вырашэння дадзенага пытання і ў тых рэгіёнах Беларусі, якія ўваходзілі ў склад іншых тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак. Сярод іншага адзначаецца, што на дзейнасць сістэмы адукацыі ў генеральных акругах Валынь-Падолія і Жытомір «значна ўплывалі нацыянальныя камітэты самадапамогі (украінскія, рускія, польскія і беларускія)», што з'яўляецца «прынцыповым адрозненнем сістэмы адукацыі на тэрыторыях, якія ўваходзілі ў склад Рэйхскамісарыята «Украіна»,

[1] Блізнюк Д. І. Нацыянальная палітыка акупантаў... – С. 65.

[2] Кузьменко, В. И. Пропагандистское обеспечение оккупационного режима в Беларуси и особенности культурной политики нацистов (1941–1944 гг.) / В. И. Кузьменко // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 16 мая 2003 г. / гал. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск: МДЛУ, 2003. – С. 104–110.

[3] Романовский, В. Ф. Немецко-фашистская оккупационная политика и ее крах в Белоруссии (1941–1944): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. Ф. Романовский; Акад. наук БССР. Отд-ние обществ. наук. – Минск, 1974.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад сістэмы адукацыі ў ГАБ»[1]. Разглядаючы школьную справу ў больш шырокім кантэксце нацыянальнага пытання, аўтар заўважае: «Германскія ўлады вялі ў Беларусі двайную палітыку: з аднаго боку, афіцыйна падтрымлівалі нацыянальныя імкненні беларусаў, а з другога – нацкоўвалі палякаў, рускіх і ўкраінцаў на беларусаў і наадварот. Аднак былі і выключэнні. У параўнанні з паўднёвымі ўсходнія вайсковыя ўлады не займаліся прымусам у справе выбару мовы навучання ў пачатковай школе. На развіццё моўнай сітуацыі германскія ўлады тут не аказвалі ўздзеяння. Яна залежала перш за ўсё ад жаданняў і магчымасцей дзеячаў у галіне культуры і асветы як рускай, так і беларускай нацыянальнасці»[2].

Асаблівасці стану акупацыйнага друку ў розных зонах акупацыі Беларусі разгледжаны ў манаграфіі С. Жумара. Аўтар звяртае ўвагу на асаблівасць перыёдыкі, якая выходзіла ва Усходняй Беларусі. Для апошняй характэрныя «ў цэлым вельмі пасрэдны ўзровень публіцыстыкі, ідэйная арыентацыя на «новую» Расію і «рускую ідэю», дамінаванне рускамоўных выданняў, іх прыярытэтнае фінансаванне і забеспячэнне. Газеты на беларускай мове, як правіла, мелі малы наклад і з'яўляліся дадаткамі да рускамоўных газет. Нацыянальны характар і нацыянальная праблематыка выражаны ў іх, безумоўна, больш бледна, чым у аналагічных выданнях у Мінску, Слуцку, Баранавічах і іншых гарадах»[3]. Аўтар падкрэслівае антырускую і антыпольскую накіраванасць беларускамоўнай прэсы. Пры гэтым адзначаецца, што «найбольш характэрны антыпаланізм для заходнебеларускіх выданняў»[4].

[1] Жылінскі, М. Г. Адукацыя на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.): манаграфія / М. Г. Жылінскі; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2006. – С. 72.

[2] Тамсама. – С. 75.

[3] Жумарь, С. В. Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны / С. В. Жумарь. – Минск: БелНИИДАД, 1996. – С. 191.

[4] Тамсама. – С. 150.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобныя праблемы адносін акупацыйных улад да польскага насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у прыватнасці Гродзеншчыны, між іншым разглядаюцца ў дысертацыі В. Барабаша[1]. Пытанні становішча польскага насельніцтва Беларусі, міжэтнічных стасункаў у перыяд акупацыі закранаюць у сваіх даследаваннях С. Барадзін[2] і Т. Кручкоўскі[3]. У 2004 г. выйшла сумесная праца гродзенскіх даследчыкаў «Польскае падполле на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі (1939–1954 гг.)»[4]. У ім асобны параграф прысвечаны палітыцы нямецкіх акупацыйных улад адносна польскага насельніцтва. Польска-беларускаму канфлікту ў Генеральнай акрузе Беларусь прысвечаны артыкулы Ю. Грыбоўскага[5] і А. Калодкі[6].

Комплекснае даследаванне нацысцкай палітыкі генацыду ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва заходніх абласцей Беларусі ў трох зонах акупацыі правёў Я. Разенблат[7]. Тэме лёсу яўрэяў у гады вайны прысвяцілі свае даследаванні Э. Іофе[8] і Л. Смілавіцкі[9].

---

[1] Барабаш, В. В. Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. В. Барабаш; БДПУ им. М. Танка. – Минск, 1999.

[2] Borodin, Z. Nieman – rzeka niezgody. Polsko-radziecka wojna partyzanska na Nowogródczyźnie 1943–1944 / Z. Borodin. – Warszawa, 1999; Borodin, Z. Polska ludność Nowogródczyzny w okresie okupacji sowieckiej i niemieckiej (1939–1944) / Z. Borodin // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы междунар. научн. конф., Гродно, 16–18 нояб. 2001 г. / Обществ. об-ние «Союз поляков на Беларуси». – Гродно: ОО «Союз поляков на Беларуси», 2003. – С. 212–218.

[3] Kruczkowski, T. Polacy na Białorusi na tle historii i wspólczesności / T. Kruczkowski. – Слоним: ГОУПП «Слоним. Тип.», 2003.

[4] Ситкевич, С. А. Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939–1954 гг.) / С. А. Ситкевич, С. А. Сильванович, В. В. Барабаш, Н. А. Рыбак. – Гродно: ГГАУ, 2004.

[5] Грыбоўскі, Ю. Польска-беларускі канфлікт у Генеральнай акрузе «Беларусь» (1941–1944 гг.) / Ю. Грыбоўскі // Białoruskie Zesz. Historyczne. – 2006. – N 26. – S. 116–167.

[6] Калодка, А. Беларуска-польскія адносіны ў Вялейшчыне пад час нямецкай акупацыі 1941–1944 гг. / А. Калодка // Зважай. – 1981. – № 1. – С. 2–4.

[7] Розенблат, Е. С. Нацистская политика геноцида в отношении еврейского населения западных областей Беларуси. 1941–1944 гг.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. С. Розенблат; НАН Беларуси, Ин-т ист. – Минск, 1999.

[8] Иоффе, Э. Г. Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941–1945 / Э. Г. Иоффе. – Минск, 2003; Он же. Страницы истории евреев Беларуси. Краткий науч.-попул. очерк / Э. Г. Иоффе. – Минск: АРТИ-ФЕКС, 1996.

[9] Смиловицкий, Л. Л. Катастрофа евреев в Белоруссии, 1941–1944 гг. / Л. Л. Смиловицкий; предисл. Д. Романовского. – Тель-Авив: Б-ка Матвея Черного, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэлігійнае жыццё ў гады Вялікай Айчыннай вайны разглядае У. Навіцкі ў калектыўнай манаграфіі «Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.)»[1]. Гісторыі праваслаўнай царквы ў Беларусі ў гэты ж перыяд прысвечаны працы С. Сілавай[2], іерадыякана Васілія (Касцюка)[3]. Палітыку акупантаў адносна рэлігіі даследаваў У. Кузьменка[4].

Становішчу каталіцкага касцёла на Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны прысвечана манаграфія Э. Ярмусіка[5]. Аўтар падрабязна спыняецца на характарыстыцы канфесійнай палітыкі нямецкіх акупацыйных улад у Беларусі, рэлігійнага жыцця ў акупіраванай Беларусі, каталіцкага духавенства ў Арміі Краёвай. Услед за польскімі даследчыкамі гісторык вядзе гаворку аб шырокамаштабнай «польскай акцыі» вясны–лета 1942 г. Яму ж належыць артыкул «Некаторыя аспекты палітыкі нямецка-фашысціх акупацыйных улад у Гродне (1941–1944 г.)»[6], у якім разглядаецца польска-беларускі канфлікт восені 1941 г., пытанні адукацыі і веравызнання. Аўтар толькі згадвае пра існаванне ў Гродне трох нямецкіх школ і аб узнаўленні дзейнасці гродзенскай

[1] Навіцкі, У. Рэлігійнае жыццё ў гады Вялікай Айчыннай вайны / У. Навіцкі // Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.). – Мінск: ВП “Экаперспектыва”, 1998. – С. 216–234.

[2] Силова, С. В. Православная церковь в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1945 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / С. В. Силова; Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы. – Гродно, 1999; Она же. Православная церковь в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1945): монография / С. В. Силова; УО «Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы». – Гродно: ГрГУ, 2003; Она же. Крестный путь: белорусская православная церковь в период немецкой оккупации 1941–1944 гг. / С. В. Силова. – Минск: Белорус. экзархат, 2005.

[3] Иеродьякон Василий (Костюк). История Полесской епархии (1922–1944) / Иеродьякон Василий (Костюк) − Брест: Брест. обл. тип., 1999.

[4] Кузьменко, В. И. Германский нацизм и религия: аспекты оккупацонной ситуации в Беларуси 1941–1944 / В. И. Кузьменко // Другая сусветная вайна: новыя аспекты даследаванняў: матэрыялы міжнар. навук. семінара, Мінск, 1 верас. 2003 г. / адк. рэд. В. Ф. Балакіраў, К. І. Казак. – Мінск: НАРБ, 2004. – С. 96–115.

[5] Ярмусик, Э. С. Католический костел в Белоруссии в годы второй мировой войны (1939–1945) / Э. С. Ярмусік. – Гродно: ГрГУ, 2002.

[6] Ярмусік, Э. С. Некаторыя аспекты палітыкі нямецка-фашысцкіх акупацыйных улад у Гродне (1941–1944 г.) / Э. С. Ярмусік // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэсп. навук. канф. / пад рэд. І. П. Крэня. – Гродна: ГрДУ, 1998. – С. 165–169.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

евангелісцка-лютэранскай абшчыны, дзейнасці ў горадзе Рускага камітэта, філіяла Украінскага таварыства, Літоўскага камітэта і Беларускага нацыянальнага камітэта.

Асаблівасцям арганізацыі самадапамогі на тэрыторыі Брэстчыны прысвечаны артыкул І. Яленскай[1]. Аўтар дае класіфікацыю культурна-асветніцкай дзейнасці, прыводзіць прыклады дзейнасці Украінскага камітэта самадапамогі. У 1999 г. І. Яленская абараніла дысертацыю па тэме «Дакументы нямецка-фашысцкіх акупацыйных органаў кіравання і ўстаноў як гістарычная крыніца (па матэрыялах Дзяржархіва Брэсцкай вобласці)»[2]. У далейшых даследаваннях аўтар, грунтуючыся на матэрыялах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, праводзіць гістарычную рэканструкцыю пытання становішча нацыянальных меншасцей на тэрыторыі Заходняга Палесся (Генеральная акруга Валынь-Падолія). Глыбінёй даследавання вылучаецца артыкул «Дакументы Дзяржархіва Брэсцкай вобласці аб школьнай палітыцы акупацыйных улад, 1941–1944 гг. (крыніцазнаўчы агляд)»[3], у якім прыводзяцца колькасць школ, вучняў, настаўнікаў у беларускіх і ўкраінскіх школах асобных акруг Заходняга Палесся, звесткі аб мове выкладання ў школах, дзейнасці ўкраінскіх рамеснай і тэхнічнай школ. Даследчыца звяртае ўвагу на асаблівасці і адрозненні ў арганізацыі школьнай справы ў Пінскай і Брэсцкай акругах, праводзіць аналіз справаздач школьных інспектараў, заяў настаўнікаў. Ёй жа належыць даследаванне нямецкай палітыкі ўкраінізацыі на тэрыторыі Беларусі, якая ўвайшла

[1] Яленская, І. Э. Арганізацыя самадапамогі на тэрыторыі Брэстчыны (1941–1944) / І. Э. Яленская // Вес. НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 1998. – № 1. – С. 69–70.

[2] Еленская, И. Э. Документы немецко-фашистских оккупационных органов управления и учреждений как исторический источник (по материалам Госархива Брестской области): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / И. Э. Еленская; НАН Беларуси, Ин-т ист. – Минск, 1999.

[3] Еленская, И. Э. Документы госархива Брестской области о школьной политике оккупационных властей, 1941–1944 гг. (источниковедческий обзор) / И. Э. Еленская // Брест. хронограф. – 1999. – Вып. 2. – С. 230–250.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў склад Генеральнай акругі Валынь-Падолія[1]. Даследчыца звяртае ўвагу на той факт, што «ў ходзе рэгістрацыі мясцовага насельніцтва і ўліку суадносін розных нацыянальных груп немцы выявілі яўную супярэчнасць паміж узятым курсам на ўкраінізацыю і рэальнымі ўмовамі. [...] Украінцы патрапілі ў разрад нацыянальных меншасцей. [...] Асаблівасці культурна-этнічнага становішча на Палессі прымусілі немцаў унесці некаторыя карэктывы ў намечаныя планы ўкраінізацыі»[2]. І. Яленская падрабязна спыняецца на дзейнасці ўкраінскіх камітэтаў, заўважае, што з мая 1942 г. на Палессі аднавіла сваю дзейнасць культурна-асветніцкае таварыства «Просвіта», у Брэсце ў сакавіку 1942 г. быў створаны «Украінскі тэатр мініяцюр», які на працягу 1942–1943 гг. рэгулярна выязджаў на гастролі па тэрыторыі Палесся. У Лунінцы і іншых мясцовасцях пры ўкраінскіх камітэтах самадапамогі існавалі аматарскія драматычныя гурткі. На тэрыторыі заходнебеларускага Палесся атрымалі распаўсюджанне перыядычныя выданні, якія выходзілі на Украіне і ў Германіі на ўкраінскай мове. Найбольш значнымі з іх былі штотыднёвыя газеты «Наше слово» (Брэст) і «Пінська газета» (Пінск). Наклады выданняў былі значнымі[3].

Пытанні культурнага жыцця ў горадзе Брэсце даследуе У. Калаткоў[4]. Ён звяртае ўвагу на працэсы, якія адбываліся ў лоне Украінскай праваслаўнай царквы, на месца ў культурна-асветніцкай дзейнасці ў экстрэмальных абставінах ваеннага часу арганізацый самадапамогі, што ствараліся з ведама

[1] Еленская, И. Немецкая политика украинизации Белорусского Полесья. 1941–1944 годы / И. Еленская // Загароддзе-3: матэрыялы навук.-краязн. канф. «Палессе ў XX стагоддзі», Беласток, 1–4 чэрв. 2000 г. / уклад. і агул. рэд. Ф. Д. Клімчука, А. Энгелькінг, В. А. Лабачэўскай. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – С. 208–215.

[2] Тамсама. – С. 209.

[3] Тамсама. – С. 210–211.

[4] Калаткоў, У. Да пытання аб культурным жыцці ў горадзе Брэсце пад час нямецкай акупацыі (1941–1944 гг.) / У. Калаткоў. // Загароддзе-3: матэрыялы навук.-краязн. канф. «Палессе ў XX стагоддзі», Беласток, 1–4 чэрв. 2000 г. / уклад. і агул. рэд. Ф. Д. Клімчука, А. Энгелькінг, В. А. Лабачэўскай. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – С. 216–219.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акупацыйных улад самімі гараджанамі па нацыянальнай прыналежнасці.

Звяртае на сябе ўвагу артыкул У. Тугая і С. Тугай «Фольксдойчэ» ў Беларусі»[1]. Аўтары, між іншым, паспрабавалі вызначыць колькасць гэтай групы насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў гады вайны (звыш 35 тыс. чалавек), даць характарыстыку адносін Германіі да сваіх супляменнікаў, прааналізаваць адносіны фольксдойчэ з астатнім цывільным насельніцтвам. Даследчыкі сцвярджаюць, што «ў шэрагу выпадкаў нямецкая нацыянальная меншасць у Беларусі аказвала нямецкім агрэсарам актыўную дапамогу. Разам з тым значная колькасць «фольксдойчэ» ў Беларусі выступала супраць нацыстаў». У артыкуле знаходзім толькі ўпамінанне аб існаванні нямецкай школы ў Смілавічах. Вывады даследчыкаў супадаюць з высновамі ўкраінскага гісторыка У. Клеца[2], які вывучае аналагічныя праблемы на Украіне.

Трагічны лёс цыганоў на акупіраваных тэрыторыях Беларусі разглядае ў сваёй кнізе «Загадка балтыйскіх цыганоў» Вальдэмар Калінін[3]. Аўтар, звяртаючыся да нямецкіх даследаванняў і дакументаў, малюе карціну трагічнага лёсу народа, згадвае аб існаванні двух цыганскіх канцэнтрацыйных лагераў на тэрыторыі Беларусі. На думку даследчыка, за гады вайны загінула каля 40% цыганскага насельніцтва Беларусі. Генацыду цыганоў прысвечаны артыкул А. Фрыдмана «Невядомы генацыд: знішчэнне беларускіх цыганоў у 1941–1944»[4], у якім разгледжаны асаблівасці правядзення забойстваў у розных зонах акупацыі.

---

[1] Тугай, В. В. «Фольксдойче» в Беларуси / В. В. Тугай, С. М. Тугай // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 22 крас. 2004 г. / гал. рэд. А. А. Каваленя, С. Я. Новікаў. − Мінск, 2004. – С. 178–187.

[2] Клец, В. В. Украинские немцы в условиях оккупации в годы Великой Отечественной войны / В. В. Клец // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, современность): материалы междунар. науч.-практ. конф. 6–8 дек. 2001 г. – Витебск: Изд-во ВГУ им. П. М. Машерова, 2001. – С. 135–138.

[3] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган: Очерки истории, культуры и социального развития балтийских цыган / В. И. Калинин. – Минск: И. П. Логвинов, 2005.

[4] Фрыдман, А. Невядомы генацыд: знішчэнне беларускіх цыганоў у 1941–1944 / А. Фрыдман // Arche. – 2004 . – № 2. – С. 130–142.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобную групу складаюць публікацыі, прысвечаныя ўдзелу прадстаўнікоў розных народаў ва ўзброенай барацьбе. Так, пра змаганне татараў і яўрэяў з акупантамі на тэрыторыі Беларусі пісаў Э. Іофе[1]. Дзейнасць латышскіх паліцэйскіх і ваенных фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі даследавалі А. Літвін[2] і У. Тугай[3]. Удзел немцаў і латышоў у партызанскім руху, дапамога мясцовага нямецкага насельніцтва партызанам разглядаліся ў публікацыях У. Паўлава[4] і У. Тугая[5].

Сярод прац замежных даследчыкаў у першую чаргу засяродзіць увагу неабходна на **нямецкіх**.

Найбольш значным фундаментальным даследаваннем Другой сусветнай вайны з'яўляецца праект дзесяцітомнага выдання «Германскі рэйх і Другая сусветная вайна», распачаты ў 1970-я гг. Фрайбургскім цэнтрам ваенна-гістарычных даследаванняў. Дзевяты том (Ч. 1. 2004) адметны новым падыходам да вайны – даследаваннем не ваенных падзей, а «гісторыі вайны», «гісторыі паўсядзённасці», «гісторыі грамадства»[6].

Адным з першых нямецкіх гісторыкаў, які звярнуўся да праблем *культурнай палітыкі* нацысцкага рэйхсміністэрства акупіраваных усходніх тэрыторый (Усходняга міністэрства), быў Канстанцін фон Штамаці. Ім праведзена даследаванне

[1] Иоффе, Э. К вопросу об участии татар в Великой Отечественной войне на территории Беларуси / Э. Иоффе // Другая міжнар. навук.-практ. канф. «Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі». Да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім. – Мінск, 19–20 тр. 1995 г. – Мінск: БДПУ, 1995. – Ч. 2. – С. 130–137; Он же. Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941–1945 / Э. Г. Иоффе. – Минск, 2003.

[2] Литвин, А. Латышские полицейские (шутцманшафт) батальоны в Беларуси (1941–1944 гг.) / А. Литвин // Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2000. – С. 230–243.

[3] Тугай, У. Латышы ў гады Другой сусветнай вайны / У. Тугай // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность) / материалы междунар. науч.-теор. конф., 6–8 дек. 2001 г. – С. 138–149.

[4] Паўлаў, У. Беларускія немцы ў Вялікай Айчыннай вайне / У. Паўлаў // Полымя. – 1996. – № 2. – С. 240–252.

[5] Тугай, У. Латышы ў гады Другой сусветнай вайны. – С. 138–149.

[6] Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. – München, 2004. – Bd. 9: Die Deutsche Kriegsgesellschaft 1939 bis 1945. Erster Halbband: Politisierung, Vernichtung, Überleben; hrsg. Jörg Echternkamp.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці культурна-палітычнага аддзела Рэйхскамісарыята «Остланд», у склад якога ўваходзіла Генеральная акруга Беларусь, а таксама культурна-палітычнага аддзела Усходняга міністэрства, які пазней быў перайменаваны ў «асобы рэферат навукі і культуры»[1].

Другой падобнага кшталту кнігай з'яўляецца даследаванне Ганса-Дзітэра Хандрака «Рэйхскамісарыят «Остланд». Культурная палітыка германскай адміністрацыі паміж аўтаноміяй і гвалтоўным далучэннем да пануючай ідэалогіі»[2].

Цікавыя вывады ўтрымлівае артыкул Эльке Фроліх «Указанні рэйхсміністэрства народнай асветы і прапаганды адносна культурнай праблемы на акупіраваных абшарах». Даследчыца звяртае ўвагу на няпэўнасць культурна-палітычнага становішча захопленых зямель у першыя месяцы акупацыі. Кіруючая культурна-палітычная лінія ведамства Гебельса прадугледжвала рэзкую процівагу метадам Сталіна. Таму ўзнік план зрабіць культурныя саступкі ў галіне рэлігійнай свабоды, культурнай аўтаноміі і самакіравання. Але ўжо да пачатку 1942 г. культурная палітыка ў адносінах да ўсходніх народаў была асуджана на правал, бо абяцанні насельніцтву і рэальная практыка разыходзіліся. У 1943 г. на змену тэндэнцый у культурнай палітыцы паўплывала развіццё ваенных падзей[3].

Асобна неабходна спыніцца на даследаванні *вынішчэння савецкіх яўрэяў*. Найбольш значнай працай па дадзенай праблеме з'яўляецца «Энцыклапедыя халакосту», падрыхтаваная пры ўдзеле 200 навукоўцаў з розных краін свету. У кнізе змешчаны матэрыялы аб прычынах, ходзе і выніках генацыду яўрэяў у час нацысцкага панавання ў Еўропе[4].

[1] Stamati, C. G. «Kulturpolitik» des Ostministeriums / C. G. Stamati // Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte. – 1956. – N 6.

[2] Handrak, H.-D. Das Reichskommissariat Ostland. Die Kulturpolitik der deutschen Verwaltung zwischen Autonomie und Gleichschaltung 1941–1944 / H.-D. Handrak. – Hannover; München, 1981.

[3] Fröhlich, E. Die Anweisungen des Reichsministeriums für Volksaufklärung und Propaganda bezüglich des Kulturproblems in okkupierten Gebieten / E. Fröhlich // Inter arma non silent Musae. The War and the Culture 1939–1945. – Warszawa, 1977. – S. 238–239.

[4] Enzyklopädie des Holokost. Die Verfolgung der europäischen Juden. – Berlin, 1996. – Bd. 3; hrsg. von E. Jäkel, P. Longerich, J. H. Schöps.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маштабы генацыду яўрэйскага насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі СССР раскрывае Г. Робель у матэрыяле «Савецкі Саюз» у надрукаванай пад кіраўніцтвам В. Бенца калектыўнай працы «Маштабы генацыду. Колькасць яўрэйскіх ахвяр нацыянал-сацыялізму»[1]. Асобнае месца займаюць даследаванні дзейнасці айнзацгруп, якія абапіраюцца на аналіз такіх дакументальных крыніц, як «Зводкі паведамленняў з СССР», «Паведамленні з акупіраванай усходняй тэрыторыі», «Даклады аб дзейнасці і становішчы айнзацгруп службы бяспекі і СД у СССР». Гэта працы Г. Краўсніка[2], Г.-Г. Вільгельма[3], А. Штрайма[4], М. Бросцата[5], Г.-А. Якабсена[6], Ф. Фёрстэра[7].

Некаторыя пытанні жыцця этнічных супольнасцей Беларусі ў перыяд акупацыі асвятляюцца ў шэрагу прац, прысвечаных *гісторыі акупацыі*.

Новае бачанне праблем акупацыі здолеў прадставіць Хрысціян Герлах у працы «Скалькуляваныя забойствы: нямецкая эканамічная і вынішчальная палітыка ў Беларусі 1941–1944 гг.»[8]. Для нас цікавасць уяўляюць прыведзеныя

---

[1] Robel, G. Sowjetunion / G. Robel // Dimension des Völkermords. Die Zahl der jüdischen Opfer des Nationalsozialismus; hrsg. von W. Benz. − München, 1996. – S. 499–560.

[2] Krausnick, H. Die Truppe des Weltanschaungskrieges. Die Einsatzgruppe A der Sicherheitspolizei und des SD 1941/42 / H. Krausnick, H.-H. Wilhelm. – Stuttgart, 1981.

[3] Wilhelm, H.-H. Die Einsatzgruppe A der Sicherheitspolizei und des SD 1941/42 / H.-H. Wilhelm. – Frankfurt am Main; Berlin; Bern; New York; Paris; Wien, 1996.

[4] Streim, A. Das Völkerrecht und die sowjetischen Kriegsgefangenen / A. Streim // Zwei Wege nach Moskau. Vom Hitler-Stalin-Pakt bis zum «Unternehmen Barbarossa»; hrsg. von B. Werner. – München; Zürich, 1991. – S. 291–308.

[5] Broszat, M. Anatomie des NS-Staates: in 2 Bd. Bd. 2: Konzentrationslager. Kommissarbefehl. Judenverfolgung / M. Broszat, H.-A. Jacobsen, H. Krausnick. – Olten, Freibung i. Br., 1965.

[6] Jacobsen, H.-A. Kommissarbefehl und Massenexekutionen sowjetischer Kriegsgefangener / H.-A. Jacobsen // Broszat M., Jacobsen H.-A., Krausnick H. Anatomie des NS-Staates: in 2 Bd. − Olten, Freibung i. Br., 1965. – Bd. 2: Konzentrationslager. Kommissarbefehl. Judenverfolgung. − S. 161–197.

[7] Förster, J. Wehrmacht, Krieg und Holocaust / J. Förster // Die Wehrmacht. Mithos und Realität; hrsg. von R.-D. Müller, H.-E. Volkmann. – München, 1999. – S. 948–963.

[8] Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звесткі аб колькасці насельніцтва, узаемаадносінах розных нацыянальных груп, характарыстыка нацыянальнай палітыкі акупантаў на Беларусі. Аўтар асвятляе дзейнасць айнзацгруп, якія былі практычнымі вырашальнікамі праблем фольксдойчэ, бежанцаў і «яўрэйскага пытання». Апошняму даследчык адводзіць значную колькасць старонак. Х. Герлах – адзін з нешматлікіх гісторыкаў, які звяртае ўвагу на праследаванні акупантамі цыганоў. Ён прыводзіць звесткі аб арыштах і забойствах прадстаўнікоў гэтай групы насельніцтва. Таксама аўтар разглядае пытанні аб пасяленнях узброеных фарміраванняў Камінскага, казакаў і каўказцаў на тэрыторыі Беларусі.

Сярод прац гэтай групы неабходна назваць даследаванні У. Гартэншлегера «Горад Мінск у гады нямецкай акупацыі (1941–1944)»[1], Б. К'яры «Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.)»[2], «Нямецкая цывільная адміністрацыя ў Беларусі 1941–1944»[3], «Ваеннае грамадства: Беларусь ў Другой сусветнай вайне»[4], «Нямецкае панаванне ў Беларусі. Разважанні на лакальным і гістарычным палях»[5], «Гісторыя як вынік гвалту: Беларусь як дзіця дзвюх сусветных войнаў»[6], «Савецкія акупіраваныя тэрыторыі, ці Развагі аб

[1] Gartenschläger, U. Die Stadt Minsk während der deutschen Besetzung (1941–1944) / U. Gartenschläger. – Köln, 1988.

[2] Chiari, B. Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weissrussland 1941–1944 / B. Chiari. – Düsseldorf, 1998. На бел. м.: К'яры, Б. Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.) / Б. К'яры. – Мінск, 2005.

[3] Chiari, B. Deutsche Zivilverwaltung in Weissrussland 1941–1944 / B. Chiari // Militärgeschichtliche Mitteilungen. – 1993. – Bd. 52, H. 1. – S. 67–89.

[4] Chiari, B. Die Kriegsgesellschaft. Weissrussland im Zweiten Weltkrieg (1939–1944) / B. Chiari // Handbuch der Geschichte Weissrussland; hrsg. von D. Bezrau, R. Lindner. – Göttingen, 2001. – S. 408–424.

[5] Chiari, B. Deutsche Herrschaft in Weissrussland. Überlegungen zum lokalen und historischen Umfeld / B. Chiari // Täter im Vernichtungskrieg. Der Überfall auf die Sowjetunion und der Völkermord an den Juden; hrsg. von W. Kaiser. – Berlin; München, 2002. – S. 137–159.

[6] Chiari, B. Geschichte als Gewalttat. Weissrussland als Kind zweier Weltkriege / B. Chiari // Erster Weltkrieg – Zweiter Weltkrieg. Ein Vergleich; hrsg. von B. Thos, H.-E. Volkmann. – Padeborn; München; Wien; Zürich, 2002. – S. 615–631.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нямецкім панаванні ў эпоху сусветных войнаў»[1], Х. Ленхарда «Жыццёвая прастора на ўсходзе: немцы ў Беларусі 1941–1944»[2]. У адзначаных працах на падставе архіўных дакументаў раскрываюцца мэты цывільнай адміністрацыі, праз дзейнасць якой на акупіраванай тэрыторыі ўводзіўся нямецкі «новы парадак». Аўтары імкнуцца да асвятлення дзейнасці розных органаў нямецкай акупацыйнай адміністрацыі праз яе ўплыў на жыццё простых людзей. На першым плане ў даследчыкаў – звычайны чалавек, які пастаўлены ў жорсткія ўмовы выжывання. Перад ім стаяць такія праблемы, як пошук харчавання, адзення, магчымасць мець жыллё, захаваць здароўе, атрымаць працу.

Працяг разважанняў па гэтай тэме знаходзім у артыкуле А. Бракеля «Міжнацыянальныя канфлікты як наступствы нацыянальнай палітыкі савецкай і нямецкай улад» (1939–1944)»[3]. А. Бракель, як і Б. К'яры[4], шукае перадумовы міжнацыянальных канфліктаў перыяду акупацыі ў нацыянальнай палітыцы савецкіх улад у 1939–1941 гг. Гэта датычыць той тэрыторыі Беларусі, якая з пачаткам Другой сусветнай вайны апынулася ў складзе БССР. Аналізуючы палітыку савецкіх улад на новых тэрыторыях, аўтар заўважае: «Так атрымалася, што бальшавікі, якія бралі абавязацельствы па вызваленні нацыянальных меншасцей, у рэшце рэшт, праводзілі палітыку, якая супярэчыла гэтай мэце»[5]. Асноўным быў польска-беларускі антаганізм. Ён атрымаў працяг у перыяд нямецкай акупацыі. Даследчык заўважае,

[1] Кьяри, Б. Советские оккупированные территории, или Размышления о немецком господстве в эпоху мировых войн / Б. Кьяри // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць. – Мінск, 2004. – С. 133–142.

[2] Lenhard, H. «Lebensraum im Osten». Deutsche in Belorussland 1941–1944 / H. Lenhard. – Düsseldorf, 1991.

[3] Бракель, А. Межнациональные конфликты как следствие национальной политики советской и немецкой властей (1939–1944) / А. Бракель // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць. – Мінск, 2004. – С. 77–84.

[4] Гл., напр.: Б. Кьяри. Советские оккупированные территории, или Размышления о немецком господстве... – С. 133–142.

[5] Бракель, А. Межнациональные конфликты как следствие национальной политики... – С. 77–84.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што «нямецкія акупанты яшчэ да самага пачатку вайны супраць Савецкага Саюза разлічвалі на канфлікты паміж рознымі слаямі насельніцтва і на тое, што яны змогуць гэта выкарыстаць»[1]. У выніку праведзенага аналізу аўтар прыходзіць да высновы, што «нацыянальная палітыка акупантаў толькі ў нязначнай ступені адлюстроўвалася на паводзінах насельніцтва», і называе прычыны гэтага: «банальнае жаданне выжыць у гады вайны адсоўвала нацыянальныя канфлікты на задні план»[2].

**Польская гістарыяграфія** таксама мае шэраг даследаванняў, у якіх раскрываюцца розныя аспекты культуры нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі Беларусі. У 2003 г. у Цэнтры ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме пад рэдакцыяй Б. К'яры і Ю. Каханоўскага выйшла калектыўная праца «Польская Айчынная вайна. Гісторыя і міфы пра Армію Краёву з часоў Другой сусветнай вайны». Яе асобныя матэрыялы прысвечаны праблемам каталіцкай царквы, «нацыянальных канфліктаў» на тэрыторыі Заходняй Беларусі, палітыцы «выцяснення палякаў» з мясцовых органаў кіравання на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь[3].

Пытанням змены этнічнай структуры насельніцтва Беларусі ў час нямецкай акупацыі прысвяціў некалькі прац Яўген Міранові́ч[4]. Юрый Туронак у кантэксце нацыянальнай палітыкі фашысцкіх улад разгледзеў праблемы побыту і жыцця людзей пад акупацыяй[5].

---

[1] Бракель, А. Межнациональные конфликты как следствие национальной политики... – С. 81

[2] Тамсама. – С. 82.

[3] Die polnische Heimatarmee. Geschichte und Mythos der Armia Krajowa seit dem Zweiten Weltkrieg; hrsg. von B. Chiari unter Mitarbeit von J. Kochanowski. – München, 2003.

[4] Mironowicz, E. Źmiany struktury etnicznej na Białorusi w okresie okupacji niemieckiej (1941–1944) / E. Mironowicz // Białoruskie Zesz. Historyczne. – 2003. – N 21. – S. 114–116; Ён жа. Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku / E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik. – Białystok: Wyd-wo Un-tu w Bialymstoku, 2005.

[5] Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак. – Мінск, 1993.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экстэрмінацыі польскай інтэлігенцыі ўлетку 1942 г. з тэрыторыі Навагрудчыны прысвечана даследаванне Антонія Галіньскага[1]. Апісваючы падзеі, аўтар звяртае ўвагу на той факт, што ў выніку праведзенай улетку 1942 г. «антыпольскай акцыі» акупантаў былі затрыманы не толькі палякі, але і беларусы, татары, «увогуле тыя, хто перашкаджаў гітлераўскім уладам ці беларускім калабарантам»[2]. У далейшым польская інтэлігенцыя панесла страты ў выніку антыпартызанскай акцыі верасня 1943 г. і ў астатнія дні акупацыі дадзеных тэрыторый. Працяг тэмы «антыпольскага тэрору» знаходзім у працы гэтага ж аўтара «Мартыралогія каталіцкага духавенства ў 1939–1945 гг. у святле дакументаў Інстытута нацыянальнай памяці»[3].

Тэрор на тэрыторыі Віленшчыны даследуе Марыя Варджыньска[4]. Гісторык падрабязна спыняецца на розных аспектах нацыянальнай палітыкі акупантаў на тэрыторыі Віленшчыны (маецца на ўвазе Віленскае ваяводства з такімі беларускімі гарадамі, як Браслаў, Дзісна, Маладзечна, Ашмяны, Паставы, Вілейка). Яна звяртае ўвагу на той факт, што ўжо ў верасні 1941 г. германскія ўлады заўважылі, што на Віленшчыне «паміж палякамі і літоўцамі напружанне ўзрасло да такой ступені, што толькі прысутнасць нямецкіх войскаў стрымлівае адкрыты выбух»[5]. Шавіністычныя настроі літоўцаў у 1942 г. прывялі да сутычак з беларускім насельніцтвам.

[1] Galiński, A. Eksterminacja inteligencji polskiej latem 1942 r. w Nowogródzkim / A. Galiński // Biuletyń Głównej Komisji Badania Zbrodni przeciwko Narodowi Polskiemu – Instytutu Pamięci Narodowej. – 1991. – T. XXXIII. – S. 185–198.

[2] Тамсама. – С. 190.

[3] Galiński, A. Martyrologia duchowienstwa katolickiego w latach 1939–1945 w świetle dokumentów Instytutu Pamieci Narodowej – Komisji Scigania Zbrodni przeciwko Narodowi Polskiemu / A. Galiński // Przeglad Zachodni. – 2003. – N 4. – S. 129–144.

[4] Wardzyńska, M. Terror na okupowanej Wilenszczyźnie w latach 1941–1943 w świetle «Ereignismeldungen aus der UdSSR» i «Meldungen aus den besetzten Ostgebieten» / M. Wardzynska // Biuletyń Głównej Komisji Badania Zbrodni przeciwko Narodowi Polskiemu – Instytutu Pamięci Narodowej. – 1992. – T. XXXIV. – S. 95–111.

[5] Тамсама. – С. 103.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэма беларуска-польскіх стасункаў у час Другой сусветнай вайны працягваецца ў даследаванні Марэка Вяржбіцкага[1]. Ён адзначае, што «распальванне нацыянальных канфліктаў на акупіраванай тэрыторыі было адным з элементаў нямецкай палітыкі, які павінен быў аблегчыць панаванне на шматнацыянальнай зямлі»[2].

У 1999 г. у Польшчы пабачыла свет грунтоўная манаграфія Дарыюша Матэльскага «Немцы ў Польшчы ў ХХ стагоддзі»[3]. На старонках кнігі можна знайсці цікавую інфармацыю па гісторыі нямецкага насельніцтва зямель Заходняй Беларусі, нацыянальнай палітыкі Германіі адносна нямецкай дыяспары, польска-нямецкіх стасункаў у 1939–1945 гг.

Гісторыя татараў у гады Другой сусветнай вайны разглядаецца ў кнізе Яна Тышкевіча «З гісторыі польскіх татараў 1794–1944». У раздзеле, прысвечаным польскім татарскім дзеячам 1925–1944 гг., аўтар распавядае пра грамадскарэлігійную дзейнасць муфція Шынкевіча[4].

Трагічнаму лёсу цыганоў на акупіраваных польскіх землях прысвечаны артыкул Монікі Юшкевічаўны[5]. Ён цікавы агульнай характарыстыкай становішча цыганоў у Трэцім рэйху, выпрацаванай гітлераўцамі расавай класіфікацыі цыганоў і іх этнічнай прыналежнасці, гісторыяй цыганскага лагера ў Лодзі і спробай вызначэння страт сярод цыганоў у Еўропе.

---

[1] Wierzbicki, M. Białorusini i Polacy na Zachodnej Białorusi (ziemie północno – wschodniej II Rzeczypospolitej) w latach II wojny światowej / M. Wierzbicki // ХХ стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў: матэрыялы бел.-пол. навук. канф., Мінск, 20–21 ліст. 2000 г. / адк. рэд. У. Міхнюк, П. Ганцарэк. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 190–205.

[2] Тамсама. – С. 205.

[3] Matelski, D. Niemcy Polski w XX wieku / D. Matelski. – Warszawa: Wyd-wo naukowe PWN; Poznań, 1999.

[4] Tyszkiewicz, J. Z historii Tatarów polskich 1794–1944. Źbiór szkiców z aneksami źrodlowymi / J. Tyszkiewicz. – Pułtusk: Wyższa szkoła humanistyczna w Pułtusku, 1998.

[5] Juszkiewiczowna, M. Tragiczny los cyganów na okupowanych ziemiach polskich w latach 1939–1945 / M. Juszkiewiczowna // Biuletyń Głównej Komisji Badania Zbrodni przeciwko Narodowi Polskiemu – Instytutu Pamięci Narodowej. – 1992. – T. XXXIV. – S. 66–93.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, гісторыя нацыянальных супольнасцей Беларусі ў перыяд германскай акупацыі яшчэ не стала тэмай асобнага даследавання. На сёння існуюць працы, у якіх толькі часткова раскрываецца змест гэтага пытання. Спадзяёмся, што дадзеная манаграфія дазволіць у пэўнай ступені раскрыць праблему, выкліча інтарэс у чытача і паслужыць асновай для далейшых пошукаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# *Глава 2*

## КРЫНІЦЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Увесь комплекс архіўных дакументаў па акрэсленай праблеме можна падзяліць на некалькі груп.

1. Дырэктыўныя дакументы. Да іх адносяцца:

а) дакументы рэйхскамісарыятаў «Остланд», «Украіна», рэйхсміністэрства акупіраваных усходніх тэрыторый, правінцыі Усходняя Прусія;

б) дакументы Генеральнага камісарыята Беларусь;

в) дакументы павятовых, акруговых і гарадскіх камісарыятаў;

г) дакументы раённых упраў.

2. Справаздачы.

3. Статыстычныя дакументы.

4. Кадравыя дакументы: картатэкі, анкеты, спісы.

5. Аўтабіяграфіі.

Агульнае ўяўленне аб **колькасці і тэрытарыяльным знаходжанні** дадзеных груп насельніцтва дазваляюць стварыць дакументы, якія тычацца ***перапісаў насельніцтва***, што былі праведзены восенню 1941 і вясною 1943 г. Напрыклад, сярод матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці (ДАМВ) захоўваецца загад камісара Мінскай акругі раённым бургамістрам ад 27.10.1941 г. аб неабходнасці «зараз жа ўстанавіць з якіх народнасьцей складаецца насельніцтва паасобных раёнаў, менавіта, паасобку немцаў, палякаў, беларусаў, рускіх, літоўцаў, жыдоў і інш. нацыянальнасьцей. Пры гэтым неабходна паасобна скласьці сьпіс моладзі да 16 год»[1] (тут і далей тэксты дакументаў, складзеных на беларускай

[1] Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 127.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мове, падаюцца ў арыгінале). Сярод дакументаў справы 4 фонда 1 (Мінская раённая управа) – спісы насельніцтва Мінскага раёна, абагульненыя па раёне і асобных валасцях, складзеныя з пазначэннем нацыянальнасцей (немцы, беларусы, рускія, літоўцы, палякі, яўрэі і інш.) і падзелам на мужчын і жанчын. Па аналагічным прынцыпе прыводзяцца звесткі аб нацыянальным складзе моладзі да 16 гадоў[1]. У асобных спісах сярод нацыянальнасцей пазначаны татары, латышы, украінцы, чувашы, узбекі, балгары, удмурты, казахі. У ДАМВ захоўваюцца і іншыя спісы аб колькасці і нацыянальнай прыналежнасці грамадзян[2]. У справе 623 гэтага ж вопісу ёсць загад камісара Мінскай раённай управы ад 11 сакавіка 1943 г. усім старшыням валасцей аб правядзенні да 1 красавіка перапісу насельніцтва з падрабязным тлумачэннем правіл складання і запаўнення[3]. У фондзе Гродзенскага павятовага камісарыята знаходзіцца цікавы дакумент – апісанне Гродзенскага павета з дадзенымі па нацыянальным складзе і колькасці насельніцтва, адказ на запыт начальніка Беластоцкага грамадзянскага ўпраўлення аб колькасным і нацыянальным складзе насельніцтва ў Гродзенскім павеце (студзень 1944 г.)[4].

Звяртае на сябе ўвагу анкета, запоўненая ў верасні 1942 г. гродзенскім павятовым камісарам. У ёй закранаецца шэраг пытанняў, адказы на якія дазваляюць дэталёва аднавіць гісторыю этнічных працэсаў, што адбываліся ў той час у краі. Апрача статыстычных звестак па колькасці карэнных немцаў, асоб нямецкай нацыянальнасці, якія пражываюць за межамі Рэйха (фольксдойчэ), беларусаў, палякаў, яўрэяў і літоўцаў, знаходзім звесткі з адзнакай лаяльнасці мясцовых палякаў і беларусаў, актыўнасці насельніцтва ў справах нацыянальнага будаўніцтва, культуры і шмат інш.[5]

[1] ДАМВ. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 74.
[2] Тамсама. – Ф. 1549. – Воп. 1. – Спр. 34. – Арк. 112, 116, 117; Ф. 1039. – Воп. 1. – Спр. 35.
[3] Тамсама. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 512. – Арк. 57.
[4] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 284.
[5] Тамсама. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 251–259.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобна неабходна вызначыць групу дакументаў, у якую ўваходзяць ***спісы насельніцтва па нацыянальнасцях.*** Напрыклад, у ДАМВ захоўваюцца спісы *нямецкага* насельніцтва Мінскага раёна на кастрычнік–лістапад 1941 г.[1] У іх прыводзяцца звесткі пра галаву сям'і і колькасць едакоў, месца жыхарства і працы галавы сям'і. У далейшых дакументах гэтая група насельніцтва называецца «волгадойтш». У гэтым жа архіве захоўваюцца спісы фольксдойчэ, якія пражывалі на тэрыторыі Абчацкай воласці па стане на 25.12.1941 г.[2] і на тэрыторыі Любанскага раёна па стане на 1.05.1943 г.[3] Спісы складзены з пазначэннем усіх сямейнікаў, года і месца іх нараджэння, месца пражывання, нацыянальнасці (апошняе толькі ў выпадку Любанскага раёна). Спіс грамадзян нямецкай нацыянальнасці (фольксдойчэ), якія пражывалі на тэрыторыі Пухавіцкага, Мінскага, Смалявіцкага і Уздзенскага раёнаў, захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ)[4]. Спісы ўтрымліваюць звесткі па валасцях пра месца нараджэння і актуальнага жыхарства, дату нараджэння, веравызнанне, спецыяльнасць фольксдойчэ (не ва ўсіх дакументах утрымліваюцца адразу ўсе пазначаныя пазіцыі). Дакументы датуюцца 26 верасня – 21 кастрычніка 1941 г. Матэрыялы дазваляюць прасачыць рух насельніцтва (у які час з'явіліся на Беларусі і адкуль), правесці аналіз па адносінах да рэлігійных культаў, даць узроставую характарыстыку. Так, толькі на тэрыторыі Смалявіцкага раёна пражывалі 556 чалавек фольксдойчэ, у Пухавіцкім – 139, Мінскім – 564 чалавек. У фондзе Гродзенскага павятовага камісарыята таксама ёсць такога кшталту дакументы[5]. У некаторых справах апрача спісаў знаходзяцца і анкеты фольксдойчэ, перапіска ў справе ўстанаўлення нямецкага паходжання асобных людзей[6]. Акрамя гэтага,

[1] ДАМВ. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 171–176, 193–210.
[2] Тамсама. – Спр. 143.
[3] ДАМВ. – Ф. 1039. – Воп. 1. – Спр. 22.
[4] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 393. – Воп. 4. – Спр. 6.
[5] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 188, 571.
[6] Тамсама. – Спр. 289а, 292, 334, 574.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акупацыйная адміністрацыя складала спісы нямецкіх дзяцей. У некаторых выпадках гэта было звязана з пытаннем адкрыцця школ для дзяцей рэйхс- і фольксдойчэ[1]. Падобныя дакументы знаходзяцца і ў Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці (ДАБрВ)[2].

У фондах НАРБ[3] захоўваюцца датаваны 3.11.1941 г. загад генеральнага камісара Беларусі ўсім абласным камісарам аб прадстаўленні звестак адносна колькасці *татараў,* а таксама распараджэнне ад 26.02.1942 г. аб прадстаўленні звестак пра колькасць прыхільнікаў ісламу. У гэтай жа справе знаходзяцца справаздачы павятовых камісараў з неабходнымі звесткамі па абодвух распараджэннях, што дазваляе атрымаць дастаткова суб'ектыўныя звесткі аб колькасці татарскага насельніцтва на тэрыторыі Генеральнай аругі Беларусь на канец 1941 – пачатак 1942 г. і мусульманскага – на вясну 1942 г. На падставе атрыманых звестак 27 сакавіка 1942 г. у Рыгу была накіравана абагульненая справаздача аб колькасці прыхільнікаў ісламу ў Генеральнай акрузе Беларусь. Справаздача не ўтрымлівае звестак з Вілейкі, Баранавічаў, Ліды і Навагрудка. Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што ў дакуменце прыводзяцца колькасныя звесткі не аб мусульманах, як пазначана ў тэме (Betr.: Anhänger des Islams im Generalbezirk Weißruthenien), а аб колькасці татараў («Im einzelnen verteilen sich die Tataren auf die Gebiete in folgender Weise...»). Статыстычныя звесткі аб колькасці мусульман у Вілейскім (на 6 мая 1942 г.) і Слуцкім (на 12 лістапада 1941 г.) акруговых камісарыятах знаходзяцца ў справе 425[4]. У спісе па Вілейскім акруговым камісарыяце звесткі прыведзены па кожным раёне адпаведна з запытам рэйхскамісара. Дадзеныя табліцы дазваляюць атрымаць звесткі не толькі аб колькасці мусульман, але і аб іх нацыянальнасці, колькасці

[1] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 5. – Спр. 68; ДАМВ. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 145; ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58.

[2] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБрВ). – Ф. 2135. – Воп. 1. – Спр. 7; Ф. 2149. – Воп. 1. – Спр. 8.

[3] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 386.

[4] Тамсама. – Воп. 1.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мячэцей, кіраўніку абшчыны, сувязях з замежнымі магаметанскімі краінамі, жаданні (ці нежаданні) татарскай часткі мусульманскага насельніцтва перасяліцца пасля вайны ў Сярэднюю Азію[1].

Статыстычныя звесткі аб *рускіх* мы здолелі адшукаць толькі ў фондах ДАГрВ. У спісах, складзеных у сакавіку 1942 г., прыводзяцца звесткі па асобных населеных пунктах павета аб колькасці, месцы, даце нараджэння, асобна падаюцца спісы мужчын ад 14 да 60 гадоў з пазначэннем сямейнага становішча[2].

Наступную групу дакументаў складаюць спісы, аўтабіяграфіі, анкеты і заявы супрацоўнікаў медыцынскіх устаноў і школ[3], спісы вучняў школ[4], справы на валасных старшынь[5]. Сярод гэтых людзей былі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Цікавыя анкетныя звесткі даюць уяўленне аб паўсядзённым жыцці і лёсе людзей, дазваляюць высвятліць месца паходжання, веравызнанне і даведацца аб бацьках (у некаторых выпадках – дзядах). Спісы дазваляюць падлічыць долю прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей сярод усіх супрацоўнікаў. Аб пэўнай долі суб'ектывізму інфармацыі сведчаць факты пазначэння людзьмі сваёй нацыянальнасці. Напрыклад, сярод анкет і аўтабіяграфій настаўнікаў школ Плешчаніцкага раёна Барысаўскай акругі знаходзім цікавыя выпадкі вызначэння нацыянальнасці як «каталіцкая». У адной з анкет у графе «нацыянальнасць» слова «паляк» выпраўлена на «беларус»[6]. У аўтабіяграфіі іншай настаўніцы напісана «па нацыянальнасці беларус», а ў анкеце ў графе «нацыянальнасць» – «каталіц-

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 386.

[2] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 6, 11, 14–16, 20, 22–23, 25.

[3] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 3. – Спр. 113, 114, 117; ДАБрВ. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 3, 5, 15, 24; Ф. 2135. – Воп. 1. – Спр. 325, 360, 405; Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 163.

[4] ДАБрВ. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 40, 54; Ф. 2135. – Воп. 1. – Спр. 399; Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 166, 167.

[5] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 3.

[6] Тамсама. – Воп. 5. – Спр. 19.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кая»[1]. Найбольшая колькасць дакументаў захоўваецца ў фондах Пінскага гарадскога упраўлення Пінскага акругавага камісарыята[2] і Пінскага акругавага ўпраўлення Пінскага акругавага камісарыята[3].

Цікавым падаецца «Спіс супрацоўнікаў гарадской аптэкі ў Нясвіжы», які захоўваецца ў фондах ДАМВ (Нясвіжская раённая ўправа)[4]. У ім даюцца падрабязныя характарыстыкі супрацоўнікаў з пазначэннем даты нараджэння, нацыянальнасці, адукацыі, лаяльнасці да ўлад, напрыклад: «Т-вская [прозвішча ў этычных мэтах не называем, стыль захаваны. – *Д. К.]* Марія Броніславовна. 1910 г. полячка, в 1932 г. окончіла учітельскую семінарію в Несвіже. С 33 по 36 г. работала учітельніцей, с 36 г. по сей час работает в Отделе здравоохраненія і аптекі. Отец её работает в Фінотделе і является закалённым польскім шовіністом. В 43 г. он сказал: «ешчо прідёт время когда полякі рускіх і белоруссов будут резать ножамі». Дочь таго же політіческого взгляда і настроенія»[5].

Архіўныя дакументы сведчаць аб дастаткова распаўсюджанай тэндэнцыі насельніцтва да змены нацыянальнасці. Галоўным чынам людзі хадайнічалі аб прызнанні факта прыналежнасці іх не да польскай, а да беларускай нацыянальнасці. У фондах Мінскай раённай управы (ДАМВ) такія заявы захоўваюцца ў некалькіх справах[6].

Асобны комплекс складаюць дакументы нацыянальных камітэтаў узаемадапамогі. У фондах ДАБрВ яны ўтвараюць некалькі фондаў: Украінскага камітэта ўзаемадапамогі, які дзейнічаў у Брэсце ў 1941–1943 гг. (ф. 202), Рускага нацыянальнага камітэта ўзаемадапамогі (1941–1944, ф. 203). У НАРБ

[1] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 5. – Спр. 20. – Арк. 68, 69.

[2] ДАБрВ. – Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 100, 101, 725–741, 832, 866–874, 1109, 1399.

[3] Тамсама. – Воп. 1. – Спр. 175–177, 200, 234, 238–241, 253, 254, 290, 624, 625, 678, 679, 704–708, 724–760, 764–768, 770, 783, 842–850, 878, 879, 893, 894, 895–898, 911, 917–920.

[4] ДАМВ. – Ф. 1549. – Воп. 1. – Спр. 34, 125–128.

[5] Тамсама. – Спр. 34, 125.

[6] ДАМВ. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 6, 516.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўваюцца дакументы аб дзейнасці Саюза рускай моладзі[1], Саюза татарскай моладзі і татарскіх камітэтаў[2]. З названых найбольшую цікавасць маюць дакументы фонда Украінскага камітэта ўзаемадапамогі. У ім знаходзяцца лісты членаў камітэта, заявы з просьбаю працаўладкавання, заявы настаўнікаў і вучняў аб прыняцці на працу і вучобу, прашэнні бацькоў да дырэктара тэхнічнай школы ў Брэсце аб вызваленні ад платы за навучанне, аўтабіяграфіі настаўнікаў, спісы вучняў і настаўнікаў украінскай тэхнічнай школы, падзел гадзін выкладання паміж настаўнікамі школы № 6 у Брэст-Літоўску, спіс настаўнікаў двухгадовай жаночай рамеснай школы ў Брэсце, праграмы выкладання прадметаў у тэхнічнай і пачатковай школах, навучальная праграма для тэхнічнай школы (падрыхтоўчы курс), расклад заняткаў рамеснай школы, спісы супрацоўнікаў Украінскай тэхнічнай школы і спісы супрацоўнікаў на выдачу харчовых картак.

Дакументы дазваляюць сцвярджаць, што ў Брэсце з пачатку жніўня 1941 г. дзейнічаў Рускі камітэт узаемадапамогі. 11 кастрычніка 1941 г. яго старшыня С. Трыбух звяртаўся ў школьны аддзел магістрата па падтрымку адкрыцця трох рускіх школ у горадзе і з прапановай аб выкарыстанні канкрэтных будынкаў для іх непасрэдна ў горадзе (вул. Доўгая, 11), на Кіеўскім прадмесці (вул. Рэйманта, 18), на Граеўцы (вул. Граеўская, 9)[3]. Вядома, што камітэт дзейнічаў да пачатку 1944 г. Пры ім існавала чытальня, загадчыца якой, Лідзія Алыменка, атрымлівала зарплату[4].

Вялікая ўвага ў правядзенні нацыянальна-культурнай палітыкі акупацыйных улад звярталася на *фольксдойчэ*. Асобным раздзелам у распараджэнні № 2 шэфа групы «Цэнтр» ад 13 ліпеня 1941 г. прапісана «Абыходжанне з фольксдойчэ»[5].

---

[1] НАРБ. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 5, 20, 39; Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 7а.
[2] Тамсама. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 5.
[3] ДАБрВ. – Ф. 203. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 30.
[4] Тамсама. – Ф. 2135. – Воп. 1. – Спр. 348. – Арк. 69–69 адв.
[5] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 3. – Спр. 42. – Арк. 1.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У справе 756[1] (НАРБ) знаходзім распараджэнне ад 23.09.1942 г. генеральнага камісара Беларусі «Ахоп, перасяленне і клопат аб фольксдойчэ», перапіску рэйхсміністра па кіраванні ўсходнімі тэрыторыямі з рэйхскамісарам «Остланда» па пытанні прыняцця на грамадзянскую службу фольксдойчэ. Патрабавалася дакладнае вывучэнне звестак аб кожным, хто падае сваё паходжанне як «фольксдойчэ», іх пераправерка і асаблівая асцярожнасць у сумнеўных выпадках. Сярод дакументаў справы 381[2] (НАРБ) знаходзяцца распараджэнні рэйхсміністэрства акупіраваных усходніх тэрыторый і перапіска з ім, Рэйхскамісарыятам «Остланд» і акруговымі камісарыятамі аб адносінах да фольксдойчэ, іх правах і заработнай плаце.

Не заставаліся па-за ўвагай улад і пытанні нацыянальна-культурнага развіцця *мусульманскага* насельніцтва. Вялікую цікавасць мае архіўная справа, у якой сярод іншага прадстаўлена перапіска рэйхскамісара «Остланда» з генеральным камісарам Беларусі аб дзейнасці на тэрыторыі генеральнай акругі муфція Шынкевіча, перапіска муфція з кіраўніцтвам генералкамісарыята аб адкрыцці царкоўных школ у Мінску і Клецку для мусульман, дазвол кіраўніцтва на выкладанне Закона божага ў мусульманскіх школах[3]. У іншых фондах знаходзім ліст камісару г. Мінска ад генеральнага камісара Беларусі з інфармацыяй аб тым, што «імперскі міністр акупіраваных усходніх тэрыторый праяўляе вялікую цікавасць да таго, каб рэлігійнай дзейнасці мусульман не ствараліся ніякія перашкоды, ёй хутчэй неабходна ўсяляк садзейнічаць агульнымі намаганнямі». Таму генеральны камісар Беларусі прасіў «усебакова садзейнічаць адпраўленню рэлігійных абрадаў магаметан і ў горадзе Мінску, выдаць неабходны дазвол на дзейнасць і далей садзейнічаць прадстаўленню мячэці для мусульманскай рэлігійнай дзейнасці»[4].

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1.
[2] Тамсама. – Воп. 30.
[3] Тамсама. – Воп. 1.
[4] Тамсама. – Воп. 1. – Спр. 433. – Арк. 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На падставе архіўных дакументаў можна прасачыць змены галоўных кірункаў нацыянальна-культурнай палітыкі нямецкіх акупацыйных улад. Адным з іх была *школьная справа*. Шэраг канцэптуальных палажэнняў утрымлівае «Часовы школьны парадак», надрукаваны ва «Урадавым весьніку Гэнеральнага камісара Беларусі» (1941. – № 2. – 13 кастр.)[1]. Сярод іх наступныя: «Для жыдоў не ўстанаўліваецца ніякага абавязковага навучання. Жыдоўскія школы нельга арганізоўваць»; «Выкладанне ў школах будзе на беларускай мове. У мясцовасьцях, якія заселены польскаю меншасьцю, павінна быць у школах у кожнай клясе ня менш 6-цёх гадзін на тыдзень заняткаў пабеларуску»; «Выкладаньне рэлігіі зьяўляецца не справай дзяржавы, а справай царквы. Я прадастаўляю праваслаўнай беларускай і каталіцкай царквам выкладаньне рэлігіі па-за школай, паводле кіраўнічых зазначэньняў павятовых камісараў. Трэба мець увагу і на магамэтанскую меншасьць. Прымус да вывучэньня закону Божага будзе карацца»; «Кожнае злоўжываньне школы ў мэтах агітацыі польскай меншасьці будзе цяжка карацца, бо жыццёвы абшар Беларусі ёсьць перш за ўсё для беларускага жыхарства».

У дакуменце аддзела культуры і адукацыі Мінскага гарадскога камісарыята (чэрвень–ліпень 1942 г.) «Аб школьнай справе Беларусі», які захоўваецца ў ДАМВ, заўважаецца: «Нацыянал-чужыя элементы праводзілі на Беларусі сваю эгаістычную палітыку. Расейскі элемент, усёроўна ці ён у манархічную, ці ў рэспубліканскую, ці ў бальшавіцкую фарбу маляваны, застаецца агентам маскоўскага цэнтралізму»[2]. У дакладзе «Аб школьнай справе Беларусі» (1 чэрвеня 1942 г.) з той жа архіўнай справы гаворыцца: «Расейская інтэлігенцыя, якая засталася на Беларусі па Царскай Расеі, імкнецца пашырыць тут уплывы «адзінай недзялімай Расеі» як магутнай дзяржавы»[3].

[1] ДАМВ. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 145–146.
[2] ДАМВ. – Ф. 688. – Воп. 2. – Спр. 2. – Арк. 2.
[3] Тамсама. – Арк. 6.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4 кастрычніка 1941 г. генеральны камісар Беларусі выдаў распараджэнне «Аб стварэнні нямецкіх народных школ», якое захоўваецца ў фондах НАРБ[1]. Меркавалася ўвесці асобнае навучанне для хлопчыкаў і дзяўчынак.

У справе 58 фонда Гродзенскага павятовага камісарыята[2] знаходзіцца перапіска ў справе адкрыцця пачатковай школы для дзяцей рэйхсдойчэ[3], справаздача аб інспекцыі народнай школы для рэйхсдойчэ і народнай школы для фольксдойчэ ў Гродне за 7 ліпеня 1943 г.[4], ліст ад кіраўніцтва Саюза нямецкіх дзяўчат Остланда кіраўніку гарадзенскай акругі з прапановай накіраваць школьную памочніцу для працы ў школе для рэйхсдойчэ[5], дакументы адносна адкрыцця школы для рэйхсдойчэ ў Гродне за жнівень 1942 г.[6], спісы вучняў школы для рэйхсдойчэ[7], паведамленне школьнай рады аб школе для фольксдойчэ ў Гродне ад 7 жніўня 1942 г.[8] У апошнім дакуменце прыводзіцца апісанне школы, колькасць вучняў і характарыстыка наведвання школы, даецца адзнака ведання вучнямі нямецкай мовы, падрабязна характарызуюцца настаўнікі, прыводзяцца рэкамендацыі і заўвагі па арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу[9]. У справе таксама ёсць план заняткаў[10]. Апрача гэтых дакументаў знаходзяцца і матэрыялы па гісторыі развіцця літоўскіх народных школ за жнівень 1942 – люты 1943 г.[11]

На жаль, адносна іншых нацыянальных груп насельніцтва мы не можам гаварыць аб дастатковай колькасці архіўных матэрыялаў. Толькі ў дзвюх справах Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці маюцца звесткі па гісторыі *цыганоў*.

---

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 1.
[2] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58.
[3] Тамсама. – Арк. 197–200.
[4] Тамсама. – Арк. 30.
[5] Тамсама. – Арк. 39.
[6] Тамсама. – Арк. 222–228.
[7] Тамсама. – Арк. 227.
[8] Тамсама. – Арк. 223–224.
[9] Тамсама. – Арк. 224 адв.
[10] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 226.
[11] Тамсама. – Арк. 168–173, 205–206.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сярод дакументаў – данясенне Скідзельскага жандарскага ўчастка аб арышце і расстрэле цыганоў у 1942 г., данясенне бургамістра г. Гродна павятоваму камісару аб заключэнні ў турму г. Гродна цыгана Яна Закшэўскага з жонкаю і трыма дзецьмі за бадзяжніцтва[1], а таксама дакумент аб расправе з групай цыганоў[2].

Комплекс дакументаў па праблеме гісторыі нацыянальных меншасцей Беларусі ў гады акупацыі ўтрымліваецца ў Архіве актаў новых у Варшаве (Archiwum Akt Nowych, AAN). Гэта вопіс 202, які змяшчае дакументы дэпартамента інфармацыі і прэсы Дэлегатуры ўрада Рэчы Паспалітай на акупіраваных тэрыторыях (Delagatura Rządu na Kraj. Departament Informacji i Prasy). Дакументы характарызуюць становішча нацыянальных супольнасцей краіны, міжэтнічныя адносіны, палітыку акупацыйных улад. У Дэпартаменце дзейнічала Усходняя секцыя і Нацыянальнае бюро. Супрацоўнікі апошніх аналізавалі акупацыйную палітыку на ўсходзе, настроі насельніцтва ў цэлым і асобных нацыянальных груп.

Больш поўнаму вывучэнню гісторыі нацыянальных супольнасцей Беларусі дапамагаюць матэрыялы акупацыйнага друку. Сярод газет, якія выдаваліся ў розных зонах акупацыі, неабходна назваць «Менскую газэту» (з 5 лютага 1942 г. выдавалася пад назвай «Беларуская газэта»), «Слонімскую газэту» (з пачатку 1944 г. да 18 красавіка 1944 г. – «Слонімскі кур’ер»), «Беларускую старонку» (выдавалася як беларускамоўны дадатак да газеты «Новый путь» у Віцебску, Оршы, Барысаве), «Новую дарогу» (Беласток), а таксама шэраг газет, якія выдаваліся на рускай мове пад аднолькавай назвай у розных гарадах той тэрыторыі Беларусі, што пераважна знаходзілася ў зоне тылу групы армій «Цэнтр» – «Новый путь» (Гомель, Магілёў, Орша, Віцебск, Лепель, Барысаў, Бабруйск, Баранавічы). На рускай мове выдаваліся «Мозырские известия». На ўкраінскай – «Пін-

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 271. – Арк. 6.
[2] Тамсама. – Спр. 100. – Арк. 43.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ська газета» і «Наше слово» (Брэст). Інфармацыйнай насычанасцю вызначаецца газета «Раніца», якая выходзіла для беларускага насельніцтва ў Германіі і друкавалася ў Берліне. У Лепелі з 1942 да пачатку 1944 г. выдавалася газета «Голос народа», якая з'яўлялася органам арганізацыйнага камітэта Нацыянал-сацыялістычнай працоўнай партыі Расіі і Лепельскага акруговага самакіравання. У Навагрудку ў 1944 г. выдавецтва штаба аб'яднаных казацкіх войск выпускала газету «Казак». У Бабруйску ў 1943–1944 гг. выдаваўся «Офицерский бюллетень РОА» і «На страже Родины».

Шырокае выкарыстанне разнастайных крыніц дапамагло вызначыць агульныя тэндэнцыі нацыянальнай палітыкі акупацыйных улад, правесці рэканструкцыю становішча розных этнічных супольнасцей пад акупацыяй. На жаль, фрагментарнасць крыніц, часам іх недастатковая рэпрэзентатыўнасць не спрыяюць усебаковаму аналізу праблемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# *Глава 3*

# ЗАХАДЫ ПА ЎМАЦАВАННІ РОЛІ ПРАДСТАЎНІКОЎ НЯМЕЦКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

## 3.1. Ці існавала нямецкая «пятая калона»?

Размовы аб спробах стварэння (нароўні з польскай) нямецкай «пятай калоны» пачаліся ў сярэдзіне 30-х гг. мінулага стагоддзя. На мясцовых палякаў і немцаў у тую пару навешваліся ярлыкі «контррэвалюцыянераў і шпіёнаў».

Сапраўды, Германія разлічвала на нямецкае насельніцтва, якое пражывала ў іншых краінах, спадзявалася на яго падтрымку ў правядзенні акупацыйнай палітыкі, у насаджэнні «новага парадку» на захопленых тэрыторыях.

Такая пазіцыя была вызначана Нацыянал-сацыялісцкай рабочай партыяй Германіі (НСДАП) яшчэ ў 1920 г. У першым пункце праграмы партыі, прынятай у 1920 г., вялася гаворка аб неабходнасці «аб'яднання ўсіх немцаў у Вялікую Германію на падставе права народаў на самавызначэнне». У кнізе «Майн кампф» А. Гітлер абвясціў намер аб'яднаць усіх немцаў у адну дзяржаву для таго, каб супрацьстаяць змяшэнню крыві расава чыстых немцаў з іншымі народамі незалежна ад іх грамадзянства.

У самым пачатку Другой сусветнай вайны, 3 верасня 1939 г., польская армія захапіла «Інструкцыю для войскаў, якія дзейнічаюць супраць Польшчы», у якой выказвалася ўпэўненасць у тым, што «нямецкія і іншыя групы ў Польшчы будуць падтрымліваць аперацыі нямецкіх узброеных сіл». У інструкцыі падрабязна пералічваліся абазначэнні і ўмоўныя словы, з якімі мусілі быць азнаёмлены «групы немцаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у барацьбе, і іншыя групы са складу мясцовага насельніцтва» (чырвоныя хусткі з вялікім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жоўтым кругам пасярэдзіне, блакітная нарукаўная павязка з жоўтым кругам або нарукаўныя павязкі са свастыкай)[1].

На справе ўсё выглядала не так добра. Германіі так і не ўдалося атрымаць надзейнай падтрымкі з боку мясцовых немцаў, ператварыць іх у сваю «пятую калону». Як адзначаецца ў кнізе Л. дэ Йонга «Нямецкая «пятая калона» ў Другой сусветнай вайне», у 1941 г. у Берлін была паслана афіцыйная справаздача, у якой, у прыватнасці, вялася гаворка аб тым, што «мясцовыя немцы, нават калі яны не з'яўляюцца камуністамі, маюць цалкам няправільнае ўяўленне аб узаемаадносінах унутры рэйха, а таксама аб нацыянал-сацыялістычных лідэрах. Прадстаўнікам інтэлігенцыі не зразумела пачуццё дыскрымінацыі. Да яўрэяў яны, як правіла, адносяцца абыякава. Паказальным з'яўляецца той факт, што пасля ўступлення нямецкіх войскаў мясцовыя немцы не прынялі зусім ніякіх мераў супраць яўрэяў; больш за тое, яны лічылі яўрэяў бяскрыўднымі людзьмі, якія не выклікаюць ніякай боязі»[2]. Да гэтага ж неабходна дадаць той факт, што фольксдойчэ на тэрыторыях, уключаных у 1939 г. у склад рэспублік СССР, да пачатку вайны фактычна ўжо не было. Як ужо ўпаміналася, у адпаведнасці з германска-савецкімі пагадненнямі ў перыяд з канца 1939 да сярэдзіны 1940 г. амаль усё нямецкае насельніцтва з гэтых тэрыторый выехала ў «Вялікі Рэйх». На думку польскага даследчыка Чэслава Лучака, у выніку міграцыйных рухаў на ўключаных у склад СССР землях немцы практычна зніклі[3]. У адпаведнасці з пашпартызацыяй, праведзенай у верасні 1941 г., у Пінску з больш чым 20 тысяч асоб ва ўзросце звыш 14 гадоў фольксдойчэ налічвалася толькі 23[4].

---

[1] Кичихин, А. Н. Советские немцы: откуда, куда и почему? / А. Н. Кичихин // Военно-ист. журн. – 1990. – № 8. – С. 38.

[2] Цыт. па: Кичихин, А. Н. Советские немцы: откуда, куда и почему? – С. 31.

[3] Łuczak, Cz. Ziemie Wschodniej Rzeczypospolitej pod panowaniem radzieckim (1939–1941 i 1944–1945) / Cz. Łuczak // Biuletyn Głównej Komisji Badania Zbrodni Przeciwko Narodowi Polskiemu – Instytutu Pamięci Narodowej. – 1992. – T. XXXIV. – S. 47–48.

[4] Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 52.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праз тыдзень пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны Гітлер загадаў службе сувязі з нямецкімі нацыянальнымі меншасцямі прыняць тэрміновыя меры па ўліку асоб нямецкай нацыянальнасці на акупіраванай частцы Савецкага Саюза з мэтай вылучэння надзейных з іх на кіруючую працу ў мясцовыя органы нямецкага дзяржаўнага апарату. Дакладных звестак аб колькасці асоб нямецкай нацыянальнасці, якія пайшлі на супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі, няма. У адпаведнасці з уласнымі даследаваннямі, мы можам сцвярджаць, што іх колькасць была нязначнай. Некаторыя факты прыведзены ніжэй.

Сярод беларускіх гісторыкаў першым супраць міфа нямецкай «пятай калоны» выступіў Уладзімір Паўлаў. Ён увёў у навуковы абарот цікавыя і цалкам невядомыя факты аб удзеле немцаў у партызанскіх атрадах, падполлі, актыўным супраціўленні мясцовага насельніцтва акупацыйным уладам[1]. Аб тым, што не спраўдзіліся спадзяванні акупантаў на падтрымку мясцовых немцаў, сведчыць змест адміністрацыйнага распараджэння за № 2 шэфа групы «Цэнтр» ад 13 ліпеня 1941 г. У яго частцы II пад назвай «Абыходжанне з нямецкім народам» заўважалася, што «частка нямецкага народа ў занятай вобласці не ўнушае даверу»[2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2. Выкарыстанне фольксдойчэ ў неваеннай службе

Акупацыйныя ўлады не раз вярталіся да пытання выкарыстання мясцовых немцаў для працы на розных пасадах у органах адміністрацыі, на прамысловых прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы.

19 мая 1942 г. рэйхсміністр акупіраваных тэрыторый выдаў спецыяльнае распараджэнне № І/1/303/42 адносна выкарыстання фольксдойчэ на цывільнай службе. На паса-

[1] Паўлаў, У. Беларускія немцы ў Вялікай Айчыннай вайне / У. Паўлаў – Полымя. – 1996. – № 2. – С. 241–242.

[2] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 3. – Спр. 42. – Арк. 1.

ды ў цывільным кіраўніцтве гэтыя людзі браліся «часткова з-за недахопу адпаведных сіл». Пры гэтым дапускалася магчымасць няпоўнага прывядзення імі доказаў сваёй прыналежнасці да нямецкай нацыі. «Часта адным з доказаў служыць іх веданне нямецкай мовы, пашпарты ўсіх відаў звычайна несапраўдныя. Неабходна мець на ўвазе, што паколькі шмат хто з яўрэяў у Савецкім Саюзе размаўляў па-нямецку, а таксама тое, што кіраўніцтва СССР прымушала некаторую колькасць савецкіх грамадзян у сувязі з палітычнымі намерамі вывучаць нямецкую мову, мэтазгодным здаецца адносна пацвярджэння паходжання фольксдойчэ ўстанавіць жорсткія патрабаванні. Тыя людзі, якія выдаюць сябе за фольксдойчэ, павінны як мінімум быць у стане даць дакладныя звесткі пра сваіх бацькоў, дзеда і бабу, аб сваіх родных мясцінах і да таго падобнае. У выпадку паходжання фольксдойчэ з занятых рэгулярнай арміяй абласцей у сумнеўных выпадках звесткі могуць быць перапраўлены. Да немцаў з Паволжа ці з іншых да цяперашняга часу не акупіраваных тэрыторый трэба падыходзіць з асаблівай асцярожнасцю. Асобы, якія маюць іншыя гены, асабліва яўрэйскія, у любым выпадку не могуць разглядацца як фольксдойчэ. Непераселеныя фольксдойчэ з абласцей, у якіх перасяленне ўжо адбылося, да дзейнасці на нямецкіх пасадах больш не дапускаюцца». Рэйхсміністр прасіў паведамляць «аб сённяшняй сітуацыі з фольксдойчэ, якія занятыя ў цывільным кіраўніцтве, асабліва аб тым, як глыбока перапраўлена іх паходжанне»[1].

Наколькі ўважліва немцы ставіліся да праверкі дадзеных асоб, можа служыць наступны факт. У жніўні 1941 г. бургамістрам у Новы Двор Заслаўскага павета быў прызначаны беларус Уладзімір Гейнэ. Ён нарадзіўся ў 1883 г. у г. Себеж у сям'і бухгалтара. Згодна з анкетай, сам Уладзімір, яго бацькі і бабка былі беларусамі, але дзед – немец, лютэранін. Яго дакументы былі адпраўлены на дадатковае

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 756. – Арк. 8.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаванне адносна прыналежнасці да фольксдойчэ. Кіраўніку раённых службаў СС і паліцыі з адзнакай «пасля праверкі лічыць сапраўдным» паведамлялася: «Дзед бургамістра Гейнэ ў Новым Двары павінен быць немцам. Доказы маюць вялікую сілу пры дапамозе завераных дакументаў, якія, аднак, не прыкладзены. Калі і дзе нарадзіліся бацькі Гейнэ, не можа быць устаноўлена. Але яны павінны быць вядомыя ў Германіі. Ці так – гэта нават для Гейнэ застаецца невядомым. Той мізэр, які ён вывучыў з нямецкай мовы, адкрывае іншыя магчымасці. Яго выказванні, што ён ахвотна хоча аддаць сваіх дзяцей у нямецкую школу, яшчэ не даказваюць яго прыналежнасці да нямецкай нацыі. Калі таксама, акрамя гэтага, невядома нічога адмоўнага ў яго паводзінах, то сапраўды спачатку неабходна яшчэ пачакаць, паглядзець на тое, як ён будзе паводзіць сябе ў далейшым. Як устаноўлена саветам, Гейнэ каталіцкага веравызнання»[1].

Вось такое заключэнне. І гэта нягледзячы на тое, што Гейнэ ў анкеце адзначыў, што быў двойчы рэпрэсіраваны. Першы раз – у 1933 г. – знаходзіўся пад следствам НКУС па падазрэнні ў шпіянажы, другі раз – у 1937 г. – адсядзеў 12 месяцаў за тое ж самае.

Немцы распрацавалі спецыяльную форму анкеты для працоўных і служачых. Яна змяшчала пункты аб веравызнанні і этнічнай прыналежнасці не толькі самога прэтэндэнта і яго бацькоў, але і яго дзядоў і бабак па бацькоўскай і мацярынскай лініі. Гэта дапамагала немцам больш падрабязна прасачыць радаслоўную. Аналіз анкет дазваляе папоўніць спіс асоб нямецкага паходжання. Прычым людзі вельмі свабодна вызначалі сваю нацыянальную прыналежнасць (гэта асобная тэма для даследавання аб нацыянальнай тоеснасці). Так, сярод 12 фельчараў Мінскай акругі ў 1942 г., адпаведна спісу, быў толькі адзін прадстаўнік небеларускай нацыянальнасці – украінец. Аднак пры больш пільным знаёмстве з аўтабіяграфіямі супрацоўнікаў выяў-

---

[1] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 2. – Спр. 69. – Арк. 9.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляюцца цікавыя факты. Напрыклад, у Каладзішчанскім медучастку працаваў беларус Эдуард Іванавіч Эрдман, які нарадзіўся ў Дзвінску. Прозвішча сведчыць аб наяўнасці іншых каранёў. З анкеты можна даведацца, што яго бацька – беларус лютэранскага веравызнання, што беларусам не ўласціва. Гэтай жа веры і дзед, нацыянальнасць якога запісана «немец». Маці – беларуска, а бабка – латышка, абедзве – рымска-каталіцкага веравызнання[1].

Падобная сітуацыя і з бургамістрам Строчыцкай акругі Нікіфарам Гольманам, у якога дзед таксама быў немцам, лютэранінам. Цікава, што сам Нікіфар нарадзіўся ў 1895 г. у «Наваградскай акрузе Любчанскага раёна ў вёсцы Скрышава»[2].

Прыведзены факт сведчыць аб асіміляцыі немцаў мясцовым насельніцтвам. Па-іншаму выглядае сітуацыя з тымі, хто пераехаў у Беларусь. Напрыклад, старшынёй Жодзінскай воласці ў 1942 г. быў Кандрацій Гайт. Ён нарадзіўся ў 1895 г. у в. Сямёнаўка Саратаўскай акругі. Да 1931 г. працаваў у Нямецкім Паволжы, а затым пераехаў у Смалявіцкі раён Беларусі. Усе яго продкі і ён сам (як сведчаць дадзеныя анкеты) – немцы, каталікі[3].

Пры правядзенні сваёй палітыкі германскія ўлады цвёрда прытрымліваліся лініі на прыцягненне да супрацоўніцтва мясцовых фольксдойчэ. У пісьме рэйхсміністра акупіраваных усходніх тэрыторый да рэйхскамісара «Остланда» ад 12 ліпеня 1942 г. адзначалася: «На акупіраваных усходніх тэрыторыях нямецкая народнасць з'яўляецца дзейснай апорай пры рэалізацыі мэт Вялікага германскага рэйха і ў адпаведнасці з гэтым заслугоўвае выкарыстання ў далёка ідучай перспектыве»[4].

Увосень 1943 г. у выніку рэарганізацыі пінскага гестапа частка супрацоўнікаў была адкамандзіравана ў Рэйх, а на іх

---

[1] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 3. – Спр. 114. – Арк. 51.
[2] Тамсама. – Воп. 2. – Спр. 73.
[3] Тамсама. – Спр. 64. – Арк. 3.
[4] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 30. – Спр. 381. – Арк. 1.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

месцы «прызначаны мясцовыя фольксдойчэ, здольныя да вайсковай службы, якіх перарабілі на рэйхсдойчэ і цяпер яны праходзяць навучанне ў Брэсце»[1].

## 3.3. Аплата працы фольксдойчэ

Адной з праяў клопату аб этнічных немцах з'яўлялася прыярытэтнае вырашэнне пытання аб аплаце працы гэтай катэгорыі насельніцтва на акупіраваных землях. Крокам у гэтым кірунку з'явілася прапанова аб 50-працэнтнай даплаце да тарыфных зарплат для мясцовай рабочай сілы нямецкага паходжання (фольксдойчэ). Цікава, што такая мера датычылася толькі Генеральнай акругі Беларусь. Рэйхсміністр адзначаў: «Беручы пад увагу асобыя адносіны да нямецкага народа мясцовых жыхароў у трох генеральных акругах – Эстоніі, Літве і Латвіі, – я лічыў бы недарэчным ствараць тут для немцаў лепшыя ўмовы. Увогуле, значэнне нямецкай народнасці наўрад ці магло б быць вызначальным з-за перасялення з гэтых акруг»[2]. Прапанова атрымала сілу загаду 18 ліпеня 1942 г. На фольксдойчэ, якія былі занятыя на сельскагаспадарчай вытворчасці, дадзены ўказ не распаўсюджваўся. Аднак да яго практычнага прымянення прайшоў яшчэ пэўны час.

Толькі 1 верасня 1942 г. генеральны камісар Беларусі разаслаў раённым камісарам распараджэнне аб азнаямленні з гэтым дакументам падначаленых прадпрыемстваў[3]. Рашэнне прымалася не адразу. Яму папярэднічала абмеркаванне эканамічнага інспектара шэф-групы рабочай сілы ў Берліне Гелберга з Кубэ. Аб гэтым можна даведацца з ліста першага шэфу групы рабочай сілы, які датаваны 21 жніўня 1942 г. (копія была даслана ў Мінск Кубэ). У ім адзначалася, што «такое ўказанне (маецца на ўвазе 50-працэнтнае павышэнне зарплаты і жалавання. – *Д. К.*) […] усё ж такі дае нагоду для разважання аб важнасці ўвагі да гэтага.

---

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 193. – K. 103.

[2] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 30. – Спр. 381. – Арк. 1 адв.

[3] Тамсама. – Арк. 7.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры агульным разглядзе фольксдойчэ ўжо ў розным выглядзе карыстаюцца палепшаным станам, бо яны з'яўляюцца перакладчыкамі і працуюць як носьбіты мовы і з-за гэтага атрымліваюць высокія даходы. Павышэнне на 50% у асобных выпадках дазволіць не толькі дасягнуць жалавання рускіх кіруючых работнікаў, але і часам перавысіць яго. У перспектыве гэта можа выклікаць вялікае незадавальненне ў сапраўды неабходных работнікаў з мізэрнай заработнай платай з выцякаючымі наступствамі. Прашэнняў аб павышэнні зарплат і працяглага незадавальнення гэтых рабочых наўрад ці неабходна чакаць.

Лепшая аплата фольксдойчэ ў сельскай гаспадарцы сутыкнецца са значнымі цяжкасцямі, бо тут, у процілегласць прамысловай гаспадарцы і афіцыйным службам, дзе вышэйзгаданыя сілы ў сваёй большасці прыцягваюцца толькі як носьбіты мовы, яны выкарыстоўваюцца таксама як работнікі і служачыя [...] Такое мерапрыемства можа [...] у адно імгненне выклікаць далейшы неспакой сярод рускага насельніцтва і прывядзе да арганізацыі бандфарміраванняў [...]»[1].

Да пытання аплаты працы фольксдойчэ, якія засталіся на рускай тэрыторыі і пры перасяленні атрымалі нямецкае грамадзянства, кіраўніцтва Германіі вярталася яшчэ не раз. Так, 4 чэрвеня 1943 г. яно абмяркоўвалася ў размове Вільгельма Кубэ з дарадцам міністра Байлем і дарадцам вышэйшага камандавання Хемпелем ва Усходнім міністэрстве працы ў сувязі з тым, што міністэрствам разглядалася магчымасць выплаты фольксдойчэ заробку ў памерах, якія адпавядаюць заробкам немцаў Германіі. Па гэтым пытанні Кубэ выказаўся супраць, бо лічыў, што «пры паслядоўным правядзенні гэтага плана фольксдойчэ, якія засталіся ў рускай вобласці, будуць мець большую зарплату, чым немцы ў Германіі». Гаўляйтар спасылаўся на тое, што «павінны быць улічаны пытанні розніцы ў коштах пражывання ў Германіі і ў занятай рускай вобласці. Перадусім неабходна мець на ўвазе

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 30. – Спр. 381. – Арк. 6.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

істотна меншыя кошты жылля ў рускай вобласці, нізкія цэны на прадукты харчавання і тавары паўсядзённага карыстання, адсутнасць культурных запатрабаванняў, недастатковую наяўнасць сродкаў перамяшчэння і г. д.» У сувязі з гэтым было вырашана больш дэталёва вывучыць пытанне і распрацаваць пастанову, у якой павінна быць дакладна акрэслена, якім чынам рэгуляваць аплату працы[1].

Абмеркаванне працягнулася 9 чэрвеня. На гэты раз ужо без Кубэ. Ён атрымаў для азнаямлення толькі запіс размовы. Акрамя выказванняў супраць надбаўкі да зарплаты былі іншыя прапановы па вырашэнні пытання. Падставай для разлікаў таго, колькі працэнтаў надбаўкі павінны атрымліваць асобы нямецкага паходжання ў параўнанні з нямецкімі грамадзянамі, з'яўляўся наступны момант: ці атрымліваюць асобы нямецкага паходжання харчовыя карткі ў якасці нямецкіх грамадзян па афіцыйных цэнах і ў дастатковай колькасці. Тое ж датычылася і забеспячэння іх адзеннем (па ордэрах на атрыманне тавара і г. д.). Выказвалася меркаванне аб тым, што асобы нямецкага паходжання, калі яны з'яўляліся грамадзянамі Рэйха, павінны быць забяспечаны харчовымі карткамі таксама, як і грамадзяне Рэйха. Для ўсходніх абласцей прадстаўлялася большая колькасць тэкстылю, які быў падзелены на долі – для грамадзян Рэйха (W) і для асоб нямецкага паходжання (La). З дакумента мы даведваемся, што «асаблівая ўвага Вярхоўнага кіраўніцтва была звернута галоўным чынам на асоб нямецкага паходжання, якія жывуць у сельскай мясцовасці. Яны складаюць 90% з 200 000 фольксдойчэ акупіраваных усходніх тэрыторый. З іх амаль 10% занята ў гарадах у якасці рабочых і г. д. […] Не ў нашых інтарэсах зараз павялічваць адток з вёскі шляхам устанаўлення занадта высокіх выплат для асоб нямецкага паходжання, якія жывуць у горадзе»[2].

---

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 381. – Арк. 24.
[2] Тамсама. – Воп. 30. – Спр. 381. – Арк. 22–22 адв.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Размова мела ўздзеянне на кіраўніцтва. Паводле ўказа рэйхсміністра акупіраваных усходніх тэрыторый ад 10 чэрвеня 1943 г., заработная плата тых фольксдойчэ, якія атрымалі грамадзянства, і немцаў у Германіі не была ўраўнавана, а рэйхскамісару было нададзена права самастойна вызначыць парадак аплаты працы «ва ўсёй рускай вобласці» для тых фольксдойчэ, якія атрымалі грамадзянства. Памер заработнай платы павінен быў суадносіцца з узроўнем цэн у «занятай рускай вобласці і Германскай імперыі»[1].

## 3.4. Перасяленне фольксдойчэ з акупіраваных тэрыторый

У згаданым вышэй распараджэнні № 2 шэфа групы армій «Цэнтр» ад 13 ліпеня 1941 г. адзначалася, што «ў адпаведнасці з канвенцыяй, якая была заключана паміж Германіяй і СССР пасля польскай ваеннай кампаніі, фольксдойчэ, што пражывалі на занятай Расіяй тэрыторыі, мелі права прыняць нямецкае грамадзянства», аднак «шмат хто з іх адмовіўся ад вяртання на радзіму. Таму яны не атрымліваюць ніякіх прывілеяваных адносін да сябе»[2].

Акрэсленая ў цытаце пазіцыя акупантаў да фольксдойчэ хутка змянілася. Улады Германіі зноў вярнуліся да пытання перасялення фольксдойчэ, іх прававога статусу і становішча. У студзені 1942 г. адзначаны працэс закрануў немцаў з прыфрантавых абласцей Ленінграда. Каля 4400 чалавек паэтапна перасялілі ў Заходнюю Прусію. З лютага да верасня 1943 г. насельніцтва ваколіц Лодзі павялічылася на 10 тыс. чалавек за кошт немцаў з Беларусі, Смаленскай, Арлоўскай і іншых прылеглых абласцей. Адміністрацыйнае перасяленне ахапіла таксама ўсходнюю частку Валыні, Бесарабію, Паўднёвую Украіну, Крым і Каўказ.

13 лютага 1943 г. генеральны камісар Беларусі В. Кубэ ў асабістым лісце да Г. Гімлера звярнуў увагу апошняга

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 381. – Арк. 25, 30.
[2] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 3. – Спр. 42. – Арк. 1.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на тое, што ў генеральнай акрузе пражывалі 5 тыс. фольксдойчэ, з якіх звыш 4 тыс. – у Мінску і вобласці. В. Кубэ прасіў «па магчымасці хутчэй аддаць распараджэнне аб адпраўцы 2500 гэтых «фольксдойчэ». Спасылаючыся на інфармацыю аб тым, што 1500 чалавек з пазначанай колькасці першапачаткова будзе расселена ў раёне Любліна, выказвалася просьба павялічыць лічбу да 2500 з тым, «каб вызвaліць сельскую мясцовасць ад фольксдойчэ». У якасці аргументаў гаварылася аб тым, што «нашы фольксдойчэ, якія пражываюць асобна, так ці інакш пастаянна знаходзяцца пад пагрозай з боку чырвоных бандытаў. Акрамя таго, для падрастаючай моладзі з ліку фольксдойчэ настаў самы час, каб забраць бацькоў з дзецьмі з былой бальшавіцкай тэрыторыі. Кожны год, што мы губляем у гэтым, з'яўляецца згубай для будучага развіцця гэтых фольксдойчэ». Генеральны камісар прасіў Г. Гімлера асабіста ўмяшацца ў гэтую справу для таго, каб «згаданыя асобы ўжо з вясенняй пасяўной кампаніяй былі пераселены ў дыстрыкт Любліна». У канцы ліста В. Кубэ зрабіў прыпіску аб тым, што ён «усім гэтым немцам у свой час абяцаў, што Рэйх дасць ім жыллё і зямлю, таму што яны ў асноўным сяляне. [...] Я быў бы Вам, паважыны пан рэйхсфюрэр, удзячны, калі б гэтыя абяцанні, зробленыя па ўзгадненні з упаўнаважаным, маглі быць выкананы як мага хутчэй»[1].

У сакавіку 1943 г. В. Кубэ паведамляў у рэйхскамісарыят ў Рызе аб дакладнай колькасці фольксдойчэ на падуладнай яму тэрыторыі: Мінск (горад) – 2446, Мінск (акруга) – 1627, Глыбокае – 182, Ліда – 120, Навагрудак – 150, Слуцк – 165[2].

Дзякуючы падтрымцы Г. Герынга на працягу красавіка – мая 1943 г. было праведзена перасяленне 5000 фольксдойчэ з тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь. Яны былі размешчаны ў часовым лагеры для перасяленцаў пад Лоддзю. У далейшым людзей планавалася пасяліць у Люблінскім ваяводстве. Аднак гэты працэс зацягваўся. В. Кубэ, які

[1] НАРБ. – Ф. 510. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 91–92.
[2] Тугай В. В., Тугай С. М. «Фольксдойче» в Беларуси... – С. 85.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не губляў сувязі з перасяленцамі, даведаўшыся аб тым, што «большасць ў мінулым пераселеных фольксдойчэ ўсё яшчэ знаходзіцца ў лагеры, дзе яны праводзяць час без сапраўднай працы», вымушаны быў прасіць Г. Герынга, каб дадзеныя абяцанні аб прадастаўленні жылля і зямельных надзелаў «былі выкананы як мага хутчэй»[1].

Бабруйская газета «Новый путь» 22 мая 1943 г. паведамляла: «Немцам нашых абласцей ужо ў мінулым годзе было абвешчана аб планаваным іх перасяленні. Гэта адбываецца цалкам незалежна ад ваенных дзеянняў. Перасяленне адбываецца ўсюды ў былых савецкіх абласцях. Так, напрыклад, у Гомельскай вобласці яно ўжо скончана, між тым як ў Бранску і Арле, якія знаходзяцца значна бліжэй да фронту, яно яшчэ не праводзілася. У сувязі з гэтым і немцы Бабруйскай вобласці будуць пераселены ў Германію»[2]. У той жа газеце за 25 жніўня 1943 г. сустракаем абвестку наступнага зместу: «Да ведама жыхароў нямецкай нацыянальнасці (фольксдойчэ). Рэгістрацыя ўсіх жыхароў нямецкай нацыянальнасці (фольксдойчэ) перасяленчай камісіяй Імперскага кіраўніка СС адбываецца з 23 жніўня да 4 верасня 1943 г. у Бабруйску, у будынку СД (Сямёнаўская вул., 47). [...] Усе грамадзяне нямецкай нацыянальнасці павінны неадкладна зарэгістравацца. Ад’езд у Германію прызначаны на 7 верасня. Адзенне, бялізна і г. д. можа брацца з сабою; астатняя рухомая і нерухомая маёмасць можа быць прададзена. Указанні і даведкі можна атрымаць пры рэгістрацыі. Харчаванне ў дарозе забяспечваецца. Посуд можна браць з сабою.

Грамадзяне нямецкай нацыянальнасці! Фюрэр заклікае адзін раз. Хто не адгукнецца на гэты заклік, можа больш не называць сябе немцам і не павінен разлічваць на якуюнебудзь дапамогу. Выконвайце зараз жа запрашэнне на рэгістрацыю»[3].

---

[1] НАРБ. – Ф. 510. – Воп. 1. – Спр 1. – Арк. 93.
[2] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 22 мая. – С. 4.
[3] Тамсама. – 25 авг. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

23 верасня 1942 г. генеральны камісар Беларусі разаслаў усім раённым камісарам распараджэнне адносна «Разумення, перасялення і клопату аб немцах». У ім адзначалася, што курыраванне пытання вызначэння нямецкага паходжання ў службовыя паўнамоцтвы генералкамісара ўваходзіць толькі часова. Далей вырашэнне гэтых пытанняў будзе ўскладзена на рэйхскамісара. Да паступлення выпрацаваных распараджэнняў ад рэйхскамісара па пытаннях вызначэння нямецкага паходжання фольксдойчэ прыняцце рашэння застаецца ў кампетэнцыі асобных камісарыятаў.

Дакумент закранаў пытанні перасялення фольксдойчэ. На момант яго складання перасяленне гэтай этнічнай групы на Беларусі не адсочвалася абласнымі камісарыятамі. Прымусовае перасяленне разглядалася як немагчымае без адпаведнага ўказання з Берліна. Адзначалася, што такі прымусовы акт можа прывесці да «распылення» людзей на вялікіх плошчах і выклікаць азлобленасць. Прадпісвалася звярнуць асаблівую ўвагу на тое, каб фольксдойчэ-перасяленцам былі створаны добрыя, наколькі гэта магчыма, умовы жыцця.

Трэці пункт датычыўся «клопату аб фольксдойчэ». У ім адзначалася: «Клопат аб фольксдойчэ на будучае праводзіць усімі сродкамі, якія маюцца ў распараджэнні. Хоць наша праца ў гэтым кірунку толькі часовая, мы не можам неахайна да гэтага адносіцца і быць абыякавымі да лёсу фольксдойчэ, якія нам давераны. Такім чынам, застаюцца ў мінулым жорсткія і цяжкія гады праверкі для фольксдойчэ, яны маюць права на нашу падтрымку і разуменне»[1]. Раскрывае змест гэтага пункта шэраг дакументаў 1943–1944 гг., якія акрэслівалі прававы стан фольксдойчэ. Напрыклад, 13 ліпеня 1943 г. Розенберг разаслаў кіраўнікам службаў германскай адміністрацыі Беларусі ліст, у якім прасіў выказаць заўвагі адносна прымянення новых палажэнняў, што тычацца прававога стану фольксдойчэ ў Генеральнай акрузе Беларусь.

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 756. – Арк. 5.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна з гэтымі палажэннямі, фольксдойчэ, якія атрымалі грамадзянства і пашпарт, ва ўсіх выпадках прыраўноўваліся да немцаў. Асобы, якія валодалі пасведчаннем для перасялення з адзнакай аб адтэрміноўцы, павінны таксама быць прыраўнаваны да немцаў. З тымі, хто меў пасведчанне этнічнага немца, але не меў пасведчання для перасялення, трэба было абыходзіцца як з этнічнымі немцамі. Фольксдойчэ, якія былі зарэгістраваны і мелі пасведчанне перасяленца, але не мелі транспарту (не атрымалі адтэрміноўкі ад перасялення ад адпаведнай камісіі), як і тыя, што былі адабраны камісіяй па перасяленні, атрымалі нямецкі пашпарт, але адмовіліся ад перасялення, абвяшчаліся асобамі без грамадзянства і з імі прадпісвалася абыходзіцца «не лепш, чым з беларусамі»[1].

3 жніўня 1943 г. генеральны камісар Беларусі выдаў асобае распараджэнне адносна фольксдойчэ-перасяленцаў, якія ўжо атрымалі грамадзянства. Некаторыя з іх перасяліліся на тэрыторыю «старога Рэйха», аднак выказалі жаданне вярнуцца на свае былыя пасады, «хаця да заявы не прыклалі службовыя выклікі». Такія асобы не павінны былі прымацца на працу ва ўсходніх абласцях. Тыя з іх, хто звярнуліся па атрыманне нямецкага грамадзянства і яго атрымалі, пераходзілі ў распараджэнне ведамства рэйхскамісара «Остланда» ў Рызе. Змяняўся парадак аплаты працы такіх асоб (рэйхсбюргераў). Яны разглядаліся ўжо цалкам як грамадзяне Германіі. У сувязі з гэтым генеральны камісар Беларусі прасіў паведаміць аб сітуацыі, якая склалася ў падначаленых яму абласцях менавіта з такімі асобамі, ці мэтазгодна іх выкарыстоўваць у далейшым, па якой групе яны падлягаюць аплаце. Адзначалася немэтазгоднасць выкарыстання ў перспектыве працы фольксдойчэ-перасяленцаў. У кожным асобным выпадку прыняцце іх на працу павінна было быць узгоднена з рэйхскамісарам «Остланда»[2].

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 381. – Арк. 29.
[2] Тамсама. – Спр. 561. – Арк. 130.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 3.5. Культурна-нацыянальная палітыка нямецкіх улад адносна фольксдойчэ ў розных зонах акупацыі Беларусі

Гэтае пытанне да сённяшняга часу заставалася зусім неасветленым. Вядома, што акупацыйны рэжым распрацаваў праграму арганізацыі ясляў, дзіцячых садкоў, інтэрнатаў, школ і іншых навучальных устаноў для нямецкага насельніцтва (як фольксдойчэ, так і рэйхсдойчэ). 4 кастрычніка 1941 г. генеральны камісар Беларусі выдаў распараджэнне аб стварэнні на акупіраванай тэрыторыі менавіта такіх школ. Яно прадпісвала «ў абласцях Беларусі, у якіх знаходзяцца дзеці фольксдойчэ або ёсць дастатковая колькасць дзяцей сапраўдных немцаў, якія маюць патрэбу ў школьнай адукацыі, неадкладна вызначыць нямецкіх вучняў і прывілеявана забяспечыць іх кваліфікаванымі нямецкімі настаўнікамі». Гэты ж дакумент патрабаваў прынцыпова пазбягаць таго, каб дзеці нямецкага паходжання з-за немагчымасці наведвання школ накіроўваліся ў беларускія школы. Стварэнне адной нямецкай школы бачылася магчымым пры наяўнасці звыш 10 нямецкіх дзяцей. Пры гэтым нямецкія школы знаходзіліся пад непасрэдным наглядам абласных камісараў[1].

Школы для дзяцей фольксдойчэ адкрываліся ў розных зонах акупіраванай Беларусі. Гэтая справа лічылася першачарговай. Школы для фольксдойчэ часам былі адзінымі школамі, якія існавалі на пэўнай тэрыторыі. З рапарта Усходняй секцыі дэпартамента інфармацыі і прэсы Дэлегатуры ўрада Рэчы Паспалітай на акупіраваных тэрыторыях за перыяд з ліпеня да верасня 1942 г. можна даведацца, што «на Беласточчыне існуюць толькі нямецкія школы для фольксдойчэ, затое тайнае польскае школьніцтва апошнім часам сустракае перашкоды з-за таго, што настаўнікі баяцца рэпрэсій. Тайнае беларускае школьніцтва на гэтай тэрыторыі не арганізавана»[2].

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 1.
[2] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 26.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дакладная статыстыка школ немагчыма з-за адсутнасці звестак. Вядома, што ў 1942/43 навучальным годзе на акупіраванай тэрыторыі Беларусі існавалі школы для дзяцей фольксдойчэ ў Мінску, Драздах (26 вучняў), Смалявічах (36 вучняў), Малым Залуччы (26 вучняў), Гародні (62 вучні)[1].

«Беларуская газэта» 15 красавіка 1942 г. пісала: «Побач з цэлым радам заплянаваных будаўнічых работаў, цывільнае кіраўніцтва Беларусі асаблівую ўвагу надае клопатам аб мясцовых немцах і немцах Узваложжа. У раёне і ў Менску для іх ужо наладжаныя 2 нямецкія школы, а гэбітскамісарам др. Кайзэрам цяпер адкрыта яшчэ трэйцяя нямецкая школа ў загаспадараным СС дзяржаўным маёнтку Драздох, якая ўжо мае 26 дзяцей»[2].

З нагоды адкрыцця ўвесну 1942 г. школы ў Смалявічах і выступлення на яе адкрыцці генералкамісара Кубэ «Minsker Zeitung» пісала ў артыкуле «Свежы вецер у Беларусі»: «Неабходна поўнае разуменне нямецкага грамадзянскага кіравання важнасці цяжкай руціннай працы, якая крок за крокам вядзе да новага жыцця ва ўсіх абласцях. Таму адным з першых мерапрыемстваў генеральнага камісара Кубэ было стварэнне беларускіх школ ва ўсёй краіне. Больш за тое, патрабуюць клопату і ўвагі ў агульнай праграме развіцця фольксдойчэ і волжскія немцы, якія паўсюль жывуць.

У Смалявічах – маленькім горадзе Мінскай вобласці – адкрылася першая нямецкая школа. Перасяленцы з Рэйнскай і Саксонскай Баварыі, якія былі прызваны рускімі 200 гадоў назад, збеглі з волжскай вобласці, бо не былі падрыхтаваны да каланізацыі і іх жыццям і ўласнасці пагражала калектывізацыя, якая распачалася Саветамі. Яны і іх дзеці, якія былі жывыя, гаварылі і думалі па-нямецку. Тое, каб волжскія немцы, якія маюць патрэбу ў адукацыі, працягвалі чытаць і пісаць па-нямецку, асобая заслуга гебітскамісара Др. Кайзера…

[1] Беларуская газэта. – 1942. – 15 крас.; НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 1. – Спр. 13. – Арк. 56; ДАГРВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 223.

[2] Беларуская газэта. – 1942. – 15 крас.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як урачыстае абяцанне і клопат першая нямецкая школа ў Беларусі будзе несці імя Адольфа Гітлера, і ў супрацьлегласць занадта прыгнятальных формаў няправільнай бальшавіцкай культуры супрацьпаставіцца нямецкая культура, якая прадуктыўна развіваецца, якая мэтанакіравана на супрацоўніцтва ў вялікай перабудовачнай кампаніі Фюрэра»[1].

Увосень 1943 г. разглядалася магчымасць адкрыцця яшчэ адной «нямецкай школы для замежнікаў» у Мінску. 3 верасня 1943 г. генеральны камісар звярнуўся да раённага камісара г. Мінска з прадпісаннем выдзеліць памяшканне на Кірхенштрасэ для такой школы. У ёй павінны былі займацца з дзецьмі згодна з нямецкім навучальным планам для 8-класнай адукацыі. Планавалася, што ў такую школу будзе набрана каля 30 чалавек. «Размова ідзе аб дзецях суайчыннікаў, што адносяцца да маёй цыркулярнай акругі, якія і рускую мову ведаюць вышэй сярэдняга і сваімі невялікімі ўчынкамі дэманструюць павагу да нямецкага кіраўніцтва». Гэты клас, які налічваў 25 чалавек, меркавалася далучыць да «сапраўднай нямецкай школы»[2]. Такі клас неўзабаве быў адчынены па адрасе Кірхенштрасе, 30[3].

8 чэрвеня 1942 г. была адкрыта школа для дзяцей фольксдойчэ ў Гародні, якія да гэтага часу атрымлівалі прыватныя ўрокі нямецкай мовы ў настаўнікаў польскага паходжання ці фольксдойчэ. Школа размясцілася ў будынку былой прыватнай гімназіі і ліцэя польскага школьнага саюза «Polska Macierz Szkolna» па адрасе Таненбергштрасэ, 6. Школа знаходзілася з боку ад вуліцы. Да яе прылягала вялікая пляцоўка, «якой цалкам дастаткова для знаходжання дзяцей падчас школьных перапынкаў. Яна выкарыстоўваецца і як пляцоўка для гімнастыкі і адпавядае ўсім іншым патрабаванням. Канструктыўны стан будынка быў бездакорны. У наяўнасці мелася 8 класных памяшканняў на першым і другім паверхах, да гэтага неабходна дадаць яшчэ 2 дапа-

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 441. – Арк. 11–12.
[2] Тамсама – Ф. 1. – Воп. 86. – Спр. 1343. – Арк. 35.
[3] Тамсама. – Арк. 71.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

можныя класы ў мансардзе. Да гэтага ж зямельнага ўчастка адносіліся 2 наступныя будынкі, якія маглі быць выкарыстаны ў якасці кватэр для выкладчыкаў ці інтэрната для вучняў»[1]. Усяго ў школу першапачаткова былі запісаны 62 вучні ад 6 да 14 гадоў – 26 хлопчыкаў і 36 дзяўчынак. 49 з іх наведвалі раней польскую школу, 13 чалавек толькі ў 1942 г. дасягнулі ўзросту, «магчымага для прыёму ў школу», і з іх быў створаны «падрыхтоўчы клас». Па веравызнанні сярод вучняў былі 52 рымскія каталікі, 6 праваслаўных і 4 лютэраніны. Аднак на ўроках Закона Божага дзеці не дзяліліся.

Акрамя падрыхтоўчага класа быў створаны I клас (26 вучняў 8–10 гадоў) і II клас (23 вучні 11–14 гадоў). Неабходна адзначыць, што I клас падзяляўся на 1–4 гады навучання, а II клас – на 5–8 гадоў. Такім чынам, вучыцца ў школе неабходна было 9 гадоў (улічваючы падрыхтоўчы клас). Адным з асноўных патрабаванняў да кандыдатаў на навучанне ў такіх школах было нямецкае паходжанне. Як заўважаў інспектар школьнага савета Гродзенскай акругі, «дакладнае ўстанаўленне нямецкага паходжання дзяцей, бясспрэчна неабходна. Мэтазгодна выдаліць са школы ўсіх дзяцей, у якіх гэта ўмова адсутнічае»[2].

Запіс у класы праводзіўся адпаведна ўзроўню валодання нямецкай мовай, падрыхтаванасці да ўрокаў на нямецкай мове і ўзроўнем ведаў па тэматыцы школьнай праграмы. Як заўважаў інспектар школьнага савета Д. Рымер, «узровень ведаў нямецкай мовы большай часткі дзяцей усё яшчэ нязначны. Толькі адносна некаторых дзяцей можна дапусціць той факт, што яны дома таксама размаўляюць па-нямецку»[3].

Разам з пытаннем існавання школы для фольксдойчэ ўлетку 1942 г. абмяркоўвалася і пытанне аб адкрыцці нямецкай народнай школы ў Гродне. Бургамістр горада ў сваім

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 223.
[2] Тамсама. – Арк. 223–223 адв.
[3] Тамсама. – Арк. 223 адв.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лісце вярхоўнаму прэзідэнту Грамадзянскага кіравання раёна Беласток адзначаў: «Адкрыццё нямецкай народнай школы ў Гродне – неадкладная неабходнасць». У муніцыпалітэт часта прыходзілі бацькі, якія цікавіліся датай адкрыцця такой школы ў горадзе. Яны былі «вельмі заклапочаны школьнай адукацыяй для сваіх дзяцей». З магчымасцю добрага навучання дзяцей (наяўнасцю базавай і сярэдняй школ) звязвалася канчатковае рашэнне аб перасяленні нямецкіх сем'яў у Гродна. Улетку 1942 г., па звестках бургамістра, у горадзе налічвалася 19 дзяцей, якія па ўзросце і адукацыі маглі наведваць народную школу. З іх падрыхтоўчы клас – 3 чалавекі, 1-ы клас – 3, 2-і клас – 2, 3-і клас – 3, 5-ы клас – 1, 8-ы клас – 1 чалавек, а таксама дзяўчынка 13 гадоў школы-надбудовы (для падрыхтоўкі выпускнікоў народных школ да экзамену на атэстат сталасці), два навучэнцы 2-га класа сярэдняй школы[1].

Акрамя гэтага, «шэраг дзяцей рэгістраваўся вусна». У іншым лісце (раённага камісара вярхоўнаму прэзідэнту ў Беласток) называлася лічба ад 30 да 40 чалавек толькі з гарадскога раёна Гродна і да 10 чалавек – з сельскай часткі раёна. Да агульнай колькасці неабходна дадаць «ад 20 да 30 дзяцей фольксдойчэ, якія наведваюць цяпер школу для фольксдойчэ [...] і цікавяцца магчымасцю прыняцця ў нямецкую народную школу»[2]. Аднак іх прыняцце «будзе залежаць ад іх поспехаў у вывучэнні нямецкай мовы». Самыя добрыя ўмовы складваліся для самых маленькіх дзяцей, якія, паводле меркавання бургамістра, «дома наўрад ці чуюць добрую нямецкую мову, аднак, у школе дэманструюць хуткі рост»[3].

У якасці памяшкання для школы прапаноўваўся той самы будынак па Таненбергштрасэ, 6, у якім размяшчалася школа (бургамістр называе не «школа», а «курсы») для фольксдойчэ.

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 224.
[2] Тамсама. – Арк. 222.
[3] Тамсама.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэтай школ для народных немцаў было аб'яднанне дзяцей і садзейнічанне набыццю імі нямецкай самабытнасці»[1]. У будучым прадугледжвалася перавесці ў народную школу ці на вышэйшую ступень народнай школы таксама і дзяцей фольксдойчэ. Аднак падставай для заснавання гэтай школы павінна была быць наяўнасць «сабраных разам, улічаных і існуючых у дастатковай колькасці, дзяцей рэйхсдойчэ»[2]. Пытанне неўзабаве было вырашана. У 1943 г. у Гродне ўжо існавалі народная і прыватная школы для рэйхсдойчэ[3]. Прычым аднакласная народная школа для рэйхсдойчэ знаходзілася ў тым жа будынку, што і двухкласная народная школа для дзяцей фольксдойчэ. Абодва аддзяленні былі разлічаны на 4 гады навучання.

Гродзенская прыватная школа для рэйхсдойчэ налічвала вясной 1943 г. прыкладна 25 навучэнцаў. Ёй неадкладна патрабаваліся настаўніцкія кадры. Заняткі ў ёй праводзіла настаўніца-фольксдойчэ. Кіраўніцтву школы быў абяцаны нямецкі выкладчык. У якасці аднаго са шляхоў вырашэння праблемы прапаноўвалася накіраваць для працы школьную памочніцу – дзяўчыну, якая скончыла трохмесячныя педагагічныя курсы Саюза нямецкіх дзяўчат[4].

Арганізоўвалася пастаўка для школ навучальных дапаможнікаў па ўсіх прадметах і для ўсіх класаў. Для школьных памяшканняў набываліся «якасныя партрэты фюрэра і яго саратнікаў. Самыя вядомыя нямецкія казкі прадстаўлены па-мастацку бездакорнымі малюнкамі»[5].

Для выхаваўчых мэт рэкамендавалася «клапаціцца аб вывучэнні звычайных дзіцячых песень, пры гэтым асабліва надаваць увагу нямецкай нацыянал-сацыялістычнай маладзёжнай песні [...]. Школьныя прадметы павінны запаўняць нямецкія дзіцячыя гульні. У школе для фольксдойчэ неабходна прадухіліць любое выкарыстанне ненямецкай

---

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 224.
[2] Тамсама. – Арк. 225.
[3] Тамсама. – Арк. 39 адв.
[4] Тамсама.
[5] Тамсама. – Арк. 224.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

мовы. Праз тое, што ў школе выкладаюць выключна жанчыны, урок фізкультуры для хлопчыкаў павінен мець выхаваўчае ўздзеянне і стаць падрыхтоўкай да ўступлення іх у шэрагі імперскага нямецкага рабочага класа»[1].

Асаблівую ўвагу гродзенскі школьны інспектар звяртаў на «імкненне да ўзрастаючага беспамылковага ўжывання нямецкай мовы». Для гэтага рэкамендавалася павялічыць колькасць вучэбных гадзін з 24 да 28 у тыдзень. «Выкладчыкі павінны па меры магчымасці ўласным прыкладам пабуджаць дзяцей да заўзятай моўнай практыкі, каб прывучыць дзяцей да пастаяннай размовы з захаваннем правільных моўных форм і па магчымасці больш чыстага вымаўлення»[2].

Падчас інспекцыі дзеці былі правераны на навыкі вуснай мовы, чытання і ліку. Дзеці рэйхсдойчэ пры гэтым «дэманстравалі неістотныя памылкі, […] дзеці фольксдойчэ прадэманстравалі ў размове і чытанні на нямецкай мове пакуль яшчэ недастатковыя навыкі, што можна патлумачыць»[3].

Пастаянныя інспекцыі школ выяўлялі разнастайныя недахопы ў працы. Праблемай заставалася набыццё буквароў, кніг для чытання і падручнікаў па арыфметыцы, дапаможнікаў для выкладчыкаў[4]. Інспекцыя гродзенскай школы выявіла адсутнасць гадавой праграмы навучання, якая дзяліла б вучэбны матэрыял памесячна, а таксама штотыднёвых справаздач па вучэбнай рабоце, недастатковае метадычнае афармленне заняткаў.

Сярод недахопаў навучання адзначалася адсутнасць уніфікаваных навучальных дапаможнікаў для ўсіх дзяцей. Перад кіраўніцтвам школ ставілася задача імкнуцца да таго, каб у кожнага дзіцяці быў як мінімум адзін уніфікаваны буквар ці кніга для чытання. У якасці замены апошніх рэкамендаваліся лісты для чытання выдавецтваў «Хірт», «Босл ці Бельц», «Ландгензальц».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 224.
[2] Тамсама.
[3] Тамсама. – Арк. 30.
[4] Тамсама. – Арк. 224.

Інспектары звярталі ўвагу на той факт, што пасля канікул у дзяцей гродзенскай школы пачнецца пяты навучальны год. Для яго паспяховага правядзення неабходна было «падумаць аб дастаўцы падручнікаў, якія прызначаны прынамсі для выкладчыкаў гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўства і ліку»[1].

У сувязі з тым, што дзеці фольксдойчэ дрэнна размаўлялі па-нямецку, прапаноўвалася задзейнічаць кадры, якія могуць размаўляць па-нямецку і па-польску. Настаўнікамі ў гродзенскай школе для фольксдойчэ працавалі пяць жанчын, якія паходзілі з Гродна. Да вайны яны ці працавалі ў польскіх школах, ці давалі прыватныя ўрокі нямецкай мовы. Агульнае кіраўніцтва школай было ўскладзена на фройляйн Сук – «падрыхтаваную і здольную», якая таксама вяла заняткі па чытанні і пісьме ў класе для пачаткоўцаў і нямецкую мову ў 1-м класе. Заняткі па арыфметыцы ў абодвух класах праводзіла пані Дамброўская, якая да пачатку «праўлення бальшавікоў» кіравала гарадской польскай народнай школай для дзяўчат. Пані Немчыновіч, полька, былая выкладчыца нямецкай мовы ў польскіх школах, цяпер выкладала прыродазнаўства. Рускай фройляйн Польнер былі даручаны заняткі па геаграфіі, а пані Азімінскай (карэннай аўстрыйцы) – выкладанне музыкі.

Вышэйпералічаным настаўніцам было ад 40 да 62 гадоў. Побач з імі на асаблівым становішчы знаходзілася 18-гадовая фройляйн Саваліш, якая вяла ўрокі рукадзелля і ліку ў падрыхтоўчым класе. З-за бездакорнай прыналежнасці апошняй да нямецкай народнасці меркавалася заняць яе ў якасці выкладчыцы ў нямецкім дзіцячым садзе, які планавалася арганізаваць.

У школе таксама даваў урокі па вывучэнні дзяржавазнаўства інспектар Алцінгер з муніцыпалітэта. Ён жа ажыццяўляў кантроль за школай па даручэнні бургамістра.

На думку школьнага інспектара, «для школы дастаткова такіх работнікаў, як фройляйн Сук і фройляйн Саваліш

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 30.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у якасці памочніцы настаўніка. Апошняй мэтазгодна папрацаваць некалькі тыдняў у нямецкай школе і дзіцячым садзе. Пані Дамброўскую, пані Немчыновіч, фройляйн Польнер і пані Азімінскую са школы лепей паступова выдаліць. Аднак сёння яны не могуць прынесці ніякай шкоды, таму што даюць дзецям веды ў галіне нямецкай мовы. Тым не менш у далейшым для выхавання з дзяцей сапраўдных немцаў гэтыя кадры  зусім не падыходзяць».

Праца настаўнікаў аплачвалася ў памеры 1,50 марак за кожны ўрок. Школьны інспектар рэкамендаваў прызначыць нямецкага выкладчыка дырэктарам школы. Ён павінен «навучыць выкладчыц вядзенню вучэбнага працэсу (верагодна, ужо падчас канікул) з пункту гледжання светапогляду і методыкі, а яны ўжо будуць назіраць за уніфікаваным афармленнем вучэбнай праграмы і ўвогуле будуць адказныя за ўсю школу»[1].

Побач з адкрыццём школ для асоб нямецкага паходжання, як ужо адзначалася, германскія ўлады стварылі сетку дзіцячых дамоў. Паводле звестак на 1 красавіка 1942 г., у Мінскай акрузе яны існавалі ў Трасцянцы (68 дзяцей), Астрашыцкім Гарадку (96 дзяцей), Ратамцы (77 дзяцей), Сёмкавым Гарадку (129 дзяцей), Драздах (67 дзяцей)[2].

Як можна заўважыць, нацыянальная палітыка акупацыйнага рэжыму адносна асоб нямецкага паходжання (фольксдойчэ) на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ажыццяўлялася з улікам асаблівасцей рэгіёну. Архіўныя матэрыялы не дазваляюць гаварыць аб існаванні «пятай калоны» з фольксдойчэ на нашай тэрыторыі і масавым супрацоўніцтве гэтай групы насельніцтва з акупацыйнымі ўладамі, якія імкнуліся прыцягнуць іх да службы ў розных адміністрацыйных органах. Асаблівая ўвага надавалася развіццю адукацыі і выхаванню маладога пакалення.

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 30.
[2] НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 1. – Спр. 13. – Арк. 56.



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Падчас адступлення фашысцкіх войскаў у 1943–1944 гг. амаль усё нямецкае насельніцтва было вывезена ў Польшчу, а потым у Германію. Апошнія звесткі аб фольксдойчэ з Беластока і Гродна адносяцца да вясны–лета 1944 г. У пачатку вясны 1944 г. у Гродна прыбылі ўцекачы і перасяленцы з Усходу, пераважна фольксдойчэ, якіх размяшчалі па прыватных дамах, што не толькі турбавала мясцовых жыхароў, але і стварала дастаткова небяспечныя ўмовы жыцця, бо аб усім, што рабілася ў доме і сям'і, кватаранты даносілі акупацыйным уладам. У прыватнасці, яны паведамлялі ўладам пра асоб, якія адкуль-небудзь прыехалі. Апошніх адразу правярала гестапа: адкуль, навошта і з чыйго дазволу прыехалі. У Гродне фольксдойчэ знаходзіліся на каранціне, пасля чаго іх адсылалі ў Лодзь ці Кёнігсберг. Цікава, што немцы і фольксдойчэ, якія перасяліліся з тэрыторыі Расіі, былі больш дысцыплінаванымі, чым тыя, што паходзілі з польскіх тэрыторый[1].

12 ліпеня 1944 г. кіраванне ў беластоцкай акрузе ўзяла ў свае рукі армія. Паліцыя, сфарміраваная як з беларусаў і рускіх, так і фольксдойчэ, была раззброена, і ўсе яе служачыя атрымалі дазвол на выезд. У гэты дзень пачалася афіцыйная эвакуацыя немцаў і фольксдойчэ з Беластока[2].

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 195. – K. 44.
[2] Тамсама. – К. 139.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Глава 4*

# СТАНОВІШЧА ПАЛЯКАЎ

Жыццё палякаў Беларусі падчас Другой сусветнай вайны шмат у чым абумоўлена перадваеннай сітуацыяй. Аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. змяніла тытульны этнас на далучаных землях. Палякі з пануючай нацыі адразу ператварыліся ў «нацыянальную меншасць». Да гэтага ж неабходна дадаць пачатак рэпрэсій, акцыі па высяленні ў глыб Расіі. Таму нядзіўна, што ва ўспамінах палякаў аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны можна прачытаць наступнае: «Пагроза дэпартацыі ў Савецкі Саюз вісела над кожным домам (у кожным доме знаходзілася вялікая колькасць сушанага хлеба на ўсялякі выпадак). Таму з непрыхаванай радасцю мы прынялі нямецкія войскі, якія ўваходзілі ў Нясвіж»[1].

На пачатку вайны складвалася спрыяльная для палякаў сітуацыя. Яны, як праследаваныя камуністамі, займалі месцы ў органах мясцовай адміністрацыі. Напрыклад, у Гродне, Нясвіжы, Клецку і большасці іншых гарадоў Заходняй Беларусі палякі атрымалі вядучыя пасады. Праўда, паўнамоцтвы цывільнай адміністрацыі былі вельмі абмежаваныя. Па такіх пытаннях, як арганізацыя дзейнасці школ, бібліятэк, далучэння моладзі да грамадскіх работ і г. д., члены адміністрацыі звярталіся да акупацыйных улад. З палякаў стваралася служба паліцыі парадку. У Гродне яна налічвала 72 чалавекі[2].

---

[1] Lucja Jakubowska, z domu Januszkewiczówna. Moje związki z Nieświeżem (lata 1936–1945) // Nieświeskie Wspomnienia. – Warszawa: Łośgraf, 2001. – S. 226.

[2] Ярмусик, Э. С. «Польский вопрос» и католический костел в оккупированной Беларуси (1941–1944 гг.) / Э. С. Ярмусик // Берасцейскі хранограф: зб. навук. прац. – Брэст: Выд-ва С. Лаўрова, 2002. – Вып. 3. – С. 50.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Большую частку брэсцкага магістрата таксама складалі палякі. У яго ўваходзілі тры настаўнікі СШ № 2. Віцэпрэзідэнтам быў Праневіч Г. І., членамі – Гайдучык С. М. і Цвікевіч М. І. Гарадская паліцыя Брэста цалкам складалася з палякаў[1].

Значна менш палякаў на розных пасадах было ў Цэнтральнай і ва Усходняй Беларусі. Так, сярод 101 следчага Бабруйскага гарадскога і раённага следчых аддзелаў (разам са стражай СД) толькі ў шасці этнічная прыналежнасць вызначана як польская. Усе яны нарадзіліся на Беларусі. У спісе знаходзяцца 8 украінцаў, 38 рускіх, 2 – татары. Усе яны паходзілі з-за межаў Беларусі[2].

Сярод настаўнікаў Акалоўскай воласці Плешчаніцкага раёна, якая ў 1941 г. уключала 5 школ з 16 настаўнікамі, толькі адна настаўніца – полька. Цікава, што ў сваёй анкеце яна адзначыла, што ведае рускую і беларускую мовы і «часткова» польскую і нямецкую. У жыццяпісе яна ж адзначае, што нарадзілася «ў сям'і селяніна па нацыянальнасці беларуса». У сваіх анкетах настаўнікі Плешчаніцкага раёна па-рознаму вызначалі сваю нацыянальную прыналежнасць. Напрыклад, дзве настаўніцы напісалі «каталічка». Настаўнік матэматыкі і фізікі спачатку напісаў «паляк», потым закрэсліў і пазначыў – «беларус». У цэлым сярод 126 настаўнікаў 36 школ Плешчаніцкага раёна ў 1941/42 навучальным годзе толькі 5 чалавек назвалі сябе «палякамі» ці «каталікамі»[3].

Сярод 56 настаўнікаў суседняй Барысаўскай акругі 7 чалавек назвалі сябе «палякамі» і 2 – «каталікамі»[4].

Нярэдкімі былі выпадкі хадайніцтва аб змене нацыянальнасці. Напрыклад, стараста Шчапіцкай воласці Клецкага раёна Антон Т-скі 12 студзеня 1942 г. звярнуўся ў раённую ўправу з просьбай «перапісаць мне ў пашпарце нацыянальнасць з паляка на беларуса, паколькі я ёсць беларусам

---

[1] Ярмусик, Э. С. «Польский вопрос» и католический костел в оккупированной Беларуси... – С. 50–51.

[2] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 7а. – Арк. 172–175 адв.

[3] Тамсама. – Ф. 393. – Воп. 5. – Спр. 19. – Арк. 23–185 адв.

[4] Тамсама. – Спр. 20.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і на Беларусі нарадзіўся, дзяды і бацькі мае былі праваслаўнымі. І я ахрышчаны ў Клецкай Пятроўскай царкве, пры гэтым далучаю свой метрычны запіс, а калі я жаніўся і браў палячку, то яна не хацела ісці за мяне замуж і я змушаны быў стаць каталіком. Я ёсць каталік, а нацыянальнасць мая беларус, і лічу сябе беларусам, і хачу быць беларусам, прашу перапісаць мяне на беларуса»[1]. Як заўважае Ю. Грыбоўскі, «змена нацыянальнасці была ўласціва не толькі тым, хто займаў пэўныя пасады ў мясцовым адміністрацыйным апараце дзеля захавання сваёй кар'еры. Многія простыя сяляне з мэтай адвесці ад сябе ўвагу паліцыі ва ўмовах антыпольскай акцыі рашаліся змяніць нацыянальнасць... Вельмі зручным момантам ажыццяўлення адпаведнай папраўкі быў час пашпартызацыі»[2].

Змена ўлады з савецкай на нямецкую прынесла з сабою перабудову органаў адміністрацыі на новых акупіраваных тэрыторыях. Адначасова розным нацыянальным супольнасцям было дазволена ствараць свае грамадска-культурныя арганізацыі. Як адзначае Ю. Туронак са спасылкай на архіўныя дакументы, «ужо летам 1941 г. пачаў наспяваць беларуска-польскі канфлікт. Польскія паны прыходзілі з фашысцкімі салдатамі і сілаю вярталі сваю маёмасць, былі сутыкненні і ахвяры, праводзілася палітыка вяртаць Польшчу. Пачаўся актыўны працэс стварэння мясцовай адміністрацыі на чыста польскай аснове»[3]. У Гродне ў якасці часовай мясцовай адміністрацыі быў створаны магістрат, а сярод грамадскіх арганізацый вызначаўся Беларускі нацыянальны камітэт. Камітэт не мог зміryцца з тым фактам, што магістрат складаецца з палякаў. Актывісты камітэта 26 ліпеня 1941 г. даводзілі да ведама каменданта г. Гродна факты антынямецкага мінулага кіраўнікоў магістрата, а так-

[1] ДАМВ. – Ф. 1538. – Воп. 1. – Спр. 51. – Арк. 93–94.

[2] Грыбоўскі, Ю. Польска-беларускі канфлікт у Генеральнай акрузе «Беларусь»... – S. 137.

[3] Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак. – Мінск. – 1993. – С. 162.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сама прыналежнасці мясцовых паліцэйскіх да польскіх тэрарыстычных арганізацый. Звярталася ўвага на факт агітацыі палякаў на прадмет таго, што «на гэтых тэрыторыях будуць палякі, будуць арыштаваны і расстраляны нават беларусы. [...] кожны беларус – бальшавік»[1]. Рабіўся вывад, што такім чынам палякі імкнуцца не дапусціць беларусаў на дзяржаўную службу. У дакуменце прыводзяцца факты антыбеларускіх выступленняў. Напрыклад, дырэктар тытунёвай фабрыкі Ш-скі не прымаў на працу беларусаў, нават тых, хто адпрацаваў на прадпрыемстве 20 гадоў. Д-іч Франц і Д-іч Казімір, супрацоўнікі гаспадарчага аддзела магістрата, прадавалі дровы «выключна палякам» і не прымалі просьбы ад беларусаў». Жыхарка вёскі Прыгодзічы каля Верцялішак пагражала беларусам – жыхарам вёскі вынішчэннем з той нагоды, што «тут польскі край ёсць і будзе».

Так склалася, што ўжо на наступны дзень па распараджэнні начальніка былой ваеннай вобласці «Цэнтр» Беларускі нацыянальны камітэт быў распушчаны. Прапановы апошняга аб адкрыцці беларускіх нацыянальных школ і выданні беларускамоўнай газеты засталіся незадаволенымі. Усе дакументы камітэта былі канфіскаваныя і захоўваліся ў каменданта палявой камендатуры[2].

Працэсы паланізацыі, праводзімай у першыя месяцы акупацыі, закранулі дзяцей беларусаў і рускіх. 1 верасня 1941 г. на імя каменданта г. Гродна за подпісамі прадстаўнікоў праваслаўнага брацтва быў накіраваны рапарт, у якім падкрэслівалася неабходнасць выцягвання дзяцей рускіх і беларускіх бацькоў праваслаўнага веравызнання з гарадскіх сірочых дамоў з-за таго, што «там адбываецца гвалтоўная паланізацыя і перавод дзяцей у каталіцызм»[3]. Аб гэтым расказалі самі дзеці праз даверанных асоб вярхоўнаму святару праваслаўнага сабора.

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 31.
[2] Тамсама. – Арк. 27.
[3] Тамсама. – Арк. 21.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У данясенні школьнага інспектара Лідскай акругі адзначалася: «Засілле Польшчы падтрымліваецца мясцовымі польскімі элементамі і элементамі, прыезджымі з Літвы. Адносіны гарадскога магістрата горада Ліды вельмі дрэнныя да тых, хто не гаварыў з лідскім начальствам па-польску. Тыя, хто, наадварот, размаўляў па-польску, атрымлівалі хутка кватэры і дровы. З-за гэтай прычыны пасланыя на Лідчыну настаўнікі вярталіся назад, таму што яны былі пастаўлены ў такія ж самыя ўмовы, як непрацуючыя жыхары горада. Яны вымушаны былі выстойваць у чарзе, каб атрымаць хлеб, у той час як служачыя аддзела магістрата атрымлівалі калектывам прадукты для сябе»[1].

Нягледзячы на роспуск Беларускага нацыянальнага камітэта, у Гродне барацьба беларусаў супраць палякаў не спынілася. 1 жніўня 1941 г. беларуская давераная асоба паведамляла ў палявую жандармерыю палявой камендатуры г. Гродна аб фактах зневажальных адносін да насельніцтва з боку польскіх службовых асоб: «26 ліпеня 1941 г. польскі паліцэйскі і цывільны Л-віч затрымалі беларуса Мікалая Г-шка ў Гродне, Ласасянская вул., 81, бо ён размаўляў на вуліцы па-беларуску.

24 ліпеня 1941 г. спадарыня Ева С-ска павінна была выехаць са сваёй кватэры і перадаць яе аднаму паляку. Спадарыня С-ска па нараджэнні немка, яе муж – беларус. Было дамоўлена, што высяленне не адбудзецца. Нягледзячы на гэта з'явіўся паліцэйскі Эдуард Д-скі з мэтай высялення спадарыні з яе кватэры з дапамогай сілы. Ён таксама патрабаваў, што яна павінна размаўляць з ім па-польску»[2].

Беларусы не абмяжоўваліся толькі зборам фактаў і перапіскай з прадстаўнікамі акупацыйных улад. Некаторыя з іх актыўна імкнуліся дзейнічаць у справе прапаганды Беларусі. Службовая асоба палявой жандармерыі ў сваім данясенні аб паездцы 25 верасня 1941 г. у Верцялішкі, Скідзель, Дубна і Каменку распавядае аб высакамерных паво-

[1] НАРБ. – Ф. 371. – Воп. 1. – Спр. 64. – Арк. 4–7.
[2] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 5.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзінах жыхара Верцялішак Паўла Я-віча, які быў прызначаны для нагляду за паліцыяй у гэтых мясцінах. У выніку актыўнай дзейнасці Я-віча беларускае насельніцтва ў Верцялішках вітаецца выключна словамі «Жыве Беларусь!» з адначасовым падняццем правай рукі. Бургамістрам Жыдомлі і Каменкі ён сказаў, што іх пасады ў будучым будуць запоўнены членамі Беларускага нацыянальнага камітэта. У выніку такіх паводзін Я-віча «значна павысілася хваляванне насельніцтва». Аўтар данясення заўважае: «Можна чакаць, што пры далейшых падобных дзеяннях Я-віча ў хуткім часе справа дойдзе да сутыкненняў паміж насельніцтвам – палякамі і беларусамі»[1].

13 кастрычніка 1941 г. беларускія актывісты звярнуліся ў павятовы камісарыят з хадайніцтвам аб аднаўленні дзейнасці Беларускага нацыянальнага камітэта. У ім, між іншым, утрымліваюцца і такія радкі: «Гэта этнаграфічная зямля населена ў Гродне 45%, а ў акрузе 90% беларусамі, якія пераносілі ў сваёй гісторыі нечуваны прыгнёт Польшчы і затым бальшавіцкай яўрэйскай банды. Бальшавіцкі сатанісцкі ўрад быў поўнасцю знішчаны нямецкай непераможнай арміяй і ўжо не вернецца. Засталіся палякі, перасяленцы-каланісты, члены розных антыгерманскіх, польскіх арганізацый. Яны самавольна ўзялі ў свае рукі ў першыя дні выступлення нямецкіх войскаў мясцовыя адміністрацыйныя ўстановы і імкнуцца такім чынам заснаваць будучую яўрэйска-англійскую Польшчу». Палякі, паводле меркавання складальнікаў хадайніцтва, занялі ўсе адміністрацыйныя ўстановы як у Гродне, так і ў акрузе. Пры гэтым яны працуюць «у духу Сікорскага і Сталіна», маюць свае сакрэтныя арганізацыі і «вядуць дзёрзкую, нахабную і бязлітасную вайну з бездапаможнымі беларусамі, аўтахтонным насельніцтвам гэтай этнаграфічнай вобласці, падтрымліваюць яўрэяў і планамерна і помсліва шкодзяць нямецкім інтарэсам». У заключэнні выказвалася просьба аб замяшчэнні

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 12–13.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«варожых польскіх элементаў беларусамі ва ўсіх адміністрацыйных установах»[1].

Тым жа днём датавана і іншае данясенне на імя гродзенскага гарадскога камісара, у якім раскрываецца антынямецкая дзейнасць службовых асоб. Гэта праяўлялася ў «самавольным і бандыцкім кіраўніцтве гаспадарчай дзейнасцю». Неарганізаванасць картачнай сістэмы прывяла да адкрыцця гандлёвых крам. Дазвол на гандлёвую дзейнасць выдаваўся толькі палякам. Гандляры заняліся спекуляцыяй. Акрамя гэтага, магістрат не арганізаваў кантролю над усімі захопленымі запасамі і матэрыяламі, што паслужыла прычынай розных махінацый. Ва ўстанове ўвесь час заўважалася самавольнае размеркаванне прадуктаў і іншых матэрыялаў паміж працуючымі палякамі, іх знаёмымі і роднымі.

Аўтары звароту засяроджваюць увагу на тым, што «беларусы, нягледзячы на тое, што моцна церпяць, нічога не атрымалі з гэтых запасаў і былі не дапушчаны да працы. У магістраце панаваў лозунг: «Усё для палякаў».

Цікава, у чым заключаліся злоўжыванні служачых-палякаў. Бургамістр З-скі, напрыклад, выкарыстоўваў уладу ва ўласных інтарэсах. Ён браў для сябе найлепшую мэблю і розныя рэчы ў горадзе для абсталявання сваёй кватэры. Выкарыстоўваў грузавую машыну магістрата для перавозкі дроў. Больш правініўся супрацоўнік магістрата С-віч, які 25 ліпеня 1941 г. узяў са свіной фермы тры свінні – дзве па 5 пудоў і адну – 18. У той жа дзень ён перадаў замест гэтых свіней трох маленькіх парасят, якія не адпавядалі забою. Кладаўшчык С-скі 30 ліпеня 1941 г. узяў 20 бочак рыбы, а на гарадскі пункт здаў толькі 14. Новы бургамістр Г-скі, таксама паляк, не праявіў жадання пракаменціраваць гэтыя махінацыі і не правёў рэвізіі для выяўлення ўсіх выпадкаў злоўжыванняў, праводзіў старую палітыку. Ён не ўвёў картачную сістэму на ўсе прадукты, не арганізаваў рацыянальна гаспадарку і працягваў прадаваць рэшткі запасаў толькі па-

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 6–7.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лякам. Да беларусаў ён ставіўся таксама, як і З-скі. У выніку такога адзінаўладнага гаспадарання горад застаўся без запасаў харчавання, іншых матэрыялаў і дроў. Працягвалася самавольная беспакараная спекуляцыя.

Польскім службовым асобам у віну таксама ставіліся дружалюбныя адносіны да яўрэяў, у выніку якога апошнія адчувалі сябе ў горадзе вельмі выгодна і свабодна. Большасць з іх не насілі апазнавальных яўрэйскіх знакаў. Палякі трымалі ў сябе на зберажэнні розныя рэчы яўрэяў, якія апошнія хацелі захаваць ад гета.

У заключэнні прапаноўвалася правесці грунтоўную, дакладную рэвізію ўсёй дзейнасці ў магістраце з мэтаю дэманстрацыі сапраўднага яго твару і пакарання ўсіх вінаватых, а таксама «поўнасцю забраць адказныя пасады ў палякаў»[1].

Антыпольскія настроі адзначаліся і на тэрыторыі Беласточчыны, якая ўваходзіла ў склад правінцыі Усходняя Прусія. Спачатку летам 1941 г. у горадзе быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт. Ён разгарнуў шырокую дзейнасць. Была праведзена рэгістрацыя беларусаў у Беластоку і ў правінцыі. Непасрэдна ў горадзе камітэт налічыў 17 тыс. беларусаў. Было наладжана выданне беларускай газеты «Беластоцкі голас», якой выйшла толькі два нумары. Неўзабаве германскія ўлады закрылі арганізацыю. Як сведчаць дакументы, ужо ў ліпені 1941 г. інспектар ваеннага камандавання даводзіў да ведама шэфа Цэнтральнага штаба Рубезамена, што «ў Беластоку створаны Беларускі нацыянальны камітэт. Стварэнне такога нацыянальнага камітэта не адпавядае жаданню Галоўнакамандуючага і распараджэнням, якія ён аддаў. Нацыянальны камітэт у Беластоку павінен быць забаронены, а яго стварэнне ў іншых раёнах на падкантрольнай Галоўнакамандуючаму тэрыторыі, прадухіляецца»[2]. Аднак ужо ў канцы 1941 г. ён зноў пачаў дзейнічаць. З 29 сакавіка 1942 г. у горадзе пачала выходзіць беларуская газета «Новая дарога», а толькі 23 сакавіка 1943 г. нямецкай

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 9.
[2] Тамсама. – Ф. 1332. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 2.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уладай было зарэгістравана Беларускае аб’яднанне, што дазволіла «пашырыць і паглыбіць дзейнасць», накіраваць яе на адкрыццё беларускіх школ, беларусізацыю царквы. 14–15 снежня 1944 г., калі становішча на фронце яшчэ больш ускладнілася, у Беластоку быў праведзены першы З’езд прадстаўнікоў аддзелаў Беларускага аб’яднання. Апошніх на Беласточчыне налічвалася 29[1]. Згадваючы падзеі 1941 г., аўтары артыкула «Беларускае Аб’яднанне ў Беластоку» пісалі: «Аднак хутка дзейнасьць беларусаў спаткалася з правакатарскай работай шкодных польскіх элемэнтаў, якія дзякуючы сваёй большай падрыхтаванасьці, імкнуліся захапіць у свае рукі адміністрацыю і паліцыю на месцах і ліквідаваць сьвядомы беларускі элемэнт, начэпліваючы яму ярлык камунізму. Гэта змусіла многіх беларусаў адыйсьці ад актыўнай дзейнасьці, а Аб’яднаньне паставіла ў пазыцыю абароны беларускага насельніцтва. Беласточчына – гэта лінія векавога фронту змаганьня беларускага і польскага элемэнту»[2]. Агульны настрой газеты не змяніўся і ў 1944 г. У нумары за 5 сакавіка 1944 г. чытаем: «Наша становішча адносна палякаў, якіх лёс закінуў у беларускія абшары Беласточчыны, яснае і выразнае: яны не маюць ніякага права адыгрываць тут «рашаючае значэньне». Голас мае тут перад усім беларус!»[3].

Падчас перапісу насельніцтва, які праводзіўся на тэрыторыі акругі ў верасні 1942 г., Беларускі камітэт у Беластоку «сцвярджаў факты нагаворваньня беларусаў польскімі шавіністамі запісвацца палякамі, а таксама спробы нахіліць беларусаў запісвацца палякамі з боку польскіх урадаўцаў, якія праводзяць перапіс». У сувязі з гэтым Беларускі камітэт звярнуўся да беларусаў з заклікам «моцна трымацца сваёй нацыянальнасці і даць польскім шавіністам належны адпор»[4].

[1] Раніца (Берлін). – 1944. – 16 студз. – С. 1.
[2] Новая дарога (Беласток). – 1943. – 30 мая. – С. 1–2.
[3] Тамсама. – 1944. – 5 сак. – С. 2.
[4] Раніца (Берлін). – 1942. – 4 кастр. – С. 3.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На тэрыторыі Брэсцкай і Пінскай абласцей, якія ўвайшлі ў склад Рэйхскамісарыята «Украіна», у пачатковы перыяд акупацыі назіраўся ўкраінска-польскі канфлікт на глебе незадаволенасці ўкраінскага насельніцтва тым, што палякі займалі адказныя пасады ў акупацыйных установах. Гітлераўскія ўлады з канца 1941 г. спрабавалі замяніць у іх палякаў украінцамі. Аднак праблему поўнасцю вырашыць не атрымалася, і да канца акупацыі шмат палякаў заставаліся ў акупацыйных установах[1]. Адначасова на гэтых беларускіх тэрыторыях акупанты стварылі «польскія камітэты», якія, адпаведна з дадзенымі Дэлегатуры ўрада Рэчы Паспалітай на акупіраваных тэрыторыях, былі адказнымі «перадусім за настроі сярод польскага насельніцтва». Сярод палякаў яны не карысталіся якім-небудзь аўтарытэтам[2].

Варожасць мела не толькі палітычную, але таксама сацыяльную і этнічную глебу. Нарастаючае супрацьстаянне двух бакоў не заставалася па-за ўвагай германскіх улад. Хутка яны пачалі разумець, што «каменем сутыкнення» з'яўляецца пазіцыя польскага боку да беларускіх зямель, разгляд іх як польскіх тэрыторый. У гэты працэс уключылася і каталіцкае духавенства: «Польская (рымска-каталіцкая) царква глядзіць на Беларусь як на каланіяльную вобласць і разгортвае тут сумесна з польскім паўстанцкім рухам палітычную дзейнасць, якая ўсімі сродкамі павінна быць спынена»[3]. Ужо 3 жніўня 1941 г. у «Аператыўнай зводцы з СССР № 42» у Берлін паведамлялася, што «польскае духавенства імкнецца аказаць кіруючы ўплыў на «польскае пытанне», у прыватнасці, пакуль толькі ў легальным супрацоўніцтве з тымі камунальнымі ўстановамі і кіраўнічым апаратам, якія пераважна складаюцца з палякаў. З рэарганізацыяй рымска-каталіцкага царкоўнага жыцця, асабліва таго, што праводзіцца гэтым духавенствам, нацыянальная барацьба беларусаў і палякаў уступіла ў найвастрэйшую стадыю»[4].

---

[1] Ситкевич С. А. Польское подполье… – С. 198–199.
[2] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 22.
[3] НАРБ. – Ф. 510. – Воп. 1. – Спр. 13. – Арк. 33–34.
[4] Тамсама. – Ф. 4683. – Воп. 3. – Спр. 938. – Арк. 71–71 адв.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пэўную ролю ў нагнятанні антыпольскіх настрояў адыгрывала праваслаўнае духавенства і іх сем'і. Пры гэтым яны «не абмяжоўваюцца толькі выцясненнем палякаў, а і нацкоўваюць на іх немцаў. Улічваючы, што апошнія праводзяць цяпер палітыку divide et impara, нацкоўваюць узаемна адных і другіх»[1].

У загадах і распараджэннях нямецкага камандавання ўказвалася, што «палякі, якія знаходзяцца на тэрыторыі краіны, патрабуюць крайне асцярожных і надзвычайных адносін з боку ваеннаслужачых вермахта. Па сваёй варожасці і нянавісці да немцаў іх можна параўнаць толькі з яўрэямі». З-за таго, што палякі, на думку акупантаў, у большасці сваёй «больш хітрыя, чым беларусы, і многія разумеюць нямецкую мову, то небяспека надта вялікая ў раёнах, дзе палякі пераважаюць, і далей будзе працягвацца прыгнёт беларусаў з іх боку». Як вывад – «беларускае насельніцтва паўсюль неабходна падтрымліваць і настойліва абараняць ад палякаў і яўрэяў»[2].

У канцы 1941 г. генеральны камісар прасіў дазволу ў рэйхскамісара «Остланда» на забарону побач з рускай мовай у дзяржаўным і грамадскім жыцці і польскай мовы. Гэта было звязана з тым, што абодва народы разглядаліся як вынішчальнікі беларускай нацыі: «Калі ў заходніх абласцях Беларусі палякі імкнуліся выкараніць беларусаў як нацыю, то ва ўсходніх гэтага дабіваліся бальшавікі»[3]. У 1942 г. у Генеральным камісарыяце Беларусь пачалася «беларусізацыя». За размову ва ўстанове па-польску накладаўся штраф 500 рублёў. У шэрагу мясцовасцей былі выстаўлены патрабаванні правядзення пропаведзей і службы ў касцёлах на беларускай мове[4]. Ужо да ліпеня 1942 г. на тэрыторыі Навагрудчыны на пасадах бургамістраў палякі былі заменены беларусамі (першапачаткова беларусамі былі

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 74.
[2] НАРБ. – Ф. 4683. – Воп. 3. – Спр. 938. – Арк. 120.
[3] Тамсама. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 5. – Арк. 9–10.
[4] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – S. 75–76.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бургамістры Навагрудка і Стоўбцаў). Палякі былі выведзены з кіраўніцтва паветаў. Разам з гэтым «ніжэйшыя функцыі ў адміністрацыі і самакіраванні заняты рознымі элементамі, сярод якіх не бракуе і палякаў, роўна як і былых савецкіх функцыянераў, часта рускай нацыянальнасці»[1].

Аб актыўнасці польскай інтэлігенцыі адзначаецца ў паведамленні аддзела прапаганды «Остланд» пры камандуючым вермахта ад 31 студзеня 1942 г. Даючы характарыстыку сітуацыі ў Беларусі за перыяд з 10 да 25 студзеня, заўважаецца: «Сама па сабе праблему складае дзейнасць на захадзе Беларусі. Вялікая колькасць польскай інтэлігенцыі, часта былыя польскія афіцэры, раз'язджаюць па краіне або ўладкоўваюцца ў невялікіх вёсках служачымі ці нават бургамістрамі і літаральна падбухторваюць мясцовае насельніцтва супраціўляцца немцам. Яны вярбуюць людзей на паўстанне супраць немцаў пад польскім сцягам і заклікаюць да гэтага не толькі палякаў, якія пражываюць у заходніх абласцях Беларусі, але і беларусаў, прычым часта выкарыстоўваецца належнасць апошніх да каталіцкай веры... Царква з'яўляецца рашаючым фактарам. Вярбоўка ў аддаленых раёнах праходзіць беспераішкодна. Былі выяўлены нават склады зброі»[2].

У маі 1942 г. на тэрыторыі Генеральнага камісарыята Беларусь акупацыйныя ўлады разам з беларускай паліцыяй пачалі **антыпольскую кампанію.** Гэтая акцыя працягвалася да восені 1943 г. і была накіравана галоўным чынам супраць інтэлігенцыі, каталіцкага духавенства, работнікаў адміністрацыі. Яна ахапіла ўсю тэрыторыю камісарыята, а найбольш актыўна праводзілася ў акругах Баранавічы, Навагрудак і Слонім. Аб стратах польскага насельніцтва захаваліся звесткі ў дакументах Прадстаўніцтва Польскага ўрада: «...антыпольскі тэрор [...] у апошні час вельмі моцна ўзрос. На плошчы ў Валожыне ў ліпені расстраляна 17 палякаў,

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 17.

[2] НАРБ. Калекцыя «александрыйскіх» мікрафільмаў. – Т – 177. – Ролік 380. – Кд. 473136–474147.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у тым ліку 2 чыгуначнікі. У Лідзе ў апошнія месяцы арыштаваны каля 300 палякаў, 50 з іх атрымалі смяротныя прыгаворы. Амаль усе ксяндзы на тэрыторыі Навагрудчыны арыштаваны... З 26 ліпеня працягваюцца ў Навагрудку арышты свецкіх палякаў – некалькі дзесяткаў асоб з польскай інтэлігенцыі Навагрудка, а таксама ўся інтэлігенцыя з Міра, Сталовічаў, Гарадзішча, Молчадзі, Нясвіжа, Новай Мышы, Стоўбцаў, Крывошына, Клецка, Ляхавічаў і Нядзведзіцы вывезена ў лагер у Калдычаве пад Баранавічамі. Польскія настаўнікі з Навагрудка масава вывозяцца разам з сем'ямі ў Рэйх...»[1] Паводле ацэнак А. Галіньскага, польскія страты летам 1942 г. перавысілі 1000 чалавек[2].

Люцыя Якубоўская так адзываецца аб тых часах: «Надзеі на перамены да лепшага лёсу палякаў прайшлі вельмі хутка. Атрымліваць голас сталі крайнія беларускія нацыяналісты. Напачатку былі ліквідаваны людзі з гарадскіх улад, а затым іншых, тых, якія іх калі-небудзь пакрыўдзілі. Першую групу расстралялі ў Малеве. Між іншых там загінулі: Марыся Чужыкоўна, Ірэна Карпачоўна і Ірка Лапацікоўна. Іншых расстралялі ў Калдычаве каля Баранавіч. Там жа загінуў дэкан ксёндз Мечыслаў Кубік. У Нясвіжы шалеў «палякажэрца», былы настаўнік, Калоша. Шэфам беларускай паліцыі (павятовай) быў Сянько, шэфам управы працы спачатку Калоша, а затым Букато. Пад іх крыламі знайшлі апеку найладнейшыя полькі: між іншымі Жула Шманоўская (дачка пасла), Аліна Дыноўская (мая каляжанка з гімназіі). На жаль, не маглі (а часам не хацелі) яны ўплываць на змены адносін сваіх «пратэктараў» да польскага насельніцтва.

Пагрозай для ўсёй польскай моладзі былі вывазы на працу ў Германію. Сапраўды, існуючыя школы (кравецкая і педагагічная) абаранялі сваіх вучняў, але яны былі недасягальныя для палякаў. Хто мог – хаваўся на вёсцы. Хлопцы ішлі ў партызаны»[3].

---

[1] AAN. – Sygn. 202/I. – Teczka 30. – K. 43.

[2] A. Galiński. Eksterminacja inteligencji polskiej. – S. 187.

[3] Lucja Jakubowska, z domu Januszkewiczówna. Moje związki z Nieświeżem... – S. 226–227.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Дзісненскім і Пастаўскім паветах улетку 1942 г. тры разы пераправяралі спісы асоб на вываз. Пры гэтым «кожны наступны спіс быў карэктурай старога ў кірунку змяншэння колькасці беларусаў і павелічэння колькасці палякаў»[1].

Неабходна заўважыць, што на ўзмацненне міжэтнічных супярэчнасцей уплывалі і змены на фронце. Увесну 1942 г. на акупіраваных тэрыторыях пачаўся рост колькасці партызанскіх атрадаў, дзейнасць якіх «электрызавала» насельніцтва, якое звязвала іх з'яўленне з перспектывамі ваенных перамен.

Распаўсюджанымі былі выпадкі, калі мясцовыя ўлады ці беларуская паліцыя даносілі на палякаў. Сведкі і ўдзельнікі тых часоў так апісваюць гэтыя падзеі: «Беларусы знішчалі праявы польскасці. У афіцыйных установах неабходна было размаўляць па-беларуску. Найбольш праследаваліся тыя, хто меў у асабістым пасведчанні ўпісаную польскую нацыянальнасць (польскае паходжанне). Шмат палякаў са страху заявілі сябе беларусамі. Вясною 1942 г. немцы па намове беларусаў абвясцілі штампаванне асабістых пасведчанняў. Гэта выглядала наступным чынам: на вуліцы паставілі столікі, за якімі немцы з беларускімі перакладчыкамі праглядалі ўсе асабістыя пасведчанні. Ставілі штэмпелі. Калі хто не з'явіўся і не меў штэмпеля, той разглядаўся як бандыт і арыштоўваўся. Збоку стаялі грузавікі, на якія змяшчалі тых, хто быў адабраны немцамі. Такім чынам выхаплівалі польскую інтэлігенцыю і адразу вывозілі. Адны сцвярджалі, што на працы, іншыя, што ў лагер. Сярод палякаў распаўсюдзілася паніка, бо ніхто не ведаў, як сябе паводзіць. Мы штэмпель атрымалі праз знаёмых беларусаў за вельмі высокі хабар. Шмат асоб не з'явіліся на рэгістрацыю. Некаторыя пайшлі на працу па будове чыгункі, што ўратавала іх ад вывазу на працы»[2].

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 75.

[2] Jadwiga Sudnik, z domu Ksieniewiczówna. Losy mieszkańców ziemi nieświeskiej // Nieświeskie Wspomnienia. – Warszawa: Łośgraf, 2001. – S. 214–215.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акцыя атрымала прапагандысцкую падтрымку. Яе пачаткам стаў артыкул Вільгельма Кубэ ў «Minsker Zeitung» (N 69), у якім палякі былі прылічаны да даўніх ворагаў беларускага народа, названы «народам фанабэрыстых дармаедаў». Неўзабаве з'явіліся іншыя антыпольскія артыкулы. 22 жніўня 1942 г. «Беларуская газэта» надрукавала артыкул «Слонімшчына за апошняе чвэрцьвечча. (Да гісторыі нацыянальна-вызвольнага змаганьня беларусаў Слонімскай акругі.)». У ім аўтар С. А., між іншым, пісаў: «Мясцовыя палякі – гэта мяшчанства ў гарадох і мястэчках, якое займаецца земляробствам і гандлем; абшарніцтва – уласьнікі двароў й вышэйшыя службоўцы двароў, а таксама шляхта (Плаўскія, Леаданскія). Большыня зь іх беларусы-рэнэгаты. Наплывовыя – гэта былыя ўрадоўцы, якія й цяпер імкнуцца прабрацца ў дзяржаўныя ўстановы і праводзіць там сваю варожую нацыяналістычную работу»[1].

Далей пададзена сітуацыя першых месяцаў вайны, калі «ў Слоніме польскія нацыяналістычныя элементы здолелі ашукаць нямецкае мясцовае камандаваньне й пераняць у свае рукі органы парадку ў Слоніме й акрузе, стварыўшы сваю польскую паліцыю (пад выглядам беларускае), на чале з польскім нацыяналістым Рымшам, які здолеў зьнішчыць за першыя дні ачышчаньня гораду й правінцыі ад камуністычных элементаў каля сотні ні ў чым не вінаватых беларусаў, якія ня былі ніколі камуністымі, але з'яўляліся ворагамі мясцовых палякаў. Начале гораду Слоніму за бургамістра ўлез польскі ксёндз Грахольскі»[2].

Аўтар абвінавачвае палякаў у знішчэнні актывістаў беларускага нацыянальнага руху: «Для вылаўленьня беларускага нацыяналістычнага актыву і зьнішчэньня яго пры дапамозе фальшывых даносаў быў створаны палякамі на чале з галаварэзам Рымшам так званы «Беларускі Нацыяналістычны Камітэт у Слоніме», які заклікаў беларусаў-нацыянальных актывістаў да рэгістрацыі. Усе, хто выявіў у гутар-

[1] Беларуская газэта. – 1942. – 22 жн.
[2] Тамсама.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ках у камітэце жаданьне працаваць для беларускае нацыянальнае справы, удаваліся за камуністых і арыштоўваліся».

Далей заўважаецца, што «на вёсцы польская паліцыя біла беларускае сялянства, зьдзекуючыся над беларускай мовай, змушала гаварыць сялян па-польску. Усе ўрады ў Слоніме бралі заявы толькі ў польскай мове, адмаўляючыся нават разумець беларускую мову. Побач із гэтым усім вялася шырокая прапаганда аб хуткім аднаўленьні Польшчы, аб расправе над беларусамі і г. д.

Усё гэта сеяла спачатку недавер да нямецкіх уладаў, імём якіх дзеялі ў паліцыі і адміністрацыі палякі нацыяналістыя, пакуль камітэт ня быў разагнаны»[1].

Падобнымі настроямі вызначаліся матэрыялы і ў іншых газетах. Напрыклад, у нумары «Раніцы» за 10 студзеня 1942 г. у надрукаваным лацінкай артыкуле «Баранавіцкая хроніка. Гарадзішча» чытаем: «Як выказвае апошні перапіс са снежня месяца ён (Гарадзішчанскі раён. – *Д. К.*) налічвае 57 858 душ насельніцтва, з чаго зусім мінімальная колькасць чужынцаў, а рэшта беларусы. За палякаў падалося 2198 душ. Цікавае з'явішча, бо ў папярэднім перапісе налічылі аж 8000. Але ня можна дзівіцца, калі даведаемся, як гэта праводзілася. Вось прыклад: адзін з войтаў, ясна паляк, перад перапісам даў солтысу такі загад: «Kiedy katolik poda się za Białorusina, wal w mordę» («Калі каталік назаве сябе беларусам, то бі ў морду»). Нічога тады дзіўнага, калі колькасць палякаў пры такой сістэме павялічвалася. Цяпер, калі стырно раёну знаходзіцца ў руках беларуса, справа бярэ зусім іншы зварот. Стэрарызаванае даўней палякамі насельніцтва масава складае заявы аб папраўленні нацыі ў пашпарце і з кожным днём малее колькасць псеўда-палякаў, натвораных польскімі ўрадаўцамі супольна з польскімі ксяндзамі»[2].

Не будзем імкнуцца даць каментарыі прыведзеным вытрымкам. Скажам толькі адно: такія артыкулы не маглі спрыяць узаемаразуменню і згодзе паміж палякамі і беларусамі.

---

[1] Беларуская газэта. – 1942. – 22 жн.

[2] Раніца (Берлін). – 1942. – 10 студз. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб «засіллі палякаў» вялася размова падчас з'езда Беларускай народнай самапомачы, які адбыўся 1–4 лістапада 1942 г. у Мінску. На ім кіраўнік Ганцавіцкай акругі адзначаў, што «ў Ганцавічах было 90% жыдоў. Цяпер іх там няма. Але на тое ёсць тут страшэннае засільле былых польскіх урадаўцаў, якія нахабна трымаюцца ў дачыненьні да беларускай справы». «Польскае засільле ва ўсіх установах» з'яўлялася галоўнай прычынай цяжкасцей у наладжванні працы самапомачы ў Лідзе. Ксёндз Гадлеўскі «зрэфераваў палажэньне каталіцкага касьцёлу на Беларусі». У сваім рэфераце ён гаварыў аб тым, што «дагэтуль касьцёл быў і яшчэ ёсьць у руках польскіх нацыяналістых. Цяпер ён мусіць быць вырваны з чужацкіх рук і павінен стацца творчым дзейнікам беларускага народу»[1].

Неад'емнай часткай антыпольскага курса на тэрыторыі Беларусі з'яўлялася дзейнасць супраць каталіцкага касцёла. У пачатку акупацыі, у ліпені 1941 г., немцы дазволілі адкрыць у Беларусі касцёлы. З Польшчы прыехала некалькі дзесяткаў ксяндзоў. Аднак ужо ў лістападзе 1941 г. усе яны былі арыштаваны і вывезены, а касцёлы сталі закрываць і перадаваць праваслаўнай царкве[2]. Улетку 1942 г. на тэрыторыі Міншчыны, па звестках відавочцаў, амаль не заставалася каталіцкіх святароў[3].

Гітлераўцы асцерагаліся, што місіянерская дзейнасць рымска-каталіцкіх і грэка-каталіцкіх святароў ва ўсходніх абласцях Беларусі «здольная не толькі падарваць канфесійны мір з амаль выключна артадаксальным (праваслаўным) насельніцтвам, але і вельмі моцна перакрэсліць асноўныя лініі нямецкага адміністрацыйна-кіраўнічага апарату»[4].

У сакавіку–красавіку 1942 г. больш за 10 ксяндзоў расстраляны ў канцлагеры ў Беразвеччы, за 3 км ад мястэчка Глыбокае Віцебскай вобласці. У сакавіку 1943 г. 9 ксяндзоў

[1] Раніца (Берлін). – 1942. – 29 ліст. – С. 2.
[2] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 11, 79.
[3] Тамсама. – К. 18.
[4] Ярмусик, Э. С. «Польский вопрос» и католический костел в оккупированной Беларуси... – С. 53.

расстраляны каля Ліды. Некалькі ксяндзоў гітлераўцы замучылі ў лагеры смерці Калдычава каля Баранавіч. У ліпені 1943 г. 6 душпастараў у ліку вялікай групы закладнікаў немцы расстралялі ў фартах ля вёскі Навумавічы Гродзенскага раёна. У жніўні 1943 г. такі ж лёс напаткаў 11 сясцёр-назаратанак з Навагрудка. Шмат хто стаў ахвярай карных аперацый гітлераўцаў[1].

Аб настроях мясцовага насельніцтва не раз паведамляла прадстаўніцтва польскага эміграцыйнага ўрада на акупіраваных землях. Напрыклад, у паведамленні ад 11 ліпеня 1942 г. настроі жыхароў Палесся характарызаваліся як узбуджаныя і наэлектрызаваныя. Гэта тлумачылася лютуючым бандытызмам, а таксама бояззю рэпрэсій і рэквізіцый. «Рэштка польскага насельніцтва жыла ў боязі таго, што пры далейшым захаванні анархіі будзе знішчана»[2].

Наколькі бакі мелі рацыю? Хто з іх быў больш варожа настроены? Не нам аб гэтым меркаваць. Хочацца звярнуць увагу яшчэ на адзін дакумент. У лютым 1943 г. прадстаўніцтва польскага эміграцыйнага ўрада на акупіраваных землях падрыхтавала падрабязны рапарт «Беларусь пасля 20 гадоў савецкай і 20 месяцаў нямецкай акупацыі». У ім, сярод іншага, ёсць і наступныя радкі: «Палякі з'яўляюцца соллю гэтай зямлі, бо ўяўляюць найінтэлігентнейшы і найбольш творчы элемент. У савецкіх школах самымі здольнымі былі польскія дзеці. [...] Сённяшняя беларуская інтэлігенцыя, якая ўжо выхавана ў савецкіх школах, на 80% з'яўляецца дзецьмі чыстых палякаў ці мяшаных шлюбаў з палякамі. [...] У статыстыцы настаўнікаў беларускіх школ за верасень 1942 г. аддзел адукацыі пры Генеральным камісарыяце Беларусь прывёў звесткі аб тым, што сярод настаўнікаў 50% палякаў. Гэтым настаўнікам было загадана змяніць польскую нацыянальнасць на беларускую. Пераследаванні палякаў працягваюцца, але немцы ў нацыянальных

[1] Ярмусик, Э. С. «Польский вопрос» и католический костел в оккупированной Беларуси... – С. 53.

[2] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справах не арыентуюцца, іх можна вельмі проста падмануць, схавацца пад прымусовы і для ўсіх чужы беларускі патрыятызм. Сярод палякаў старога і маладога пакалення большасць – старыя польскія патрыёты, нягледзячы на тое, што пашпарты называюць іх беларусамі. Палякі ўпарта чакаюць Польшчы, польскай арміі. Моладзь марыць аб тым, каб у радах польскай арміі змагацца за сваю краіну. Ім самім цяжка прабіцца да службы, бо вельмі знясілены шматгадовым зняволеннем і пазбаўлены правадыроў. Польскага руху за незалежнасць у поўным значэнні гэтага слова няма. Яго арганізацыя сярод такой значнай колькасці ворагаў – вельмі цяжкая справа. Ёсць толькі вялікая туга, ахвярнасць і вера ў тое, што Польшча не забудзе аб сваёй зямлі»[1].

Паводле меркавання нямецкага даследчыка Х. Герлаха, на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь агульная лічба знішчанай польскай інтэлігенцыі склала ад 2000 да 3000 чалавек. Супраць яе аб'ядналі свае намаганні Генеральны камісарыят Беларусь, вермахт, СС і паліцыя, якія асабліва жорстка дзейнічалі супраць яе кіруючага складу. Толькі ў Баранавічах былі арыштаваны і забіты каля 1000 палякаў[2].

Аднак немагчыма гаварыць аб суцэльным супрацьстаянні і варожасці беларусаў і палякаў. Жыхар Нясвіжа Чэслаў Сальчэрскі ў сваіх успамінах распавядае аб мірным і дружалюбным жыцці жыхароў горада, узаемападтрымцы польскага і беларускага насельніцтва: «З мэтай аддалення няшчасцяў, якія прынесла вайна, насельніцтва пачало часцей звяртацца да Бога. Нехта выступіў з прапановай паставіць на Новым Месцы пяць драўляных крыжоў у розных месцах. Неўзабаве крыжы былі выраблены і асвечаны. Аб асвячэнні двух крыжоў, якія стаялі бліжэй да праваслаўнай плябаніі, прасілі праваслаўнага святара, Аляксея Русецкага. [...] Каля другога крыжа святар Русецкі прамовіў кароткую малітву. Пасля пастаноўкі пакутных крыжоў мы ўсе адчулі пэўную палёгку і ўздым ад добрага ўчынку.

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 81.
[2] Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde... – S. 1062.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На тым не спыніліся. Кабеты, таксама з Новага Месца, вызначылі для сябе дадатковую пакуту: вырашылі на працягу адной ночы спрасці (без калаўроту) і саткаць на хатніх кроснах вялікі абрус. На другі дзень гэты дар занеслі ў царкву, бо галоўная ініцыятарка – ткачыха была праваслаўная жанчына – Протасава»[1].

У справаздачах шмат увагі звяртаецца на настроі сярод мясцовага насельніцтва. Сярод палякаў на Палессі панавалі настроі моцнай прыгнечанасці. Польская інтэлігенцыя ў гарадах улетку 1943 г. засталася ў мізэрнай колькасці. Цяжкі матэрыяльны стан яшчэ больш паглыбляў дэпрэсію гэтай групы. У вёсцы польскаму насельніцтву пагражала фізічнае вынішчэнне. Адносіны палякаў з мясцовым насельніцтвам усё больш абвастраліся і станавіліся варожымі. Мясцовыя палякі абвінавачвалі ўкраінцаў і беларусаў у забойствах на Палессі і папракалі іх у чаканні вяртання савецкай улады. У гарадах нацыянальныя канфлікты, на думку складальнікаў справаздач, не праяўляліся. Замест гэтага паміж асобнымі нацыянальнымі супольнасцямі працягвалася барацьба за ўплывы, бо персанал у структурах адміністрацыі і іншых установах быў змешаны: польска-ўкраінска-беларуска-рускі. «Не гаворачы ўжо пра немцаў, якія займаюць кіруючыя пасады»[2].

Галоўным натхняльнікам антыпольскіх настрояў на Беларусі польскі бок бачыў Вільгельма Кубэ, які «пранікнуўся антыпольскім духам настолькі далёка, што галоўнай мэтай сваёй дзейнасці на пасту генеральнага камісара Беларусі бачыў вынішчэнне слядоў польскасці на гэтай тэрыторыі і пасяленне гэтай нянавісці ў беларусаў»[3]. Яго абвінавачвалі не толькі ў распаўсюджванні антыпольскай прапаганды, але і ў спрыянні дзейнасці беларускіх арганізацый, такіх як Беларуская самапомач, Працоўная рада, Беларускае навуковае

[1] Solczerski, Cz. Przedwojenne dzieciństwo i wojenna młodość w Nieświeżu // Nieświeskie Wspomnienia. – Warszawa: Łośgraf, 2001. – S. 247.

[2] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 193. – K. 41.

[3] Тамсама. – К. 63.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таварыства, Саюз беларускай моладзі і інш., сябры якіх былі тым элементам, які «так далёка пранікся антыпольскай ідэалогіяй, што аб якім-небудзь modus vivendi з імі пасля вайны не можа быць гаворкі»[1].

Са зменай становішча на фронце ў беларуска-польскія адносіны пачаў умешвацца савецкі фактар. З набліжэннем лініі фронту на акупіраваных тэрыторыях усё больш стала з'яўляцца палітычных агітатараў, якія «дзейнічалі пераважна па вёсках і выступалі то пад расійскім, то пад беларускім абліччам. Аднак у абодвух выпадках дамінавала антыпольская нота. Паражэнне немцаў, адпаведна гэтай агітацыі, ужо вырашана. Цяпер неабходна толькі прадухіліць сітуацыю, каб на месца немцаў не селі палякі»[2]. Дапамогу ў правядзенні такой агітацыі аказвала праваслаўнае духавенства, якое ўжывала «розныя дэмагагічныя лозунгі, такія як «Польшчы ніколі не было і не будзе!», «На Беларусі няма месца для палякаў», «Лепш нядобрая маці, чым добрая мачаха», «Выражам палякаў, калі прыйдуць бальшавікі»[3]. Гэтай прапагандзе дапамагалі афіцыйныя фактары – расійскі і беларускі камітэты, якія таксама ўжывалі падобную лексіку і лозунгі. Вельмі актыўная роля дадзеных элементаў была ў гестапа. «Расійская мова ў гродзенскім гестапа чуецца на кожным кроку. Асаблівую ролю адыгрываюць бальшавічкі, якія засталіся пасля ўцёкаў рускіх. У апошні час іх адносіны да палякаў сталі дэманстратыўна варожымі, праводзіцца прасавецкая агітацыя. Адначасова гестапа ставіцца да іх талерантна і апякае іх»[4].

У 1943 г. на беларуска-польскія стасункі пачалі значна ўплываць змены на фронце і пашырэнне прасавецкіх настрояў сярод насельніцтва. Шмат інфармацыі ўтрымліваюць справаздачы прадстаўніцтва польскага эміграцыйнага ўрада на акупіраваных землях. У дакуменце за чэрвень 1943 г.

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 193. – K. 63.
[2] Тамсама. – К. 67.
[3] Тамсама.
[4] Тамсама.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытаем: «Адносіны палешукоў-сялян да акупантаў – варожыя [...] Адносіны да польскай супольнасці залежаць ад тэрытарыяльных уплываў бальшавіцкай прапаганды. У вёсках, якія аддалены ад чыгуначных і грунтовых дарог, дзе праваслаўнае насельніцтва беднае і мае малую свядомасць, у 1939 г. забівалі афіцэраў, польскіх салдат і бежанцаў. Цяпер сяляне баяцца вяртання польскай справядлівасці і пакарання, таму спрыяюць стварэнню ўзброеных бандаў альбо аб'ядноўваюцца з украінскімі партызанамі і забіваюць палякаў – тых, што былі сведкамі знішчэння 1939 г.»[1]

Чаканне вяртання бальшавікоў не заўсёды спрыяла ўзмацненню антыпольскіх настрояў. Беларуская інтэлігенцыя, якая супрацоўнічала з акупантамі, перад пагрозай вяртання старой улады забывалася на крыўды на палякаў. На тэрыторыі Беласточчыны ў снежні 1943 г., «за выключэннем моцна антыпольскага Беларускага камітэта»[2], іншыя правінцыйныя камітэты ці шукалі паразумення з палякамі, ці хаця б спынялі антыпольскія выступленні.

Аднак не ўсюды назіраўся падобны працэс. У Баранавічах і Слоніме (значная адлегласць ад Беласточчыны, і колькасць палякаў значна меншая) у сакавіку 1944 г. беларускія ўлады самакіравання забаранілі ўжываць польскую мову ў публічных размовах. Пры гэтым паведамлялася, што службоўцы, якія не выконвалі гэтай пастановы, «павінны быць звольнены»[3]. Як бачым, не так дрэнна было з польскай мовай у афіцыйных установах, калі яе нават у самым канцы акупацыі даводзілася забараняць. Гэты факт ставіць пад сумненне сцвярджэнні аб татальным вынішчэнні польскасці і «палякажэрскасці» беларускай адміністрацыі.

Супраць палякаў нямецкая прапаганда настройвала не толькі беларусаў. Ахвярамі польскага шавінізму былі і літоўцы. Сярод дакументаў Генеральнага камісарыята Беларусь захаваўся ўрывак з аднаго з іх, у якім негатыўна

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 193. – K. 19.
[2] Тамсама. – К. 132.
[3] Тамсама. – К. 70.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асвятляецца нацыянальнае будаўніцтва ў польскай дзяржаве, варожасць да беларусаў і літоўцаў палякаў, якія занялі адміністрацыйныя пасады ў першыя месяцы нямецкай акупацыі: «Польская дзяржава, насуперак канстытуцыі, адмаўляла беларусам у праве на асобную школу. Пачатковыя школы амаль паўсюдна былі польскімі, адсутнічала падрыхтоўка беларускіх настаўнікаў. Любая агітацыя на карысць беларускай школы стварала глебу для праследавання беларускага нацыянальнага руху. Была распрацавана спецыяльная тактыка: яны абвінавачваліся як камуністы, прымяняліся адміністрацыйныя меры, падчас следства яго прыхільнікаў доўгія месяцы трымалі ў турме. Дадзены метад і цяпер выкарыстоўваецца супраць актыўных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху былымі польскімі чыноўнікамі тайнай паліцыі, якія праніклі ў нямецкія органы ўлады. Так, для **беларусаў і літоўцаў** (выдзелена намі. – *Д. К.*) закрытыя ўсе месцы ва ўстановах, нават ў самых малых. Гэта датычыць таксама каапэратываў, праўленні якіх таксама знаходзяцца ў польскіх руках. Такім чынам, перад сумленнымі **беларусамі і літоўцамі** (выдзелена намі. – *Д. К.*) паўстае дылема: ці выдаваць сябе за паляка, ці заставацца беспрацоўным. Гэтаму садзейнічае таксама і каталіцкая царква. Калі ў літоўцаў было два епіскапы (у Сейнах і Коўна), то віленскі епіскап быў польскім. Беларуская мова ў царкве ўспрымалася амаль як ерась. Калі святары-беларусы аднойчы паспрабавалі прапаведаваць на беларускай мове, яны былі звольнены царкоўным прыходам»[1].

Германскія ўлады садзейнічалі разгортванню нянавісці да палякаў з боку літоўцаў на беларускіх землях, далучаных да Генеральнай акругі Літва, дзе літоўцы атрымалі панаванне ў мясцовай адміністрацыі і ўстановах. Літоўскія служачыя, функцыянеры паліцыі і службы бяспекі прыбылі ў раёны, якія знаходзіліся на поўдзень ад Вільнюса, з іншых рэгіёнаў, часцей за ўсё з Ковенскай Літвы. Выкарыс-

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 433. – Арк. 19.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тоўваючы пачуцці крыўды літоўцаў за даваенныя падзеі, нямецка-фашысцкія акупанты падтрымлівалі антыпольскую і антыбеларускую дзейнасць літоўскай адміністрацыі[1]. Закрываліся польскія і беларускія школы, палякаў і беларусаў звальнялі з устаноў[2]. Скасоўваліся любыя праявы польскай культуры: польскія кнігі, навуковыя зборы, гістарычныя помнікі[3].

Літоўскае грамадзянства распаўсюджвалася толькі на невялікую частку беларускіх зямель, далучаных да Генеральнай акругі Літва. Тыя, хто не меў грамадзянства, у першую чаргу падлягалі вывазу ў Германію, што выкарыстоўвалі літоўскія органы самакіравання. У складзеныя імі спісы на вываз у Германію замест літоўцаў пераважна траплялі палякі.

Іншым метадам змагання супраць палякаў была нямецкая каланізацыя літоўскіх зямель. Летам 1942 г. у Генеральнай акрузе Літва выйшла інструкцыя аб стварэнні «нямецкага фонду» з зямель «найбольш актыўных» палякаў, а таксама рускіх, яўрэяў і – у асобных выпадках – літоўцаў. Апошнія ў выніку канфіскацыі сваіх уладанняў атрымлівалі ў іншых мясцовасцях землі з пабудовамі, жывым і нежывым інвентаром, якія раней належалі палякам. Палякі, таксама як і рускія, пры высяленні мелі права забраць з сабой па 15 кг харчавання на чалавека. «Актыўнасць» палякаў вызначалася па наступных паказчыках: ужыванне дома польскай мовы; пазначэнне польскай нацыянальнасці ў пашпарце; прыналежнасць у даваенны час да польскіх гаспадарчых і культурных арганізацый; чытанне польскага друку[4].

Са снежня 1942 г. на тэрыторыі Генеральнай акругі Літва пачалося высяленне палякаў і перадача іх гаспадаркі сем'ям, якія прыбылі з Ковенскай Літвы[5]. Праследаванні

---

[1] Ситкевич, С. А. Польское подполье... – С. 199.
[2] НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 33 а. – Спр. 189. – Арк. 11.
[3] AAN. – Sygn. 202/II. – Teczka 8. – T. 1. – K. 87.
[4] Тамсама. – К. 90–91.
[5] Wołkonowski, J. Okręg Wileński Związku Walki Zbrojnej Armii Krajowej w latach 1939–1945 / J. Wołkonowski. – Warszawa, 1996. – S. 83.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

польскага насельніцтва сталі прычынай яго масавай міграцыі з першых месяцаў акупацыі з Генеральнай акругі Літва на тэрыторыю Беларусі і ў Генеральнае губернатарства[1].

З канца 1943 г. у сувязі са зменамі на фронце, якія прывялі да вызвалення Чырвонай Арміяй некаторых паўднёва-ўсходніх тэрыторый Беларусі, адбылася змена палітыкі акупантаў да польскага насельніцтва, якая праявілася ў адыходзе ад антыпольскага курсу і спробах устанаўлення супрацоўніцтва з Арміяй Краёвай. З мэтай прыцягнення палякаў да антысавецкай барацьбы сярод іх праводзілася агітацыя. Напрыклад, 28 студзеня 1944 г. немцы прыехалі ў Іўе і «заклікалі палякаў да заключэння з імі саюзу, бо СССР разарваў адносіны з Вялікабрытаніяй і Злучанымі Штатамі». За гэта гітлераўцы абяцалі аднавіць Польскую дзяржаву. У нямецкіх лістоўках, якія ў гэты час распаўсюджваліся, паведамлялася аб выніках Тэгеранскай канферэнцыі і сцвярджалася, што ЗША і Англія выдалі Польшчу ў рукі бальшавікоў. У сувязі з гэтым польскае насельніцтва заклікалася да барацьбы супраць саветаў за новую Еўропу[2].

На беларускіх тэрыторыях, якія ўваходзілі ў склад Рэйхскамісарыята «Украіна», па звестках Дэлегатуры ўрада Рэчы Паспалітай на акупіраваных тэрыторыях, у пачатку 1944 г. назіралася паляпшэнне адносін украінскай адміністрацыі да палякаў. Нават паведамлялася аб аказанні дапамогі бедным польскім сем’ям[3]. Да лепшага з другой паловы 1943 г. змяніліся адносіны ўлад да польскага насельніцтва ў Генеральнай акрузе Літва. Больш цярпімасці праяўлялася да польскай мовы. Пад канец 1943 г. на тэрыторыі акругі больш мяккія формы набыла канфіскацыя гаспадарак у палякаў. У прыватнасці, літовец, які прымаў польскую гаспадарку, мог выказаць згоду пакінуць на месцы былога гаспадара зямлі[4].

---

1 Ситкевич, С. А. Польское подполье… – С. 200.
2 Borodin, Z. Nieman – rzeka niezgody... – S. 29.
3 AAN. – Sygn. 202/II. – Teczka 73. – K. 8.
4 Ситкевич, С. А. Польское подполье... – С. 202.

Асобнага разгляду патрабуе **стан адукацыі на польскай мове**. Германскія ўлады на тэрыторыі Рэйхскамісарыята «Украіна» спрыялі адкрыццю польскіх школ. Так, восенню 1941 г. у Пінску, Пінскім і Жабчыцкім раёнах было адкрыта 14 польскіх школ (13% ад усіх дзейных). У цэлым па Пінскай акрузе восенню 1941 г. па мове выкладання налічвалася 8 польскіх школ (5%). У самім Пінску былі падрыхтаваны да адкрыцця 2 польскія школы (разам з 2 беларускімі і 2 рускімі)[1].

Вядома, што ў маі 1942 г. на тэрыторыі Брэсцкай акругі, якая ўключала 5 раёнаў, са 174 школ польскімі былі 13[2]. У новым навучальным годзе польскія школы спынілі працу. На яе аднаўленне неабходны быў дазвол Генеральнага камісарыята. Аднак дзейнічалі прыватныя. Напрыклад, у Брэсце існавала польская прыватная трохгадовая гандлёвая школа (303 вучні), прыватныя польскія механічныя курсы (120 вучняў), польская прыватная музычна-драматычная школа (95 вучняў)[3].

Выкладанне на польскай мове ў рамках афіцыйнага курсу беларусізацыі на пачатку акупацыі было дазволена ў Генеральнай акрузе Беларусь. 10 верасня 1941 г. генеральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ выдаў «Адозву аб часовым школьным парадку ў генеральным камісарыяце». У ёй адзначалася, што «Гэнэральная Акруга Беларусі ахоплівае жыццёвы абшар Беларускага народу. Дбаньне аб беларускай культуры, звычаях і асьвеце зьяўляецца аднэй з істотных задач школ Гэнэральнай Акругі Беларусі. Іншыя народнасьці: палякі і расейцы, якія жывуць на гэтым жыцьцёвым абшары, павінны засвойваць беларускую культуру. У сувязі з гэтым павінны быць прыцягнуты да настаўніцкай працы з далейшай праверкай веды ў спэцыяльнасьці і з далейшай праверкай маральных і палітычных поглядаў усе мужчыны і жанчыны, якія могуць працаваць як настаўнікі.

[1] ДАБрВ. – Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 144. – Арк. 4, 6; Спр. 91. – Арк. 8.
[2] Наше слово (Брест). – 1942. – 7 черв. – С. 4.
[3] Тамсама. – 9 жовт. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкладанне ў школах будзе на беларускай мове. *У мясцовасьцях, якія заселеныя польскаю меншасьцю, павінна быць у школах у кожнай клясе ня менш 6-цёх гадзін на тыдзень заняткаў пабеларуску*» (курсіў наш. – *Д. К.*)[1].

«У вадпаведнасьці з часовым навучальным плянам у школах, якія адчыняюцца 1-га кастрычніка, праводзіцца першым чынам выкладаньне чытаньня й пісьма ў роднай мове (*у польскіх мясцовасьцях у беларускай і роднай мовах),* выкладаньне прыродаведы (батанікі і заалогіі), матэматыкі, геаграфіі, сьпеваў, рамяства й фізычнай культуры».[2]

«Выкладаньне *рэлігіі зьяўляецца не справай дзяржавы, а справай царквы. Я прадастаўляю праваслаўнай беларускай і каталіцкай царквам выкладаньне рэлігіі па-за школай, паводле кіраўнічых зазначэньняў павятовых камісараў. Трэба мець увагу і на магамэтанскую меншасьць.* Прымус да вывучэньня закону Божага будзе карацца. Добраахвотная пастанова бацькоў зьяўляецца адзіна аўтарытэтнай і кіраўнічай для выхаваньня дзяцей»[3].

У «Адозве…» падкрэслівалася, што «кожнае злоўжываньне школы ў мэтах агітацыі польскай меншасьці будзе цяжка карацца, бо жыццёвы абшар Беларусі ёсьць перш за ўсё для беларускага жыхарства»[4].

Талерантнае стаўленне да прысутнасці польскай мовы і культуры ў школах сустрэла незадаволенасць з боку беларускіх калабарацыйных колаў. У 1942 г. Беларускі камітэт (?) падрыхтаваў даклад «У школьнай справе Беларусі» (01.06.1942 г.) і прадставіў яго ў генеральны камісарыят. У ім адзначаецца, што «1941/42 школьны год зьяўляецца блізка цалкам страчаным для справы ўзгадаваньня Беларускага Народу і паралізаваньня польска-расейска-жыдоўска-бальшавіцкіх уплываў на Беларусі»[5], што «на Беларусі

[1] ДАМВ. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 145–146.
[2] Тамсама. – Арк. 146.
[3] Тамсама.
[4] Тамсама.
[5] ДАМВ. – Ф. 688. – Воп. 2. – Спр. 2. – Арк. 6.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня ў меншай меры патрэбна узгадаваньне моладзі, спэцыялістых усяго народу ў сваім нацыянальным кірунку згодна з вымаганьнем Новага ладу. Польская інтэлігенцыя імкнецца сягоньня захапіць агульную адміністрацыю, касьцёл, гандаль, культурнае жыццё Беларусі ў свае рукі, каб праводзіць сваю шовіністычную палітыку замацоўваючы за сабой гэтыя землі і на выпадак павікланьняў тварыць тут свае заплечча»[1]. Далей прапаноўвалася як мага хутчэй стварыць пад наглядам генеральнага камісара кіраўніцтва асветы і культуры Беларусі з асяродку «сьвядомых нацыянальных беларусаў», здольных да арганізацыі агульнанавучальных і спецыяльных школ ва ўсёй Беларусі. Гэтыя меры мусілі запоўніць недахоп інтэлігенцыі, «каб найскарэй замяніць варожую польскую і расейскую фаховую сістэму беларускай, каб падвысіць кваліфікацыі беларускае часткі працуючай інтэлігенцыі, каб распачаць агульна-ўзгадаваўчую працу Беларускага Народу ў сваім нацыянальным кірунку, які забясьпечыць трывалае абмежаваньне Беларусі ад Польшчы і Расеі»[2].

У 1941/42 навучальным годзе ў Баранавіцкай акрузе толькі 19 настаўнікаў былі палякамі з прыкладна 1100. З цягам часу настаўнікі-палякі мусілі быць звольнены і заменены на настаўнікаў-беларусаў[3].

Польскія школы на тэрыторыі акупіраванай Беларусі (генеральныя акругі Беларусь, Валынь-Падолія і Жытомір) у 1942 г. былі ліквідаваны. Дзеці палякаў на Берасцейшчыне (паводле ацэнак акупацыйных улад, каля 20% ад агульнай колькасці дзяцей) былі абавязаны наведваць беларускія ці ўкраінскія школы[4]. На наступны навучальны год (верасень

[1] ДАМВ. – Ф. 688. – Воп. 2. – Спр. 2. – Арк. 7.

[2] Тамсама.

[3] Жылінскі, М. Г. Арганізацыя школьнай справы на тэрыторыі Баранавіцкай акругі (1941–1942 гг.) / М. Г. Жылінскі // 55 гадоў перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы: матэрыялы навук.-тэарэт. канф., 4–5 мая 2000 г.: у 2 ч. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2000. – Ч. 1. – С. 42.

[4] Еленская, И. Э. Документы госархива Брестской области о школьной политике оккупационных властей... – С. 240.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1943 г.) толькі ў Пінску і Пінскім раёне была адкрыта 41 школа. У іх выкладалі 26 настаўнікаў-палякаў (140 чалавек ад агульнай колькасці). У школах вучыліся 182 вучні польскай нацыянальнасці (усяго было 2862 вучні)[1].

На пачатку вайны ў Нясвіжы была арганізавана сярэдняя педагагічная школа для беларусаў. Мясцовы жыхар Чэслаў Сольчэрскі так апісвае падзеі тых часоў: «Заняткам папярэднічала арганізаваная ўладамі перавозка маёмасці былой гімназіі ў будынак сярэдняй школы на вуліцы Галуўкі. Будынак гімназіі быў перададзены для размяшчэння нямецкага шпіталя. Школьныя рэчы дапамагалі пераносіць вучні... Дырэктарам педагагічнай школы стаў Вячаслаў Арэнь. Нямецкую мову стала выкладаць беларуска Валянціна Галкіна, якая перад вайной была настаўніцай маляванне і ручной працы. Калі яе мясцовыя ўлады папрасілі даносіць на палякаў, то адказала: «Не буду плевать в колодец, с которого я пила воду». Фізіку выкладаў былы праваслаўны катэхізіст Анатоль Тымінські, які ў той час ужо не насіў сутаны. Прыроду выкладала Вольга Яроцкая, а матэматыку і хімію – былыя савецкія афіцэры, якія нейкім чынам адаптаваліся ў існуючых умовах»[2].

Ч. Сольчэрскі цікава апавядае і аб культурным жыцці ў горадзе падчас нямецкай акупацыі: «Аднаго разу прыехаў з Мінска прафесійны беларускі тэатр на гасцінныя выступы. Ён прадставіў тры рэчы: «Нору» Ібсена, «Мірандаліну» Гальдоні і «На Антаколі».

Быў на двух першых прадстаўленнях у зале ратушы, на галерэі перад выхадам. Быў вельмі крануты драмаю Норы, якая пакінула сваіх дзяцей. Першы раз у сваім жыцці глядзеў пастаноўку ў выкананні прафесійных акцёраў. На трэцяе прадстаўленне не пайшоў, бо ў той час у доме праходзіў выраб «спірту» (самагону), што ў той час было важным заняткам. Гэта было яшчэ перад замахам на Віль-

[1] ДАБрВ. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 20. – Арк. 28–33.

[2] Solczerski, Cz. Przedwojenne dzieciństwo i wojenna młodość w Nieświeżu // Nieświeskie Wspomnienia. – S. 241.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гельма Кубэ, гаўляйтара Беларусі, і тады, калі немцы крычалі ў прэсе, што Sewastopol ist gefallen (Севастопаль паў). Мне таксама ўдалося паглядзець аматарскае прадстаўленне, у якім галоўную ролю граў, мне на здзіўленне, наш настаўнік хіміі, былы савецкі афіцэр – тып аўтэнтычнага інтэлігента, цяпер цалкам зменены і выглядаючы на задаволенага жыццём. Памятаю прозвішчы некаторых вучняў з майго II класа Педагагічнай школы: Ірэна Шалас, Соф'я Кулакоўская, Аліна Смоліч, Леакадзія Варэнік, Станіслава Врубель, Станіслаў Жыліньскі»[1].

Аднак рэпрэсіі супраць настаўнікаў-палякаў працягваліся. Пра лёс некаторых настаўнікаў з Нясвіжа апавядае ў сваіх успамінах Ядвіга Мазурава: «Лёсы нашых настаўнікаў былі розныя. Жонкі афіцэраў Фліна Баркоўская-Галонская, Ядвіга Каржан, Хмялеўская былі вывезены ў лагеры. Таксама вывезлі выкладчыка польскай мовы Станіслава Курнца. Самая маладая з настаўніц Зоф'я Матлаўская была расстраляна немцамі ў Малеве. Шмат хто з нашых сяброўак і калег былі расстраляны немцамі падчас экзекуцыі яўрэяў»[2].

У канцы сакавіка 1944 г. у Клецку былі арыштаваны ўсе маладыя палякі, нават дзяўчаты. Іх вывезлі да абозу ў Калдычаве, дзе ўсіх расстралялі. «Калі ў ліпені прыйшлі Саветы, – успамінае Ядвіга Суднік, – бацькі ездзілі ў Калдычава і шукалі там трупы сваіх замардаваных блізкіх. Там загінуў сын (Мечыслаў) і дачка (Ванда) – дзеці ветэрынарнага лекара Сціркі, Анатоль Наховіч з Нясвіжа, які быў супрацоўнікам адміністрацыі ў Клецку, супрацоўніцы пошты, жонкі некалькіх польскіх падафіцэраў. Я асабіста бачыла два грузавікі (60–80 чалавек), якія былі запоўнены людзьмі, калі ў той час была ў горадзе па справах адміністрацыйных. Меркавала, што яны едуць на работы, ніхто не спадзяваўся, што іх расстраляюць»[3].

[1] Solczerski, Cz. Przedwojenne dzieciństwo i wojenna młodość... – S. 244–245.

[2] Jadwiga Mazurowa, z domu Narkiewicz-Jodko. Państwowe gimnazjum imienia Władysława Syrakomli w Nieświeżu // Nieświeskie Wspomnienia. – S. 62.

[3] Jadwiga Sudnik, z domu Ksieniewiczówna. Losy mieszkańców ziemi nieświeskiej... – S. 215.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Прыведзеныя факты сведчаць аб нялёгкім лёсе мірнага польскага насельніцтва Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны. У міжнацыянальны канфлікт былі ўцягнуты простыя жыхары, для якіх галоўнай праблемай было вырашэнне сацыяльна-бытавых пытанняў, колы мясцовай адміністрацыі, для якіх асноўным было пытанне будаўніцтва нацыянальнай аўтаноміі, а таксама праваслаўнае і каталіцкае духавенства. Канфлікт атрымаў добрую ідэалагічную падтрымку з боку акупацыйных улад, знайшоў сваю праяву ў школьнай справе. За невялікі час нямецкія акупацыйныя ўлады змянілі сваё стаўленне да яго на беларускіх землях (незалежна ад адміністрацыйнага падзелу) ад падтрымкі да крайне негатыўнага. Простыя людзі сталі ахвярамі развіцця, з аднаго боку, нацыянальнага руху беларусаў-калабарантаў і, з другога, – польскага нацыянальнага руху. Культурнае развіццё палякаў на нашых землях было спынена акупацыйнай палітыкай, прычым значная частка польскай інтэлігенцыі (як свецкай, так і духоўнай) была знішчана.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Глава 5

## УКРАІНСКІ ЭТНАС НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ АКУПАЦЫІ

Архіўныя крыніцы не дазваляюць поўна і ўсебакова апісаць гісторыю становішча ўкраінскага этнаса на тэрыторыі Беларусі ў гады акупацыі. Найбольш змястоўная інфармацыя маецца адносна тэрыторыі заходнебеларускага Палесся, якое акупацыйнымі ўладамі было ўключана ў склад Рэйхскамісарыята «Украіна». Некаторае ўяўленне аб колькасным складзе гэтай этнічнай групы даюць матэрыялы перапісу, праведзенага восенню 1941 г. У Пінску ў той перыяд пражывалі 120 украінцаў (0,3% усяго насельніцтва)[1], у Лунінцы – 81 (0,7%), у Жабчыцкім раёне – 70 (0,2%), у Лунінецкай воласці – 103 украінцы (0,5%). У сярэднім удзельная вага колькасці ўкраінцаў на дадзенай тэрыторыі не перавышала 1% агульнай колькасці жыхароў[2].

Неабходна адзначыць, што на працягу акупацыйнага перыяду лічбы істотна мяняліся. Ужо ў жніўні 1941 г. на тэрыторыі Палесся была разгорнута акцыя па перааформленні дакументаў мясцовага ўкраінскага насельніцтва. Яе мэтай, паводле Украінскага камітэта ўзаемадапамогі, які к гэтаму часу пачаў дзейнічаць у Брэсце і некаторых іншых гарадах, было вяртанне запісу аб украінскім паходжанні тым, хто па прычыне палітычных абставін быў няправільна запісаны палякам, беларусам ці нават «тутэйшым»[3]. Гэта праблема закранаецца ў паведамленні Дэлегатуры ўрада

1 AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 52.

2 Еленская, И. Немецкая политика украинизации Белорусского Полесья... – С. 209.

3 ДАБрВ. – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэчы Паспалітай на акупіраваных тэрыторыях за красавік 1944 г. Адпаведна з ім, у «адным з паветаў, праз які праходзіць чыгуначная лінія Брэст – Лунінец», паводле афіцыйнага перапісу насельніцтва, што быў праведзены немцамі ў 1941 г., пражывалі 16 украінцаў. У 1942 г. іх колькасць нечакана падскочыла да 7 тыс., у 1943 г. упала да 2400, а ў 1944 г. на тэрыторыі павета налічвалася 800 украінцаў. Рэзкі рост колькасці тлумачыцца ўключэннем гэтых тэрыторый у склад Рэйхскамісарыята «Украіна» і правядзеннем акупацыйнымі ўладамі палітыкі ўкраінізацыі. Аднак змены акупацыйнай палітыкі прывялі да наступнага падзення колькасці гэтага этнасу[1].

На беларускіх тэрыторыях у складзе Рэйхскамісарыята «Украіна» дзяржаўнымі мовамі былі абвешчаны нямецкая і ўкраінская. Гэта наклала адбітак на развіццё школьнай справы.

У справаздачы Пінскага акруговага інспектара ад 20.10.1941 г. утрымліваецца апісанне механізма стварэння нацыянальных школ: бацькі запісвалі дзяцей у навучальныя ўстановы адпаведна нацыянальнай прыналежнасці і зыходзячы з жадання навучання на адной з дазволеных моў выкладання (беларускай, рускай, польскай ці ўкраінскай). У выніку толькі 6 чалавек у Пінску выказалі жаданне вучыць сваіх дзяцей на ўкраінскай мове. Напачатку ўлады абмежаваліся ўвядзеннем украінскай мовы ў якасці абавязковага прадмета ва ўсіх школах горада і акругі. Пры гэтым узніклі пэўныя цяжкасці. Акруговы інспектар звяртаў увагу ўлад на адсутнасць падручнікаў на ўкраінскай мове, адпаведных ведаў і настаўнікаў, а таксама нежаданне дзяцей вывучаць новую мову[2].

Восенню 1941 г. у Пінску, Пінскім і Жабчыцкім раёнах было адкрыта 7 украінскіх школ (7% ад агульнай колькасці). У цэлым па Пінскай акрузе восенню 1941 г. працавала 8 украінскіх школ (5%)[3].

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 195. – K. 89.
[2] ДАБрВ. – Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 144. – Арк. 15.
[3] Тамсама. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 20.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па звестках на сакавік 1942 г., у Пінскай акрузе працавала 38 украінскіх школ (з агульнай колькасці 156). З іх у Пінску – 2, Пінскім раёне – 2, Жабчыцкім і Іванаўскім раёнах – па 17[1]. Восенню 1942 г. у Пінску працавалі 2 украінскія школы (1 беларуская), у Іванаўскім – 24 (33 беларускія), раёне Пінск-Захад – 31 (13 беларускіх), раёне Пінск-Усход – 1 украінская (5 беларускіх)[2].

Цікава параўнаць колькасць нацыянальных школ з нацыянальным складам насельніцтва. У кастрычніку 1942 г. у Пінску пражывалі 76 немцаў (з іх 7 дзяцей да 14 гадоў), 443 украінцы (з іх 61 дзіцё да 14 гадоў), 5285 беларусаў (з іх 1176 дзяцей да 14 гадоў), 1275 рускіх (з іх 293 дзіцяці да 14 гадоў), 4944 палякі (з іх 1242 дзіцяці да 14 гадоў), 17 934 яўрэяў (з іх 5783 дзіцяці да 14 гадоў) і 36 чалавек іншых нацыянальнасцей[3].

У верасні 1943 г. у Пінску і Пінскім раёне была адкрыта 41 школа. У іх працавалі 6 настаўнікаў-украінцаў (з агульнай колькасці 140 чалавек). У школах навучаліся 249 вучняў украінскай нацыянальнасці (з агульнай колькасці 2862 вучні)[4]. Сярод настаўнікаў г. Пінска і Пінскага раёна ўкраінцы складалі 4,2% усіх настаўнікаў, а вучні-ўкраінцы – 8,7% усіх вучняў.

У Брэсце восенню 1941 г. было адкрыта 13 школ. З іх 3 – украінскія[5]. Па стане на канец мая 1943 г. у горадзе было 14 школ. З іх 3 – украінскія (6 – польскіх, 3 – рускія і 1 – беларуская)[6].

Па звестках Дэлегатуры ўрада Рэчы Паспалітай на акупіраваных тэрыторыях, на чэрвень 1943 г. у Драгічынскім і Кобрынскім паветах было 230 школ. З іх 160 – украінскіх, 39 – беларускіх, 3 – польскія. Ва ўкраінскіх школах працаваў 221 настаўнік і займаліся 13 390 дзяцей[7].

---

[1] ДАБрВ. – Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 20. – Арк. 2.
[2] Тамсама. – Спр. 15. – Арк.18.
[3] Тамсама. – Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 86. – Арк. 11.
[4] Тамсама. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 40. – Арк. 28–33.
[5] Тамсама. – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 227.
[6] Тамасма. – Ф. 750. – Воп. 1. – Спр. 353. – Арк. 306.
[7] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 213. – K. 20.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адкрытыя ў верасні школы працавалі да 1 снежня 1941 г. Навучанне было бясплатнае ў пачатковых класах і платнае – у сярэдніх (8–10 класы). Асноўным пры вырашэнні пытання аб працягу навучання быў запас ведаў вучня. У выкладанні прытрымліваліся старых школьных праграм за выключэннем «прадметаў палітычнага значэння» – гісторыі і геаграфіі. Настаўнікамі ў школы былі запрошаны палітычна надзейныя кадры з адпаведнай падрыхтоўкай. Аднак з-за недахопу спецыялістаў было прынята рашэнне дапусціць да працы ў пачатковых класах былых курсантаў – людзей з незакончанай вышэйшай адукацыяй. Прадугледжвалася паслаць іх на зімовых канікулах на падрыхтоўчыя курсы.

Пасля зімовага перапынку школы аднавілі працу 1 сакавіка 1942 г. Пры гэтым былі перагледжаны школьныя праграмы. Навучанне ў школах павінна было весціся на роднай мове, абавязковым было прызнана выкладанне нямецкай мовы. Адбывалася паступовая замена рускай мовы ў пачатковых, а таксама сямікласных школах «роднай мовай» (імі ў той час прызнаваліся толькі беларуская і ўкраінская).

Як адзначаў акруговы інспектар, «паступовы пераход ад рускай мовы выкладання да ўкраінскай выкарыстоўваецца пераважна ў былых рускіх школах, дзе як прадмет выкладаецца ўкраінская мова, а выкладанне іншых прадметаў пакуль вядзецца на рускай мове з паступовым азнаямленнем з тэрміналогіяй на ўкраінскай мове. Да такіх школ належаць дзве ўкраінскія ў г. Пінску. Што датычыць сумеснага навучання дзвюм мовам, то гэта недапушчальна, бо парушае прынцып навучання на роднай мове і адначасова стварае цяжкасці ў вучэбнай праграме»[1]. Пазней, 19 кастрычніка 1942 г., у сваім рапараджэнні пінскі акруговы камісар Кляйн заўважыў, што «галоўнай мэтай застаецца замена ў школе беларускай мовы ўкраінскай»[2].

[1] ДАБрВ. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 20. – Арк. 3.
[2] Тамсама. – Спр. 12. – Арк. 67.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7 сакавіка 1942 г. распараджэннем улад былі закрыты старшыя класы сямікласных школ у сувязі з тым, што ўзрост дзяцей абмяжоўваўся 7–11 гадамі. Аднак з-за таго, што ў папярэднія гады ў школы прымаліся дзеці не з 7, а з 8 гадоў, і за тры гады яны не маглі закончыць чатырохкласнай школы, да канца навучальнага года было дазволена вучыцца і 12-гадовым вучням для таго, каб яны маглі закончыць чатырохкласную пачатковую школу.

Працяглы зімовы перапынак прымусіў падоўжыць заняткі да 1 ліпеня. Для большай выніковасці працы ўрок працягваўся 50 хвілін пры 10-хвілінным малым і 20-хвілінным вялікім перапынках. Заняткі пачыналіся ў 8 і заканчваліся ў 13 гадзін. Гэта давала магчымасць у некаторых школах, у якіх не хапала памяшканняў, праводзіць навучанне ў дзве змены пры дзённым асвятленні. У школах як асобны прадмет уводзілася рэлігія[1].

Па звестках берасцейскага акруговага школьнага інспектара, у маі 1942 г. у Брэсце працавалі 3 украінскія пачатковыя школы, украінская тэхнічная і рамесная школы. На тэрыторыі акругі, якая ўключала 5 раёнаў, існавала 174 школы. З іх 161 – украінская і 13 – польскіх. Сярод 352 настаўнікаў украінцаў было 283. Рэшту складалі рускія, палякі і беларусы. У сувязі з тым, што настаўнікаў, якія маглі выкладаць на ўкраінскай мове, не хапала, ва ўсіх раёнах былі арганізаваны настаўніцкія курсы ўкраінскай мовы і методыкі. З пачаткам новага школьнага года планавалася адкрыць аднагадовыя настаўніцкія курсы для моладзі, якая скончыла 6–7 класаў савецкай школы[2].

Восенню 1942 г. у Брэсце працавала 13 пачатковых школ з 1–5 класамі. З іх толькі тры былі ўкраінскія (394 вучні). Астатнія размяркоўваліся наступным чынам: 6 польскіх, 3 рускія і 1 беларуская. Вышэй за пачатковую была адна ўкраінская школа (300 вучняў). У трохгадовай украінскай

---

[1] ДАБрВ. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 20. – Арк. 1–1 адв.

[2] Наше слово (Брест). – 1942. – 7 черв. – С. 4; 14 черв. – С. 4; 28 лип. – С. 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхнічнай школе вучыліся 290 вучняў, у рамеснай для хлопцаў – 60, жаночай рамеснай – 60[1].

Праўкраінская палітыка акупацыйных улад на тэрыторыі Рэйхскамісарыята «Украіна» дазволіла ўкраінцам разгарнуць культурна-асветніцкую дзейнасць. Ужо ў 1941–1942 гг. працавалі ўкраінскія камітэты ўзаемадапамогі ў Брэсце (кіраўнік Аляксандр Гнатаў), Лунінцы, Іванаве, Драгічыне. Яны складаліся з шэрага аддзелаў, што кантралявалі адукацыю, ахову здароўя, сельскую гаспадарку, пошту і г. д.[2] Камітэты разгарнулі шырокую культурна-асветніцкую дзейнасць, якая ўключала ў сябе: 1) арганізацыю і ўтрыманне навучальных устаноў; 2) адкрыццё бібліятэк, музычных, драматычных, танцавальных і спартыўных гурткоў; 4) арганізацыю і правядзенне культурных мерапрыемстваў; 5) прызначэнне стыпендый бедным вучням[3].

Нацыянальныя камітэты ўзаемадапамогі значна ўплывалі на развіццё школьнай справы. Дзякуючы ім пры школьным аддзеле гарадскога кіравання Брэста была створана камісія з прадстаўнікоў камітэтаў. Яна на працягу тыдня пад кіраўніцтвам школьнага аддзела праводзіла запіс дзяцей у школу ў адпаведнасці з нацыянальным паходжаннем. У выніку ў горадзе былі адкрыты тры ўкраінскія школы. Аднак, як адзначаў у справаздачнай запісцы старшыня Украінскага камітэта самадапамогі, не ўсе кіраўнікі іншых нацыянальных школ былі згодны з яскрава выражанай тэндэнцыяй у школьнай палітыцы акупантаў, накіраванай на ўкраінізацыю школы. У дакуменце ўтрымліваецца абвінавачванне кіраўніка рускай школы № 5 у пераманьванні дзяцей да сябе, у выніку чаго ў першы клас рускай школы запісаліся 130 дзяцей, у той час як ва ўкраінскую, якая знаходзілася побач, не было пададзена ніводнай заявы[4].

---

[1] Наше слово (Брест). – 1942. – 9 жовт. – С. 4.

[2] ДАБрВ. – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 4–22.

[3] Яленская, І. Э. Арганізацыя самадапамогі на тэрыторыі Брэстчыны... – С. 69–70.

[4] ДАБрВ. – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 227.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бацькі дзяцей в. Галева Пінскай акругі напісалі заяву ва Украінскі камітэт самадапамогі аб тым, што навучанне ў школе, якая лічыцца ўкраінскай, вядзецца на беларускай мове. Па даручэнні пінскага акруговага школьнага інспектара 17 кастрычніка 1942 г. была арганізавана праверка школы. Яна выявіла, што скарга жыхароў была беспадстаўнай, бо выкладанне ва ўсіх класах вялося на ўкраінскай мове. Толькі ў першым класе з-за адсутнасці ўкраінскіх букВароў настаўніца часова карысталася беларускімі (па яе словах, беларуская мова дзецям больш зразумелая), прычым папярэдне яна заручылася згодай бацькоў. Інспектар, які праводзіў абследаванне, заўважыў характэрную асаблівасць: дакументы сельскага старасты і заявы жыхароў в. Галева былі напісаны на рускай мове, хаця сваёй роднай мовай яны лічылі ўкраінскую. Такім чынам канфліктную сітуацыю ў школе інспектар патлумачыў тым, што мясцовыя жыхары за ўкраінскую прымаюць рускую мову[1].

Падобная сітуацыя з выкарыстаннем мовы была адзначана пры праверцы школы в. Бясхлебавічы: «Па заяве настаўніцы заняткі вядуцца на ўкраінскай мове, але ні ад дзяцей, ні ад настаўніцы не было чуваць украінскіх слоў, а толькі беларуская мова змешаная з рускай»[2].

Актыўная дзейнасць Украінскага камітэта самадапамогі была накіравана і на адкрыццё рамесных школ. 11 лістапада 1941 г. Камітэт атрымаў дазвол камісара на стварэнне ў Брэсце ўкраінскай сярэдняй тэхнічнай і рамеснай школ. Мэтамі дадзеных устаноў былі наступныя: за кароткі час падрыхтаваць неабходных спецыялістаў – электрамеханікаў, будаўнікоў, дарожнікаў, работнікаў меліярацыі і воднай гаспадаркі. Тэхнічная школа з трохгадовым тэрмінам навучання складалася з двух аддзяленняў: электрамеханічнага і дарожна-будаўнічага. Двухгадовая (з восені 1942 г. – трохгадовая) рамесная школа падраздзялялася на мужчынскую

[1] ДАБрВ. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 17. – Арк. 53; Ф. 2135. – Воп. 1. – Спр. 377. – Арк. 54.

[2] Тамсама. – Арк. 14.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з кавальска-слясарным і сталярным аддзяленнямі, і жаночую школу кройкі-шытва і трыкатажу. У праграму навучання ва Украінскай жаночай рамеснай школе ўваходзілі наступныя прадметы: украінская мова, гісторыя, геаграфія, арыфметыка, алгебра, геаметрыя, фізіка, хімія, таваразнаўства, нямецкая мова, фізічныя заняткі, рахункаводства. Сярод практычных прадметаў былі: тэхнічны малюнак, кравецкі крой, крой бялізны, кравецкае шытво, шытво бялізны, ручныя работы, хатняя гаспадарка. Акупацыйныя ўлады не дапамагалі школе, таму Украінскі камітэт самадапамогі вымушаны быў вызначыць плату за навучанне[1].

На першы курс сярэдняй тэхнічнай школы прымаліся асобы, якія мелі закончаныя 8 класаў сярэдняй школы. Асобы, якія не мелі належнага ўзроўню адукацыі, з лета 1942 г. маглі быць прыняты пасля заканчэння спецыяльнага курса, які быў арганізаваны летам і працягваўся два месяцы[2]. У 1941/42 навучальным годзе ў тэхнічнай школе было два курсы па два аддзелы на кожным з агульнай колькасцю 91 вучань. Акрамя гэтага, існаваў падрыхтоўчы клас, які быў падзелены на чатыры групы ў адпаведнасці з годам паступлення вучняў у школу і ступенню іх падрыхтаванасці. Усяго ў ім навучаўся 131 вучань. У рамеснай мужчынскай школе быў толькі адзін 1-ы клас з двума аддзеламі – сталярным і слясарным – і агульнай колькасцю 26 чалавек. Аднак слясарны аддзел не выканаў сваіх прац у майстэрні, бо не здолеў дастаць ні горна для школьнай кузні, ні неабходных для кавальскай справы матэрыялаў (вуглю, розных падручных матэрыялаў і інш.). У рамеснай жаночай школе, якая была адкрыта 15 лютага 1942 г., таксама быў толькі адзін 1-ы клас з аддзеламі крою, шытва і трыкатажу з агульнай колькасцю 38 вучаніц. Плата за навучанне ў школе складала 50 рублёў штомесяц. Акрамя гэтага, пры мужчынскай рамеснай школе ўлетку 1942 г. былі арганізаваны шафёрскія курсы, на якіх займаліся 22 вучні. Пры рамеснай

[1] ДАБрВ. – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 198–200, 253.
[2] Наше слово (Брест). – 1942. – 5 лип. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жаночай школе праводзіліся кароткатэрміновыя жаночыя курсы крою, шытва і трыкатажу для 57 вучаніц. Плата за навучанне на курсах складала 230 рублёў. Усяго ў дзвюх школах навучаліся 367 чалавек (толькі на курсах крою, шытва і трыкатажу – 120). У гэтую лічбу не ўваходзяць тыя вучні, якія вымушаны былі пайсці са школы па прычыне няздольнасці да навучання ці з-за фінансавых праблем, тым больш што не было ніякай магчымасці арганізаваць для іх ні інтэрната, ні якой-небудзь сталоўкі.

З пачаткам новага 1942/43 навучальнага года трохгадовая тэхнічная школа перайшла на правы дзяржаўнай. Запіс адбываўся на чатыры аддзелы: цеплаэлектрычны, механічны, архітэктурна-будаўнічы, дарожны. На ўсе аддзяленні на 1-ы курс прымаліся без экзаменаў асобы з адукацыяй 8 класаў. Тыя, хто не меў такога ўзроўню, павінны былі здаваць экзамены па матэматыцы, фізіцы, хіміі, нямецкай і ўкраінскай мовах. На 2-і і 3-і курсы прымаліся вучні з адпаведнай тэхнічнай адукацыяй па выніках праверачных па кожным курсе экзаменаў. Пры тэхнічнай школе існаваў аднагадовы падрыхтоўчы курс для вучняў з адукацыяй 6 класаў. У школу прымаліся як хлопцы, так і дзяўчаты. Вучні з адукацыяй 4 класы народнай школы прымаліся на аддзяленні Украінскай трохгадовай рамеснай дзяржаўнай школы і Украінскай жаночай рамеснай школы. З восені 1942 г. у жаночай рамеснай школе ў дадатак да аддзелаў кройкі-шытва і трыкатажу быў адкрыты трэці – хатняй гаспадаркі. Для дзяўчат пры школе быў адкрыты інтэрнат (бурса)[1]. Па дадзеных на 10 лістапада, у рамеснай жаночай школе было 118 вучаніц. На трохмесячных курсах навучаліся 68 вучаніц, у школьнай майстэрні – 24[2].

Дырэктар Украінскай тэхнічнай школы (пры якой існавалі дзве рамесныя школы) прасіў школьны аддзел Брэсцкай гарадской управы на 1942/43 навучальны год выдзеліць

[1] ДАБрВ. – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 202–202 адв.; Наше слово (Брест). – 1942. – 7 черв. – С. 4; 16 серп. – С. 4.

[2] Наше слово (Брест). – 1942. – 20 лист. – С. 4.

дадатковыя памяшканні, інтэрнат для вучняў і пакоі для настаўнікаў, якім неабходна знаходзіцца пры школе. Па яго планах, у новым навучальным годзе колькасць вучняў павінна была павялічыцца на 120–150 чалавек[1].

Цяжкі матэрыяльны стан вучняў тэхнічнай і рамесных школ, а таксама настаўніцкіх курсаў прымусіў раённага камісара Брэста 3 лістапада 1942 г. выдаць дазвол на давоз вучнямі да Брэста харчоў. Пры гэтым кожны вучань (на падставе вучнёўскага пасведчання) мог «прынесці з сабою кожны тыдзень да Бярэсця столькі харчоў, сколькі можа данесці ці прывезці роварам. Хто будзе везці падводаю, харчы будуць рэквізавацца»[2].

У лістападзе 1942 г. акупацыйныя ўлады далі дазвол на адкрыццё ў маёнтку Пятровічы Жабінкаўскага раёна дзяржаўнай украінскай сельскагаспадарчай школы. Яна была разлічана на вучняў ад 16 гадоў, якія скончылі не менш за 7 класаў, а таксама вучняў былых сельскагаспадарчых школ, якія не паспелі атрымаць гэтай адукацыі. Школе патрабаваліся настаўніцкія кадры з сярэдняй і вышэйшай аграномічнай адукацыяй. Заняткі планавалася пачаць 15 студзеня 1943 г.[3] Пра далейшы лёс гэтай ініцыятывы нам невядома.

Украінскі этнас меў свае нацыянальна-культурныя арганізацыі і ў іншых рэгіёнах Беларусі, якія ўваходзілі ў правінцыю Усходняя Прусія і ў зону тылу групы армій «Цэнтр».

Са жніўня 1942 г. у Гродне неафіцыйна (улады прынялі рашэнне «негалосна цярпець яго дзейнасць»[4]) існаваў філіял Украінскага таварыства Германіі. Яго дзейнасць была накіравана на «аб’яднане ўкраінцаў у Германіі і іншых упамянутых абласцей на аснове незалежнай, агульнаўкраінскай дзяржавы». Сярод мэт арганізацыі было «развіццё нацыянальнай культурнай дзейнасці і агітацыйнай работы

[1] ДАБрВ. – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 202–202 адв.
[2] Тамсама. – Арк. 212.
[3] Наше слово (Брест). – 1942. – 13 лист. – С. 4.
[4] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 167.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў Германіі і іншых упамянутых абласцях сярод украінцаў, а таксама іх матэрыяльная падтрымка». На чале аддзялення стаяў Фёдар Косцеў[1]. На жаль, больш звестак аб дзейнасці Таварыства не ўдалося адшукаць.

Пры садзейнічанні ўкраінскіх камітэтаў з мая 1942 г. на Палессі аднавіла дзейнасць культурна-асветніцкае таварыства «Просвіта». Яго філіялы знаходзіліся ў Брэсце, Пінску, вёсках Чарнаўшчыцы[2] і Неплі[3] Матыкальскага раёна, Жабінцы[4], Маларыце. «Пінська газета» 30 ліпеня 1942 г. пісала аб ініцыятыве аднаўлення дзейнасці гэтага таварыства ў Пінску: «Як даведваемся, ініцыятыўная група ўкраінскага насельніцтва г. Пінска, згуртаваная вакол Украінскага камітэта ўзаемадапамогі, мае намер хадайнічаць перад адміністрацыйнымі ўладамі аб аднаўленні дзейнасці даўняга культурна-асветніцкага таварыства «Просвіта». Як вядома, таварыства «Просвіта» існавала ў г. Пінску за польскім часам як філіял акруговага таварыства г. Брэста. Цяпер яно б існавала як самастойная арганізацыя пінскай акругі. Вітаем добры пачын пінскага насельніцтва ў момант, калі ўздым культурнага ўзроўню насельніцтва і яго асветнай самадзейнасці з'яўляецца такой важнаю рэччу ў паслябальшавіцкія часы»[5]. Менавіта гэта арганізацыя займалася адкрыццём украінскіх бібліятэк, а таксама харавых, музычных, драматычных, танцавальных і спартыўных гурткоў.

У ліпені–жніўні 1942 г. у Брэсце акруговае таварыства «Просвіта» арганізавала двухтыднёвыя курсы кіраўніц дзіцячых садкоў[6].

У канцы 1942 г. намаганнямі таварыства ў горадзе па вул. Больверкале (былая Міцкевіча), 23, 1 паверх, быў адкрыты інтэрнат (бурса) для дзяўчат, якія вучыліся ў тэхнічнай, рамеснай і іншых школах. Як адзначалася ў абвестцы,

---

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 165.
[2] Наше слово (Брест). – 1942. – 21 черв. – С. 4.
[3] Тамсама. – 19 лип. – С. 4.
[4] Тамсама.
[5] Пінська газета. – 1942. – 30 лип.
[6] Наше слово (Брест). – 1942. – 16 серп. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змешчанай у газеце «Наша слова», «у інтэрнаце дзяўчаты маюць дужа добрыя, гігіенічныя, спальныя памяшканні, харчаванне і дбалую апеку. Будынак інтэрната дужа чысты і нанава адрамантаваны. Акрамя гігіенічнага памяшкання, адпаведнай апекі і іншых выгодаў, утрыманне дзяўчат у інтэрнаце значна танней, чым на прыватных кватэрах»[1].

Такі ж інтэрнат на 100 асоб па вул. Кёнігштрасэ, 54 (былая Баторага) акруговы камітэт таварыства «Просвіта» арганізаваў і для хлопцаў-вучняў усіх берасцейскіх школ[2].

Украінцы імкнуліся да стварэння тэатра на роднай мове. Напрыклад, у Брэсце ў сакавіку 1942 г. быў створаны «Украінскі тэатр мініяцюр»[3]. На працягу 1942–1943 гг. ён рэгулярна выязджаў на гастролі па тэрыторыі Палесся (Жабінка, Кобрын, Драгічын, Антопаль, Іванава, Пінск, Лунінец)[4].

Аднак не заўсёды гледачы былі задаволены паказанымі спектаклямі. Напрыклад, 18 верасня 1942 г. газета «Наше слово» змясціла вельмі крытычны артыкул за подпісам М. Г. Аўтар пісаў: «У нядзелю 6-га гэтага верасня праездам праз Кобрын брэсцкі «Тэатр мініяцюр» пад кіраўніцтвам Кольчака прадставіў тут «Наталку Палтаўку». Тэатр, з увагі на вялікую зацікаўленасць публікі да роднага мастацтва, быў перапоўнены. Але тое, што гледачы ўбачылі на сцэне, абсалютна не апраўдала іх даверу да гастралюючай трупы. Гэта было не прадстаўленне класічнай украінскай аперэты, а поўная кампраметацыя і прафанацыя тэатральнага мастацтва, да якіх дайшлі людзі, якія нічога супольнага ні з украінскай сцэнай, ні з украінскім словам не маюць… Дзіву даемся той смеласці, з якой людзі пусціліся ў падарожжа па ўкраінскіх тэрыторыях з паказам балагану, а не так неабходнага гэтай парою народу нацыянальнага мастацтва». Аўтар параўноўваў выступленне гастралёраў з ігрою мясцовага аматарскага драматычнага гуртка: «Якія б агрэхі не былі ў нашага

[1] Наше слово (Брест). – 1942. – 22 груд. – С. 4.

[2] Тамсама.

[3] Наше слово (Брест). – 1942. – 5 квіт. – С. 4.

[4] Еленская, И. Немецкая политика украинизации Белорусского Полесья... – С. 210.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

маладога аматарскага драмгуртка, які нядаўна прадстаўляў «Безталанну», але ніякага параўнання гульні нацыянальна захопленых нашых аматараў да бяздушнай і глумліва прафесійнай «адпрацоўкі» вандроўных гастралёраў быць не можа. Там запал і любоў, тут чыста меркантыльны падыход да справы»[1].

Акрамя названага, у Брэсце дзейнічаў гарадскі тэатр, які абслугоўваў як жыхароў горада, так і нямецкую армію. Для апошніх ён ставіў аперэты на нямецкай мове. У сезоне 1941/42 тэатр наведалі 168 тысяч вайскоўцаў і 85 тысяч цывільных[2]. Аднак пастановак на ўкраінскай мове ў рэпертуары тэатра доўгі час не было. Толькі 7 лютага 1943 г. гледачу была прадстаўлена камедыя «Сарочынскі кірмаш»[3]. Аднак праз некаторы час тэатр выехаў ва Усходнюю Прусію. Толькі ў канцы вясны 1944 г. была створана новая тэатральная трупа. У яе ўвайшлі былыя вучні тэатральнай школы і акцёры, якія засталіся ў горадзе. У першы час памяшканне для тэатра было непрыстасаванае. Пасля рамонту яно было здольна змясціць 300 гледачоў. Склад трупы не дазваляў ставіць драматургічныя творы. У асноўным рыхтаваліся канцэртныя праграмы з удзелам хору, аркестра, балетнай групы, салістаў, мастацкага чытання[4].

У сакавіку 1943 г. у Пінску быў заснаваны гарадскі камітэт узаемадапамогі. Яго дзейнасць распаўсюджвалася на горад і раёны Пінск-Усход і Пінск-Захад. Асноўнай задачай камітэта была апека над установамі сацыяльнага характару, такімі як дзіцячы прытулак, дом для старых, дзіцячыя садкі і да т. п. Камітэт з'яўляўся самастойнай установай і існаваў на добраахвотныя ўзносы насельніцтва[5].

У Лунінцы пры Украінскім камітэце самадапамогі быў створаны аматарскі драматычны гурток (рэжысёр П. К. Плявіцкі). На працягу 1942–1943 гг. ён паставіў каля дзесятка

[1] Наше слово (Брест). – 1942. – 18 верес. – С. 4.
[2] Тамсама. – 21 серп. – С. 4.
[3] Тамсама. – 12 лют. – С. 4.
[4] Наше слово (Брест). – 1944. – 21 черв. – С. 4.
[5] Пінська газета. – 1943. – 5 берез.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спектакляў. Падобныя гурткі існавалі і ў іншых месцах. Напрыклад, як ужо згадвалася, у Кобрыне. Рэпертуар гэтых калектываў быў максімальна набліжаны да запатрабаванняў простай публікі: вадэвілі, меладрамы, аперэткі, жартоўныя п’есы, якія апісвалі сялянскае жыццё. Найбольшай папулярнасцю карысталіся творы ўкраінскіх драматургаў XIX – пачатку XX ст.: М. Крапіўніцкага («Пашыліся ў дурні»), І. Катлярэўскага («Наталка-Палтаўка»), І. Васільчанкі («Быль»), А. Чыжына («Пярэстая Красуня»), Г. Артэмоўскага («Запарожац за Дунаем»), а таксама М. Старыцкага, Квіткі-Аснаўяненкі, Сухадольскага, Чубатага, Яноўскай[1].

Неабходна адзначыць, што дадзеныя гурткі працавалі непастаянна. Напрыклад, дзейнасць драматычнага гуртка пры Украінскім камітэце самадапамогі ў Кобрыне пасля перапынку была адноўлена 1 мая 1944 г. Паведамляючы аб гэтым, газета «Наше слово» заўважала, што адначасова аднавілі працу гурткі ў раёнах Кобрынскай акругі: самадзейныя ў Антопалі і Бярозе-Картузскай і драматычны ў Драгічыне[2].

Улетку 1942 г. у Брэсце па адрасе Мітэльале, 41 (былая Касцюшкі) пачаў дзейнічаць Украінскі клуб моладзі[3]. Пры ім былі арганізаваны драматычны і спартыўны гурткі, струнны аркестр, хор і мастацкі гурток. Пры струнным аркестры для тых, хто жадаў навучыцца граць, былі арганізаваны бясплатныя курсы[4]. З 10 верасня 1942 г. пачала працаваць бібліятэка для старэйшых грамадзян, школьнай моладзі і дзяцей. Тыя, хто жадаў карыстацца яе паслугамі, павінны былі ўнесці дэпазіт (кауцыю) у памеры 15 рублёў і штомесяц плаціць па 5 рублёў. Школьнікі і члены клуба плацілі штомесяц па 3 рублі. Бібліятэка працавала па аўторках і чацвяргах[5]. У горадзе ў 1943 г. па вул. 45-й Дывізіі

[1] Еленская, И. Немецкая политика украинизации Белорусского Полесья… – С. 211; Наше слово (Брест). – 1942. – 9 жовт. – С.4.
[2] Наше слово (Брест). – 1944. – 14 черв. – С. 4.
[3] Тамсама. – 1942. – 9 серп. – С. 4.
[4] Тамсама. – 16 серп. – С. 4.
[5] Тамсама. – 11 верес. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаходзілася ўкраінская кнігарня Украінскага камітэта ўзаемадапамогі[1].

На тэрыторыі заходнебеларускага Палесся атрымалі распаўсюджанне перыядычныя выданні, якія выходзілі на Украіне і ў Германіі на ўкраінскай мове («Вісткі для українських селян», «Голос», «Нова доба», «Краківські вісці», «Волинь», «Сурма», «Українські голос», «Українські хлібороб» і інш.). Найбольш значнымі мясцовымі выданнямі былі штотыднёвыя газеты «Наше слово» (Брэст, адказны рэдактар Іван Пячко) і «Пінська газета» (Пінск, з лета 1942 г. адказны рэдактар – Фёдар Дудко, з восені 1942 г. – галоўны рэдактар Яфім Скрыпнюк, кіраўнік выдавецтва – Яўген Міцкевіч, са снежня 1943 г. – галоўны рэдактар і кіраўнік выдавецтва Яўген Міцкевіч). Наклады выданняў былі значнымі. Напрыклад, у жніўні 1942 г. чатыры нумары «Пінськай газеты» выйшлі агульным тыражом 59 460 экзэмпляраў[2].

Газеты з'яўляюцца крыніцай разнастайнай інфармацыі аб культурным жыцці ўкраінскага этнасу. Напрыклад, 19 лютага 1943 г. «Пінська газета» пісала аб прадстаўленні ў Лунінцы Украінскім драматычным гуртком п'есы І. Васільчанкі «Быль» і А. Чыжына «Пярэстая Красуня»: «Увогуле гульня атрымалася не вельмі добрая. Не ўсе акцёры ўжыліся ў свае ролі, не ўсе нават іх як след вывучылі»[3].

Рэлігійнае жыццё прыхільнікаў праваслаўя на тэрыторыі, якая ўвайшла ў Рэйхскамісарыят «Украіна», было звязана з Украінскай праваслаўнай царквой, якая ўжо ў першыя месяцы акупацыі распалася на дзве плыні – аўтакефалістаў і аўтанамістаў[4].

Дзейнасць разнастайных украінскіх арганізацый патрабавала поўнай іх лаяльнасці да ўлад. Любое парушэнне адразу каралася. Так, напрыклад, 8 снежня 1943 г. у Кобрыне

---

[1] Наше слово (Брест). – 1943. – 12 лют. – С. 4.

[2] Еленская, И. Немецкая политика украинизации Белорусского Полесья… – С. 211.

[3] Пінська газета. – 1943. – 19 лют.

[4] Навіцкі, У. І. Рэлігійнае жыццё ў гады Вялікай Айчыннай вайны. – С. 220.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былі арыштаваны 10 членаў Украінскага камітэта. Сярод магчымых прычын называўся іх кантакт з украінскімі партызанамі, якія знаходзіліся ў Дывіне (35 км на поўдзень ад Кобрына)[1].

З развіццём ваенных дзеянняў Чырвонай арміі па вызваленні беларускіх зямель назіралася ўзмацненне актыўнасці партызан і іншых узброеных фарміраванняў рознастайнай палітычнай і нацыянальнай арыентацыі. Украінцы масава далучаліся да партызанскага руху. У сувязі з гэтым на пачатку 1944 г. змяніліся адносіны акупацыйных улад Брэста да ўкраінцаў: было напалову зменшана фінансаванне Украінскага камітэта і адмоўлена ў падтрымцы ўкраінскай царкве. Адначасова і ўкраінцы змянілі сваё стаўленне да ўлад. Тыя з іх, хто займаў пасты ў мясцовай адміністрацыі, імкнуліся да звальнення з наступным выездам з тэрыторыі[2].

Такім чынам, нацыянальная палітыка акупацыйных улад актывізавала грамадска-культурную дзейнасць украінскага этнасу на беларускіх тэрыторыях, якія ўвайшлі ў склад Генеральнага камісарыята «Украіна». Палітыка ўкраінізацыі вяла да прымусовага пашырэння адукацыі на ўкраінскай мове (пры ўдзельнай вазе дадзенага этнасу 1%). Шырокае распаўсюджанне атрымалі ўкраінскія камітэты ўзаемадапамогі, была адноўлена дзейнасць культурна-асветніцкага таварыства «Просвіта». Яны здолелі разгарнуць культурную і сацыяльную працу. Значную ўвагу акупацыйныя ўлады звярталі на развіццё ўкраінскага друку. Аднак імкненне да самавызначэння на апошнім этапе вайны прывяло да росту напружання і паступовага росту варожасці паміж акупацыйнымі ўладамі і ўкраінскім насельніцтвам.

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 193. – K. 135.
[2] Тамсама. – К. 164.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Глава 6*

# ЖЫЦЦЁ РУСКАЙ ЭТНІЧНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

Згодна з нямецкімі дадзенымі канца 1941 г., на тэрыторыі Беларусі (у межах чэрвеня 1941 г.) пражывалі 590 тыс. (5,6%) рускіх[1]. Зразумела, што ўдзельная вага колькасці рускіх у розных месцах была неаднолькавай. Напрыклад, у Лунінцы ў пачатку лістапада 1941 г. яны складалі 4,6% усяго насельніцтва горада (378 чалавек з 8095), а ў цэлым па Лунінецкім раёне – 0,6% (482 чалавекі з 72 199)[2]. У Мінскім раёне на 10 лістапада 1941 г. рускія складалі 2,2% насельніцтва (1283 чалавекі з 59 112)[3]. У Пінску ў верасні 1941 г. сярод насельніцтва ўзростам звыш 14 гадоў было 4,4% рускіх (900 чалавек, з якіх каля 300 прыбылі з Расіі, з агульнай колькасці 20 293 чалавекі)[4].

У рапартах прадстаўніцтва Дэпартамента інфармацыі і прэсы Дэлегатуры ўрада Рэчы Паспалітай на акупіраваных тэрыторыях за 1942 г. даецца наступная характарыстыка рускай групы насельніцтва на Палессі: «Рускія прадстаўляюць дастаткова моцную групу, бо складаюцца пераважна з інтэлігенцыі. Гэта праваслаўнае духавенства, рэшткі сямей былых служачых з часоў царызму, а таксама – асобная група – так званыя ўсходнікі, ці розныя савецкія работнікі, якія засталіся на месцы пасля ўцёкаў бальшавікоў. Мясцовыя рускія з'яўляюцца палітычна актыўным элементам, пры гэтым праводзяць рашучую антыпольскую палітыку, «усходнікі» сядзяць ціха»[5].

[1] НАРБ. – Ф. 510. – Воп. 1. – Спр. 108. – Арк. 45–46.
[2] ДАБрВ. – Ф. 2149. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 2.
[3] ДАМВ. – Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 73.
[4] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 52.
[5] Тамсама. – К. 52а.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рускае насельніцтва на тэрыторыях, якія не ўваходзілі ў Генеральную акругу Беларусь, не аддзялялася ад беларускага. Яго праблемы часам разглядаліся побач з праблемамі беларусаў у змаганні з «польскімі ўплывамі». На пачатку восені 1941 г. у камендатуру Гродна была накіравана просьба епархіяльнага ўпраўлення (?) аб высяленні з брацкага царкоўнага дома (вул. Замкавая, 3) пагарэўшых яўрэяў, якія былі туды паселены магістратам, з мэтай адкрыцця ў доме прытулку для рускіх дзяцей, якія знаходзіліся ў польскіх прытулках[1].

Праз некаторы час быў накіраваны наступны запыт, ужо ад праваслаўнага брацтва, на імя каменданта г. Гродна. У ім гаварылася пра неабходнасць вырашэння патрэб беларускага і рускага насельніцтва, сярод якіх – стварэнне сірочага дома для дзяцей праваслаўнага веравызнання, пры якім неабходна абсталяваць дзіцячы інтэрнат для немаўлят і дзяцей да 3 гадоў, чые маці павінны хадзіць штодзённа на працу. Прапаноўвалася стварыць абшчынны магазін, у якім беларусы і рускія маглі б атрымліваць нормы прадуктаў, вызначаныя нямецкай адміністрацыяй. Не засталася па-за ўвагай і неабходнасць адкрыцця вячэрніх курсаў нямецкай мовы. Для ўсіх трох устаноў праваслаўнае брацтва выказвала згоду даць памяшканні ў сваім будынку па вул. Замкавая, 3. У канцы звароту рабілася заява аб тым, што «вельмі неабходна вывесці дзяцей рускіх і беларускіх бацькоў праваслаўнага веравызнання з гарадскіх сірочых дамоў, бо там адбываецца прымусовая паланізацыя і перавод дзяцей у каталіцызм»[2].

З пачаткам акупацыі германскія ўлады дазволілі адкрываць школы для насельніцтва незалежна ад яго нацыянальнасці. Галоўнай падставай для стварэння нацыянальных класаў і школ з'яўляліся заявы бацькоў.

Вялікі ўплыў на развіццё школьнай справы аказвалі нацыянальныя камітэты. У Брэсце з пачатку жніўня 1941 г.

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 33. – Арк. 22.
[2] Тамсама. – Арк. 21.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнічаў Рускі камітэт узаемадапамогі. 11 кастрычніка 1941 г. яго старшыня С. Трыбух звяртаўся ў школьны аддзел магістрата па падтрымку намеру адкрыцця трох рускіх школ у горадзе і з прапановай аб выкарыстанні канкрэтных будынкаў для іх непасрэдна ў горадзе (вул. Доўгая, 11), у Кіеўскім прадмесці (вул. Рэйманта, 18), на Граёўцы (вул. Граёўская, 9)[1]. Вядома, што камітэт дзейнічаў да пачатку 1944 г. Доказам гэтага факта з'яўляецца ведамасць на выдачу зарплаты загадчыцы чытальні пры таварыстве Лідзіі Алыменкі[2]. Намаганні камітэта прынеслі поспех – з адкрытых у горадзе 13 сямігадовых школ 3 былі рускія[3]. Неабходна заўважыць, што працэнт рускіх школ быў значным і не адпавядаў рэальнай колькасці рускага насельніцтва. Так, восенню 1941 г. у Пінску, Пінскім і Жабчыцкім раёнах была адкрыта 41 руская школа (38%). У цэлым па Пінскай акрузе восенню 1941 г. па мове выкладання налічвалася 58 рускіх школ (32%). Так, у Пінску з 6 школ дзве былі рускія. У школе па вул. Альбрэхтаўская вучыліся 211 вучняў (з іх 105 – рускія), па вул. Лагішынская – 202 (86 – рускіх). Ва ўсіх школах вучыліся 377 вучняў рускай нацыянальнасці (з агульнай колькасці 1244 вучні)[4].

Аднак неўзабаве культурная палітыка змянілася. У розных зонах акупацыі пачала праводзіцца палітыка «нацыяналізацыі», якая ставіла на мэце спрыянне развіццю культуры тытульных этнасаў. У выніку вясной 1942 г. у Пінскай акрузе, якая ўваходзіла ў склад Генеральнай акругі Валынь-Падолія, не было зарэгістравана ніводнай рускай школы[5].

Пачатак 1942 г. адзначаны разгортваннем шавіністычнай палітыкі ў Генеральнай акрузе Беларусь, накіраванай супраць «варожых беларускаму народу элементаў», да якіх былі аднесены палякі, рускія і яўрэі. У дакуменце аддзела

---

[1] ДАБрВ. – Ф. 203. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 30.
[2] Тамсама. – Ф. 2135. – Воп. 1. – Спр. 348. – Арк. 69–69 адв.
[3] Тамсама. – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 227.
[4] Тамсама. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 20.
[5] Тамсама. – Спр. 20. – Арк. 1–4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры і адукацыі Мінскага гарадскога камісарыята (чэрвень–ліпень 1942 г.) «Аб школьнай справе Беларусі» заўважаецца: «Нацыянал-чужыя элементы праводзілі на Беларусі сваю эгаістычную палітыку. Расейскі элемент, усёроўна ці ён у манархічную, ці ў рэспубліканскую, ці ў бальшавіцкую фарбу маляваны, застаецца агентам маскоўскага цэнтралізму»[1]. У дакладзе «Аб школьнай справе Беларусі» (1 чэрвеня 1942 г.) гаворыцца: «Расейская інтэлігенцыя, якая засталася на Беларусі па Царскай Расеі, імкнецца пашырыць тут уплывы «адзінай недзялімай Расеі» як магутнай дзяржавы»[2].

У выніку значная частка настаўнікаў рускай нацыянальнасці была адхілена ад працы ў школах. Падобная карціна назіралася і на беларускіх землях, уключаных у склад Генеральнай акругі Валынь-Падолія. Напрыклад, у верасні 1943 г. у Пінску і раёне была адкрыта 41 школа. У іх выкладалі толькі 8 настаўнікаў-рускіх (з агульнай колькасці 140 чалавек). Сярод вучняў было 82 чалавекі рускай нацыянальнасці (усяго 2862 вучні)[3].

Толькі восенню 1942 г. на тэрыторыях Беларусі, падкантрольных вайсковай адміністрацыі, адкрыліся школы. Аб гэтым пісала бабруйская газета «Новый путь», якая, дарэчы, пачала выдавацца толькі з красавіка 1942 г. штотыднёва на рускай мове: «1 верасня 1942 г. значная дата ў жыцці Бабруйска. У гэты дзень дзеці і юнакі, пасля 14-месячнага перапынку, зноў пайшлі ў школу. У гэты час заняткі ў бабруйскіх школах у асноўным праходзяць нармальна. Праўда, ёсць яшчэ шмат нявырашаных пытанняў (у прыватнасці, пытанне моў)»[4].

Адказ не быў знойдзены і на наступны год. Выкладанне ў школах павінна было праходзіць па жаданні большасці бацькоў навучэнцаў ці на рускай, ці на беларускай мове.

---

[1] ДАМВ. – Ф. 688. – Воп. 2. – Спр. 2. – Арк. 2.
[2] Тамсама.– Арк. 6.
[3] ДАБрВ. – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 20. – Арк. 28–33.
[4] Новый путь (Бобруйск). – 1942. – 12 сент. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другая з іх павінна была вывучацца ў школах пачынаючы з 3-га класа, але ўжо не ў якасці мовы выкладання, а ў якасці вучэбнага прадмета. Нямецкая мова – пачынаючы з 5-га класа як вучэбны прадмет[1]. Пры гэтым новыя вучэбныя праграмы па ўсіх прадметах былі атрыманы з дзяржаўнага інспектарата школ Беларусі. Праграма па рускай мове і ўсе праграмы для рамесна-прафесійных школ выпрацаваны абласным аддзелам народнай адукацыі. Настаўнікам прапаноўваўся педагагічны часопіс «Школа і выхаванне», які выдаваўся з мая 1943 г. у Смаленску на рускай мове. (Заўважым, што адзін з першых артыкулаў часопіса меў тытул «Бліжэйшыя задачы рускай народнай школы»[2].) Дрэнны быў стан забяспечанасці падручнікамі. Новых – не было. Часопіс-падручнік «Беларуская школа», які выдаваўся ў Мінску, у вобласць армейскага тылу не дастаўляўся. Настаўнікам даводзілася займацца па «непрыдатных савецкіх падручніках, карыстаючыся ўказаннямі аддзела народнай адукацыі аб зняцці з іх бальшавіцкага прапагандысцкага матэрыялу»[3].

Як бачым, у школьнай справе ў раёнах, падкантрольных вайсковай адміністрацыі, не навязвалася адкрыццё беларускіх ці ўкраінскіх школ. Распавядаючы пра вынікі 1942/43 навучальнага года, газета «Новый путь», якая выдавалася ў Гомелі на рускай мове, пісала: «Жыватворны ўплыў на паспяховасць і паводзіны вучняў відавочна аказала і тая акалічнасць, што навучанне ў большасці школ раёнаў адбываецца на роднай беларускай мове. Выключэнне ў гэтых адносінах складаюць толькі Гомель і Церахаўскі раён, дзе пераважаюць рускія школы»[4].

Апеку над народнай школай, што была адкрыта ў Глуску восенню 1942 г., узяў рускі добраахвотны батальён, які «аказаў вялікую дапамогу ў арганізацыі працы школы»[5].

[1] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 25 авг. – С. 3.
[2] Тамсама. – 19 мая. – С. 4.
[3] Тамсама. – 25 авг. – С. 3.
[4] Новый путь (Гомель). – 1943. – 14 авг. – С. 3.
[5] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 3 июля. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экзамен па рускай мове ў канцы 1942/43 навучальнага года здавалі як перавадны вучні 5 і 6 класаў і як выпускны вучні 7 класаў г. Віцебска і Віцебскага раёна[1].

Побач з гэтымі тэндэнцыямі ў палітыцы акупацыйных улад назіралася і іншая – спрыянне развіццю нацыяналістычных, белаэмігранцкіх арганізацый. Неабходна заўважыць, што ў 1941–1942 гг. яны дзейнічалі пераважна ў заходніх раёнах Беларусі, якія не патрапілі ў склад Генеральнай акругі Беларусь. З першых месяцаў вайны актыўную дзейнасць у Брэсце разгарнуў Саюз рускіх нацыяналістаў, які выступаў з заклікамі да рускага народа аб стварэнні «Нацыянальнай Рускай дзяржавы, заснаванай на адзінстве рускай нацыі і іншых народаў, блізкіх да гэтай нацыі». Пры гэтым прапаноўвалася «законамі Новай Расіі прадугледзець магчымасць развіцця нацыянальнай культуры, роднай мовы (пры абавязковасці рускай мовы як мовы агульнадзяржаўнай) розных нацыянальнасцей, якія насяляюць Расію»[2]. У іншым звароце Цэнтра Саюза рускіх нацыяналістаў да «падманутых і змучаных рускіх людзей» за подпісам палкоўніка Радзіёнава ўтрымліваўся заклік да пераходу на бок Саюза «для далейшай сумеснай барацьбы за справу Рускага народа»[3]. Акупацыйныя ўлады скрозь пальцы глядзелі на такія далёкасяжныя планы, паколькі Саюз рускіх нацыяналістаў не быў масавай уплывовай арганізацыяй, але ў сваёй славеснай атацы на партызан і агітацыі мясцовага насельніцтва супраць «камуністаў і бандытаў» мог быць карысным Рэйху. Са згоды камандавання СРН заснаваў Рускі камітэт узаемадапамогі (аб яго дзейнасці гаварылася вышэй), Рускую нацыяналістычную брыгаду, узяў пад кантроль адукацыю ў рускіх школах, аказваў харчовую дапамогу лагеру савецкіх ваеннапалонных у Брэсце[4].

У 1942 г. у Гродне была створана белаэмігранцкая арганізацыя Рускі камітэт. Яна аб’ядноўвала былых памешчы-

[1] Вясновыя іспыты // Беларускае слова (Віцебск). – 1943. – 15 мая. – С. 4.
[2] ДАБрВ. – Ф. 203. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 2.
[3] Тамсама. – Арк. 6–7.
[4] Тамсама. – Арк. 19.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў, афіцэраў, якія ў гады рэвалюцыі пакінулі Расію. Кіраўніцтва ажыццяўлялі былыя царскія афіцэры Дамброўскі, Літвінаў, Выбаноўскі, былая памешчыца Трусава. Камітэт працаваў пад лозунгам стварэння незалежнай манархічнай Расіі ў межах 1914 г. Члены камітэта вербавалі ў сваю арганізацыю і армію Уласава папаўненне з ліку мясцовага рускага насельніцтва і ваеннапалонных[1].

Восенню 1943 г., калі становішча на франтах стала крытычным для нямецкага вермахта, узнікла ідэя адрадзіць казацкія аб'яднанні. Дэкларацыя германскага ўрада ад 10 лістапада 1943 г. прызнала заслугі казацтва ў барацьбе супраць «жыда-бальшавізму» і назвала яго саюзнікам у вайне[2].

На фронт, які імкліва набліжаўся да былой заходняй мяжы СССР, у 1944 г. немцы сталі перакідваць казацкія злучэнні. Галоўнай задачай, якую ставіла перад імі камандаванне, была барацьба з партызанамі і навядзенне грамадскага парадку на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. За гэта ім абяцаліся вялікія прасторы зямлі на тэрыторыі краю пасля заканчэння вайны. На мітынг, арганізаваны на Паўднёвым фронце перад адпраўкай казакаў у раён Навагрудка, палкоўнік Паўлаў прама заявіў, што партызанскія вёскі будуць цалкам высяляцца, а на іх месцы ўзнікнуць казацкія сядзібы[3].

У газетах той пары пастаянна сутыкаешся з тым, што казакі называлі гэтыя месцы сваёй радзімай і ўсур'ёз уладкоўваліся на занятай тэрыторыі. Сваё жыццё яны арганізоўвалі «на казацкі лад», у адпаведнасці з традыцыйным ладам жыцця, які яны вялі на радзіме. Новыя пасяленцы прыбывалі з Растова-на-Доне, Надцерачнай вобласці, Чарнігаўскай, Харкаўскай, Вінніцкай, Чэлябінскай абласцей. Разам з вайскоўцамі прыязджалі іх сем'і.

Найбольшай канцэнтрацыі казацкія пасяленні дасягнулі пад Баранавічамі і Навагрудкам, у Любчанскім і Іўеўскім

---

[1] Ярмусік, Э. С. Некаторыя аспекты палітыкі нямецка-фашысцкіх акупацыйных улад у Гродне... – С. 170.

[2] ДАБрВ. – Ф. 708. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 1.

[3] Тамсама. – Ф. 701. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 52.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раёнах. Да 17 лютага 1944 г. пад самім горадам было 400 казакаў і ў лагеры каля вёскі Лясная 775 чалавек, якія ўваходзілі ў склад І Казацкага зводнага палка імя генерала Краснова пад камандаваннем старшыны У. А. Лабасевіча[1]. Спецыяльна для казакаў у Наваградку выдавалася газета «Казак», што выпускалася выдавецтвам штаба аб'яднаных казацкіх войскаў. Для эвакуіраваных з вызваленых Чырвонай Арміяй тэрыторый у Баранавічах выдавалася газета «Новый путь».

Рускія вайсковыя фарміраванні актыўна дзейнічалі і ў зоне тылу групы армій «Цэнтр». У сакавіку 1942 г. у пасёлку Асінторф у раёне Оршы была створана Руская нацыянальная народная армія, якая ў жніўні 1942 г. налічвала 1500 чалавек.

У другой палове 1943 г. на тэрыторыі Беларусі, якая ўваходзіла ў склад тылавых раёнаў, пачалі з'яўляцца бежанцы з рэгіёнаў Расіі. Адначасова павялічылася колькасць вайсковых фарміраванняў Рускай нацыянальнай народнай арміі (РННА), Рускай вызваленчай арміі (РВА), брыгады Камінскага і інш. Найбольшая канцэнтрацыя расійскіх калабарацыйных аб'яднанняў адзначалася ў Барысаве і Бабруйску[2]. У апошнім выдаваліся газеты «Боец РОА» (1943) і «На страже Родины» (1943–1944). У Лепелі на працягу 1942–1944 гг. выходзіла газета «Голос народа», якая з'яўлялася органам Нацыянал-сацыялістычнай працоўнай партыі Расіі і Лепельскага акруговага самакіравання.

Акупацыйная прэса агітавала насельніцтва ўступаць у шэрагі такіх вайсковых частак. Так, бабруйская газета «Новый путь» 26 мая 1943 г. пісала: «Усё новыя і новыя людзі – сяляне, рабочыя і былыя ваеннаслужачыя чырвонай арміі, вызначыўшы сваё месца і ўсвядоміўшы свой абавязак, паднімаюцца на барацьбу з бальшавізмам. Шэрагі Рускай вызваленчай арміі растуць з кожным днём. Штодня

[1] ДАБрВ. – Ф. 708. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 3.

[2] Мігунова, А. Прапагандысцкія аспекты маладзёжнай палітыкі і школьнай справы нямецкай акупацыйнай улады... – С. 178.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на імя камандзіра Усходняга Запаснога Палка паступаюць заявы ад грамадзян горада і раёнаў з просьбай залічыць іх на ваенную службу. Нядаўна ў полк прыбыла новая партыя добраахвотнікаў з Оршы, Віцебскай і Смаленскай абласцей»[1]. 1 чэрвеня 1943 г. у Бабруйску з вялікімі ўрачыстасцямі прайшлі «святкаванні першай гадавіны стварэння рускіх ударных батальёнаў і Усходняга Запаснога Палка»[2].

У справе агітацыі ўсё насельніцтва разглядалася як рускае. У артыкуле магілёўскай рускамоўнай газеты «Новый путь» у ліпені 1943 г. вядзецца гаворка аб «рускім народзе», які два гады «ў цесным супрацоўніцтве з германскай арміяй вядзе жорсткую барацьбу за вызваленне сваёй радзімы». Пры гэтым канстатуецца, што «тысячы сумленных рускіх людзей сталі пад сцягі Вызваленчай Арміі». Аўтар распавядае аб тым, што «дзеці рускіх працоўных навучаюцца ў школах, якія нармальна працуюць ужо амаль два гады». Галоўны прапагандысцкі пасыл артыкула заключаецца ў наступных словах: «Рускі народ цяпер, як ніколі, стаў разумець, што яго ўдзел у барацьбе і аб'яднанні ўсіх сіл нацыі супраць агульнага ворага – гэта адзінае вырашэнне пытання аб будучым сваёй шматпакутнай радзімы Расіі»[3].

Аб тым, што дзеля вырашэння больш важных пытанняў акупанты імкнуліся ўсё насельніцтва разглядаць як адзіны «рускі народ», сведчаць і іншыя газетныя паведамленні. У Бабруйскім рускім (заўважце, менавіта рускім) тэатры неаднаразова праходзілі народныя сходы, на якіх адбывалася агітацыя насельніцтва за ўступленне ў шэрагі рускіх вайсковых фарміраванняў. Паведамляючы пра адзін з іх, мясцовая газета пісала: «У тэатры, як і на ўсіх папярэдніх народных сходах, мнагалюдна. За сталом прэзідыума – члены Абласнога камітэта па арганізацыі добраахвотных частак. На павестцы дня чарговага народнага схода адно пытанне: «За што змагаецца Руская Народная армія»[4]. У маі 1943 г.

[1] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 26 мая. – С. 4.
[2] Тамсама. – 3 июня. – С. 3.
[3] Новый путь (Могилев). – 1943. – 5 июля. – С. 3.
[4] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 10 марта. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на падобным сходзе быў зроблены даклад «Што такое Радзіма і навошта яе неабходна абараняць». З ім выступіў «афіцэр Рускай вызваленчай арміі»[1].

Аб актывізацыі дзейнасці акупантаў па стварэнні рускіх добраахвотных частак вясною 1943 г. сведчаць газетныя паведамленні: «На днях у пасёлку Кіраве адбыўся першы народны сход жыхароў раёна. З Бабруйска ў Кіраў прыехалі прадстаўнікі Камітэта па арганізацыі рускіх добраахвотных частак»[2].

У агітацыйных мэтах па дадзенай тэрыторыі гастралявалі самадзейныя ансамблі злучэнняў войскаў Рускай народнай арміі. Захаваліся паведамленні аб выступленнях на сцэне Беларускага народнага дома ў Віцебску «тэатральнай трупы Роты прапаганды Расейскай вызваленчай арміі і Полацкай Рускай Драмы»[3].

Перамогі Чырвонай арміі летам 1943 г. прымусілі акупантаў значна больш увагі звяртаць на прапаганду і агітацыю мясцовага насельніцтва. Напрыклад, на народным сходзе, які адбыўся ў пачатку верасня 1943 г. у Жлобіне ў памяшканні гарадскога тэатра, «прадстаўнік ад германскіх ваенных устаноў» вёў гаворку аб тым, што «немцы з'яўляюцца сябрамі рускага народа. [...] Доўг і абавязак кожнага рускага патрыёта, які жадае больш хуткага заканчэння вайны, укласці сваю долю ў справу барацьбы з іуда-бальшавізмам». А мясцовы камендант горада «звярнуў увагу прысутных на захаванне парадку і спакою ў горадзе. Рускі народ павінен ісці рука аб руку, плячом да пляча з нямецкім народам на барацьбу са сталінскім дэспатызмам». З мэтай захавання спакою прадстаўнік Рускай вызваленчай арміі, які «толькі некалькі дзён назад прыехаў з Бранску», распавёў аб становішчы на фронце: «Германскія войскі цвёрда стаяць на ўсім працяжэнні фронту. Лінія фронту цвёрдая і непарушная. Германскія войскі аказваюць упартае і бяз-

[1] Новый путь (Бабруйск). – 1943. – 10 июня. – С. 3.
[2] Тамсама. – 27 марта. – С. 4.
[3] Беларускае слова (Віцебск). – 1943. – 15 лют. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаснае супраціўленне Саветам. [...] Планамернае пакіданне горада Арла зусім не з'яўляецца нечаканасцю для германскіх войскаў»[1]. Адначасова ў маі 1944 г. Барысаўскі тэатр рускай драмы пачаў падрыхтоўку «першага антыбальшавіцкага спектаклю» – «Блакітнае неба» паводле п'есы Віталя Шамрова, якая была набыта тэатрам непасрэдна ў аўтара[2].

На тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася пад кантролем ваеннага камандавання, не толькі выдаваліся газеты на рускай мове, але і дзейнічалі ў большасці сваёй рускія тэатры, рускія школы, праходзілі гастролі ансамбляў рускай песні і танца, а ў кінатэатрах ішлі нямецкія фільмы з субцітрамі на рускай мове. Віцебская газета «Новый путь» 20 сакавіка 1942 г. паведамляла сваім чытачам аб тым, што «с сегодняшнего номера 20-го наша газета выходит только на русском языке. Для наших белорусских читателей мы будем издавать каждую неделю **особый листок на белорусском языке**, который будет наибольшее внимание уделять вопросам национальной белорусской культуры. Для наших деревенских читателей, крестьян и крестьянок, мы начинаем издавать один раз в неделю «**Листок сельского хозяина»**. В этом листке будут печататься статьи, которые будут помогать всем сельским хозяевам осуществлять новый русский земельный порядок, установленный теперь Германским Правительством»[3].

Акупацыйныя ўлады разумелі, што на канкрэтнай тэрыторыі пражывае менавіта беларускі народ, аднак у цэлым разглядалі дадзеную тэрыторыю як рускую. Аб тым, што ўлады арыентаваліся ў этнічнай сітуацыі, сведчаць апублікаваныя ў прэсе лічбы аб колькасці насельніцтва г. Віцебска ў 1942 г.: «Адпаведна статыстычным звесткам, на 1-га мая г. г. у горадзе пражывае: усяго насельніцтва – 40.788 ч. […]. Па нацыянальным складзе насельніцтва горада размяркоўваецца наступным чынам: беларусаў – 33.978; рускіх –

[1] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 11 сент. – С. 4.
[2] Тамсама. – 1944. – 20 мая. – С. 2.
[3] Новый путь (Витебск). – 1942. – 20 марта. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3.368; палякаў – 1.059; украінцаў – 446; немцаў – 196; інш. – 741»[1]. Як бачым, рускія складалі толькі 9,9% насельніцтва горада. Пры гэтым уся прапагандысцкая кампанія вялася на рускай мове. Руская мова вывучалася ў школах. У Беларускім народным доме, які быў адкрыты ў Віцебску 1 кастрычніка 1941 г., у праграме побач з беларускай музыкай (харавыя, сольныя і танцавальныя выступленні) пастаянна гучалі канцэрты з твораў Моцарта, Глінкі, Чайкоўскага[2]. Гарадская бібліятэка ў Бабруйску, якая была адкрыта распараджэннем Палявой камендатуры і Аддзела прапаганды 14 красавіка 1943 г., насіла імя рускага паэта А. С. Пушкіна[3].

Падобная карціна назіралася і ў іншых гарадах. Напрыклад, у рэпертуары Магілёўскага драматычнага тэатра, які са жніўня 1943 г. стаў называцца Рускім драматычным тэатрам, увогуле не было месца для пастановак п’ес беларускіх аўтараў, а ішлі спектаклі паводле твораў рускіх драматургаў А. Астроўскага («Беспасажніца», «Навальніца»), А. Сухаво-Кабыліна («Вяселле Крэчынскага»), Нявежына («Другая маладосць»). Жлобінскі гарадскі тэатр за год (май 1942 – красавік 1943) паставіў дзесяць праграм паводле твораў рускіх (А. Чэхаў, Л. Талстой, Казакоў, Крамской, Чарданцаў, Дронін) і замежных аўтараў. Сярод пастановак не было ніводнай беларускай п’есы[4].

У Лепелі з 1 кастрычніка 1941 г. працаваў драматычны тэатр. У яго рэпертуары былі «найлепшыя творы рускіх і замежных класікаў» – «Майская ноч» паводле аднайменнай аповесці Гогаля і «Гавань бураў» – Бальзака[5].

З 1942 г. працаваў гарадскі тэатр у Жлобіне. За год ён падрыхтаваў шэраг пастановак паводле п’ес А. Чэхава («Мядзведзь», «Зламыснік», «Прапанова»), Л. Талстога

---

[1] Новый путь (Витебск). – 1942. – 21 июля. – С. 4.

[2] Тамсама.

[3] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 10 апр. – С. 4.

[4] Тамсама. – 1 мая. – С. 4.

[5] Новый путь (Бобруйск). – 1942. – 21 нояб. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(«Франсуаза»), Крамскога («Мімавольны двухжонец»), Droніна («Цыклоп») і інш.[1]

Гарадскія тэатры ў Смаленску, Магілёве і Гомелі сумесна з тэатральным выдавецтвам «Новое Творчество» вясной 1943 г. арганізавалі літаратурна-драматычны конкурс. Запрашаліся «ўсе, хто адчувае сябе здольным прыняць удзел у гэтым конкурсе, у асаблівасці гэта адносіцца да рускіх пісьменнікаў». Прапаноўвалася напісаць п'есу, у якой бы «маляваўся лёс рускага народа пад уладай бальшавізму». У конкурсе маглі ўдзельнічаць «усе рускія. Яўрэі выключаюцца»[2]. Апошняе дае падставы лічыць, што тэрмін «рускія» выкарыстоўваўся як зборная назва для ўсходнеславянскага насельніцтва дадзеных тэрыторый у супрацьвагу яўрэям. Для параўнання скажам, што на тэрыторыі акругі Беласток (правінцыя Усходняя Прусія) беларускае аб'яднанне ў сакавіку 1944 г. абвясціла «конкурс на найлепшае беларускае апавяданьне, аповесьць і раман. У кожным творы павінна быць апрацована тэма з беларускага вызвольна-нацыянальнага руху»[3]. Удзельнічаць у конкурсе маглі «ўсе беларускія пісьменьнікі».

З паведамленняў акупацыйных газет вядома, што ў першай палове 1943 г. у Бабруйску выступалі ансамблі песні і танцаў з Клінцоў, Смаленска, Оршы і Гомеля. Рэпертуары гомельскага і аршанскага ансамбляў былі вельмі падобныя – рускія, украінскія і цыганскія песні і танцы[4].

У пошуках падтрымкі сярод мясцовага насельніцтва ў крытычныя апошнія месяцы акупацыі ўвага была звернута на маладшае пакаленне прадстаўнікоў нятытульнага этнасу. 7 мая 1944 г. у Барысаве быў абвешчаны Саюз рускай моладзі, які «аб'ядноўваў моладзь рускай нацыянальнасці ў межах тэрыторыі групы армій «Цэнтр» і Генеральнай акругі Беларусь»[5]. Новая арганізацыя разглядалася

[1] Новый путь (Могилев). – 1943. – 5 июля. – С. 3.
[2] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 12 мая. – С. 4.
[3] Новая дарога (Беласток). – 1944. – 5 сак. – С. 6.
[4] Новый путь (Бобруйск). – 1943. – 13 марта. – С. 4; 20 марта. – С. 4; 5 мая. – С. 4.
[5] НАРБ. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 4. – Арк. 67.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як «супольнасць маладых рускіх, якія самавыхоўваюцца, і арганізацыя, у якую аб'ядноўваецца моладзь з мэтай барацьбы супраць бальшавізму». Гэтая «нацыянальна-руская маладзёжная арганізацыя ўпаўнаважана побач з бацькоўскім домам і школай выхоўваць моладзь»[1]. На думку акупантаў, «нацыянал-сацыялісцкая Германія дала магчымасць рускай моладзі аб'яднацца. Гэта зроблена для таго, каб рускую моладзь вызваліць ад усіх бальшавіцкіх уплываў і выхоўваць у нацыянальным і сацыялістычным духу. Нацыянальнае выхаванне ў цэнтр увагі ставіць любоў да радзімы і народа. Маладыя рускія будуць клапаціцца і вывучаць гісторыю, культуру, навуку, народныя традыцыі і звычаі Расіі»[2]. Сход з нагоды адкрыцця СРМ праходзіў у памяшканні Барысаўскага народнага дома[3]. На імя Саюза прыйшло прывітанне рускай моладзі, якая пражывала ў Сербіі. У ім выказвалася падтрымка ў барацьбе з іудабальшавізмам[4]. Асноўны ўплыў СРМ аказваў на моладзь, якая знаходзілася ў войску, у першую чаргу ў РВА. Аднак з-за хуткага набліжэння фронту актыўнай дзейнасці Саюз не паспеў разгарнуць.

Такім чынам, у час нямецкай акупацыі рускае насельніцтва на Беларусі не заставалася па-за ўвагай нямецкіх улад. З аднаго боку, назіраліся працэсы змагання з рускай інтэлігенцыяй як распаўсюджвальнікамі ўплываў бальшавіцкай Расіі, што прыводзіла да страты імі працы і знаходжання ў цяжкіх умовах выжывання. З другога боку, акупанты імкнуліся аказваць падтрымку рускім нацыяналістычным, белаэмігранцкім арганізацыям. Рускае насельніцтва вызначалася сваёй актыўнасцю. На працягу ўсяго перыяду акупацыі ў Брэсце дзейнічаў Рускі камітэт узаемадапамогі, у задачу якога ўваходзіла культурна-асветніцкая дзейнасць сярод рускага насельніцтва.

---

[1] НАРБ. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 4. – Арк. 67.
[2] Тамсама. – Арк. 67.
[3] Тамсама. – Спр. 39. – Арк. 59.
[4] Тамсама. – Арк. 8.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нацыянальна-культурная палітыка акупантаў на тэрыторыі Беларусі, якая кантралявалася ваенным камандаваннем і ўваходзіла ў склад тылавых раёнаў групы армій «Цэнтр», значна адрознівалася ад той, што праводзілася на тэрыторыях, якія знаходзіліся пад кантролем цывільнай адміністрацыі. У першую чаргу гэта заўважна ў адсутнасці мэтанакіраванай «нацыяналізацыі». Нямецкае камандаванне не імкнулася да развіцця нацыянальных супярэчнасцей. Тылавыя раёны разглядаліся ў якасці мясцовасцей, дзе адбывалася разгортванне сіл рускіх калабарацыйных вайсковых фарміраванняў. Таму асновай прапагандысцкай апрацоўкі насельніцтва з'яўляўся ўздым рускага духу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# *Глава 7*

## ПАЛІТЫКА ГЕНАЦЫДУ ЯЎРЭЙСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

Упершыню тэрмін «генацыд» ужыў Рафаэль Лемкін у 1943 г. Ён разумеў пад ім «дзеянні заваёўнікаў, якія знішчаюць народы і этнічныя групы». Р. Лемкін даў падрабязнае тлумачэнне гэтага тэрміна: «Генацыд ажыццяўляецца ў форме адначасовай агрэсіі супраць розных бакоў нацыянальнага жыцця заваяванага народа: знішчаюцца інстытуты яго самакіравання, яму навязваецца нямецкая ўлада, рэгіён яго пражывання засяляецца немцамі, знішчаецца інтэлігенцыя, якая з'яўляецца яго духоўным ядром […] знішчаюцца культурныя ўстановы ці забараняецца іх дзейнасць. Навязваецца прафесійная адукацыя замест агульнай, гуманітарнай, і тым самым прадухіляецца ўсялякае развіццё думкі. У сферы эканомікі ўласнасць перадаецца ў рукі немцаў […] У біялагічнай сферы праводзіцца накіраваная палітыка змяншэння колькасці мясцовага насельніцтва, якая спалучана з заахвочваннем немцаў, якія жывуць на заваяваных тэрыторыях, да дзетанараджэння. У сферы фізічнага выжывання праводзіцца палітыка «голых порцый», г. зн. абмежавання ежы для «нянемцаў», шляхам чаго здзяйсняюцца фізічныя забойствы, у асноўным яўрэяў, палякаў, славакаў і рускіх. У рэлігійнай сферы праводзіцца пастаяннае ўмяшальніцтва ў справы царквы, якая шмат у якіх краінах з'яўляецца духоўным і маральным лідэрам нацыі. У сферы маралі ажыццяўляецца палітыка распаўсюджання парнаграфічных кніг і фільмаў, заахвочванне п'янства з мэтай стварэння атмасферы ўзаконенай амаральнасці»[1].

[1] Катастрофа европейского еврейства. – Тель-Авив: Джоинт, 1995. – Ч. 1–2. – С. 14–15.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ноч з 9 на 10 лістапада 1938 г. шмат у якіх месцах Германіі быў праведзены масавы пагром – «Крыштальная ноч». На ўсёй тэрыторыі Рэйха былі разбураны і падпалены сінагогі і яўрэйскія ўстановы, яўрэяў збівалі і арыштоўвалі. Частка схопленых была адпраўлена ў канцэнтрацыйныя лагеры, колькасць забітых склала 91 чалавек.

12 лістапада 1938 г. адбылася нарада ў Міністэрстве авіяцыі, якое ўзначальваў Герынг. Яна стала адной з цэнтральных падзей у гісторыі антыяўрэйскай палітыкі Трэцяга рэйха. На ёй былі выказаны, а затым надрукаваны ў газетах пагражальныя выпады на адрас яўрэяў.

30 студзеня 1939 г. у час выступлення ў Рэйхстагу Гітлер гаварыў: «Калі яўрэйскаму міжнароднаму капіталу – у Еўропе і па-за яе межамі – удасца яшчэ раз прывесці народы да вайны, вынікам яе з'явіцца не бальшавізацыя свету, а з ёю і перамога яўрэйства, а знішчэнне яўрэйскай расы ў Еўропе»[1].

Неўзабаве настаў момант рашучых дзеянняў – 1 верасня 1939 г. распачалася Другая сусветная вайна.

Практычнае ажыццяўленне палітыкі генацыду ў дачыненні да яўрэйскага насельніцтва было ўскладзена на асобыя часткі СД, створаныя ў 1938 г., – айнзацгрупы (Einsatzgruppen), ці «аператыўныя групы, атрады, фарміраванні». Спачатку айнзацгруп налічвалася пяць, пазней – шэсць. Да канца 1939 г. іх падзялілі на 15 айнзацкаманд (Einsatzkommando), кожная з якіх налічвала 100–150 чалавек. Да іх была падключана асобая зондэркаманда (Sonderkommando). Пасля ўварвання ў СССР чатыры аператыўныя фарміраванні – A, B, C, D – былі замацаваны за рознымі групамі армій, у аператыўным тыле якіх дзейнічалі. На тэрыторыі Беларусі і на маскоўскім напрамку дзейнічала аператыўная група В пад камандаваннем начальніка крымінальнай паліцыі А. Небе. 13 сакавіка 1941 г. Гімлеру (рэйхсфюрэру СС) былі дадзены асобыя паўнамоцтвы на акупіраваных савецкіх

[1] Катастрофа в документах. – Иерусалим, 1978. – С. 110.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэрыторыях і яго часткі не падпарадкоўваліся армейскаму камандаванню.

У верасні 1941 г. быў выдадзены афіцыйны загад з гэтай нагоды:

«24 верасня 1941 года

Змест: барацьба з варожымі элементамі

Выяўленне і барацьба з варожымі элементамі (камуністы, яўрэі і інш.), якія не з'яўляюцца складовай часткай сіл, што супрацьстаяць вермахту, з'яўляецца абавязкам зондэркаманд паліцыі і СД, якія прымаюць усе неабходныя меры і нясуць адказнасць за іх выкананне. Забараняюцца самастойныя дзеянні асоб, якія належаць да складу арміі і ўдзел салдат у яўрэйскіх пагромах, якія здзяйсняюцца ўкраінскім насельніцтвам, роўна як назіранне і здыманне на плёнку зондэркаманд у момант іх дзеянняў.

Аб гэтай забароне неабходна абвясціць усе часткі. Нясуць адказнасць за выкананне гэтай забароны асобы, якія адказныя за дысцыпліну ўсіх чыноў арміі. У выпадку парушэння неабходна праверыць, ці парушыла адпаведная асоба свой абавязак, і строга яе пакараць.

Фон Рундштэт»[1].

6 чэрвеня 1941 г. быў выдадзены «Указ аб камісарах». У яго чацвёртым пункце айнзацгрупам і айнзацкамандам паліцыі бяспекі і СД асобна прадпісвалася забіваць яўрэяў, якія былі звязаны з партыйнымі і дзяржаўнымі структурамі[2].

З пачаткам акупацыі на тэрыторыі Беларусі былі створаны новыя органы ўлады – мясцовыя і палявыя камендатуры. У іх асноўныя задачы ўваходзіла «ізаляцыя яўрэяў». Ужо першыя распараджэнні вярхоўнага камандуючага войскаў тылу групы армій «Цэнтр» прадпісвалі ўсеагульную рэгістрацыю яўрэяў, абавязковае выкарыстанне на адзенні жоўтай шасціканцовай зоркі; забаранялі яўрэям вітаць немцаў; уводзілі стварэнне гетаў, на чале якіх павінны былі стаяць «юдэнраты» (яўрэйскія саветы), абавязковую рэгіс-

---

[1] Катастрофа в документах. – С. 310.

[2] Тамсама. – С. 301.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

трацыю яўрэйскай маёмасці і прымусовую яе здачу і г. д. Яўрэям забаранялася выязджаць з мясцовасці ці мяняць месца жыхарства без дазволу гебіткамісара ці штадскамісара, карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, аўтамабілямі, месцамі і ўстановамі адпачынку, наведваць любога тыпу школы, валодаць аўтамабілямі і радыёпрыёмнікамі, праводзіць кашэрны забой жывёлы[1].

Разледзім гэты працэс больш падрабязна.

21 жніўня 1941 г. у Мінску камандуючы тылам групы армій «Цэнтр» генерал Макс фон Шэнкендорф выдаў адміністрацыйна-гаспадарчае распараджэнне № 5, дзевяты пункт якога забараняў яўрэям пакідаць раён свайго жыхарства. Выключэнне складалі яўрэі, якія мелі пісьмовы дазвол ад мясцовай камендатуры. У тым жа пункце яўрэям забараняўся гандаль з мясцовым арыйскім насельніцтвам. Забарона гэтая не датычыла тых яўрэяў, якія працавалі па дазволе нямецкіх устаноў сумесна з камерцыйнымі і прамысловымі прадпрыемствамі[2].

У канцы ліпеня – пачатку жніўня 1941 г. у Беларусі з'явіліся гета. Яны былі створаны ў дастаткова буйных населеных пунктах, райцэнтрах і гарадах. У іх былі сагнаны сотні тысяч яўрэяў – як жыхароў Беларусі, так і Германіі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Аўстрыі, Францыі, Галандыі, Венгрыі і інш. Тэрыторыя гета звычайна абносілася калючым дротам, ахоўвалася войскамі; самавольны выхад па-за межы гета пагражаў смерцю. Зняволеныя павінны былі насіць на вопратцы апазнавальныя знакі. Маркіроўцы падлягалі таксама яўрэйскія дамы, фасады якіх абазначаліся шасціканцовымі зоркамі, надпісам «Jude» ці вялікімі жоўтымі таблічкамі[3].

---

[1] Из директивы Г. Лозе, рейхскомиссара Остланда от 13 августа 1941 г. // Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг.: сб. материалов и документов. – Минск: Изд. Я. Б. Дремач; Изд. Э. С. Гальперин, 1995. – С. 53–55.

[2] НАРБ. – Ф. 412. – Воп. 1. – Спр. 19. – Арк. 120.

[3] Розенблат, Е. Холокост на Полесье. 1941–1944 годы / Е. Розенблат // Загароддзе-3: матэрыялы навук.-краязн. канф. «Палессе ў XX стагоддзі», Беласток, 1–4 чэрв. 2000 г.; уклад. і агул. рэд. Ф. Д. Клімчука, А. Энгелькінг, В. А. Лабачэўскай. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – С. 195.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Колькасць гета вызначаецца даследчыкамі па-рознаму. Э. Іофе піша аб тым, што на тэрыторыі 153 населеных пунктаў Беларусі размяшчалася 163 гета[1]. У Мінскім гета было 100 тыс. чалавек, у двух брэсцкіх – 34, у двух гродзенскіх – 25, у Слонімскім – каля 30, у двух навагрудскіх – звыш 24, у двух бабруйскіх – 20, у Віцебскім – каля 20, у Ваўкавыскім – больш за 10 тыс.[2]

Як ужо ўпаміналася, на чале гета стаялі юдэнраты. Яны павінны былі рабіць поўны перапіс насельніцтва, неслі адказнасць за этапіраванне і далейшае размяшчэнне яўрэяў. Усе яўрэі павінны былі падпарадкоўвацца савету, на які ўскладалася задача выканання распараджэнняў немцаў. На тэрыторыі Заходняй Беларусі юдэнраты мелі разгалінаваную структуру, што дазваляла ажыццяўляць кантроль за ўсімі бакамі жыцця насельніцтва. Напрыклад, Пінскі юдэнрат меў дзесяць аддзелаў: працы, адміністрацыйна-гаспадарчы, фінансавы, юрыдычны, сацыяльнай апекі, статыстыкі і рэгістрацыі, аграгамічны, грамадзянскага стану, пахавальнае бюро, арбітражную камісію[3].

З 1 да 15 жніўня 1941 г. (тэрмін, устаноўлены новымі ўладамі) пінскі юдэнрат праводзіў рэгістрацыю насельніцтва. З 15 да 30 жніўня была праведзена рэгістрацыя арыйскага (неяўрэйскага) насельніцтва. Не падлягалі рэгістрацыі дзеці да 16 гадоў. Дадзеныя аб іх упісваліся ў дакументы бацькоў. У выніку рэгістрацыі ўлады здолелі не толькі аказаць дысцыплінарнае ўздзеянне на насельніцтва, але і атрымаць звесткі аб працоўным і прафесійным патэнцыяле яўрэяў.

У верасні 1941 г. у Пінску яўрэям сталі выдаваць асобыя пасведчанні са спецыяльным чырвоным штампам на вокладцы «Jude».

Да снежня 1941 г. на тэрыторыі Генеральнай акругі Валынь-Падолія Рэйхскамісарыята «Украіна» рэгістрацыя

---

[1] Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси. – С. 116.
[2] Тамсама. – С. 118.
[3] Розенблат, Е. Холокост на Полесье. 1941–1944 годы. – С. 194.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яўрэйскага насельніцтва была скончана. Пры гэтым вызначэнне нацыянальнасці вялося паводле этнічнай прыкметы, а не паводле веравызнання[1].

Толькі ў Слоніме і акрузе, па звестках саміх немцаў, на пачатку вайны было 25 тыс. яўрэяў (16 тыс. у самім горадзе). На стварэнне гета было недастаткова магчымасцей, бо, як адзначаў гебітскамісар Эрэн, «не хапала ні калючага дроту, ні аховы». У яго справаздачы падрабязна апісваецца ўвесь працэс паступовага знішчэння яўрэяў. Спачатку былі праведзены канфіскацыі яўрэйскай маёмасці, якая была перададзена ў нямецкія ўстановы, як у дадзенай акрузе, так «была аказана дапамога і іншым акругам». Прадметы, не прыдатныя для нямецкай арміі, аддалі для продажу мясцовым жыхарам. Германскія ўлады правялі ўлік яўрэяў паводле ўзросту і прафесіі. Былі адабраны ўсе рамеснікі і кваліфікаваныя рабочыя, якім выдалі спецыяльнае пасведчанне і размясцілі па кватэрах. 13 лістапада 1941 г. у горадзе была праведзена акцыя, якая «вызваліла… ад лішніх ратоў». У Слоніме засталося 7 тыс. яўрэяў, якія былі далучаны да працы. У сувязі з тым, што «вермахт не падрыхтаваны да правядзення акцый на тэрыторыі раёна», Эрэн абяцаў сканцэнтраваць усіх яўрэяў акругі ў двух ці трох райцэнтрах. Пры гэтым яны павінны былі знаходзіцца толькі ў рабочых калонах. Гебітскамісар такім чынам спадзяваўся «да канца вынішчыць забаронены гандаль і дапамогу яўрэяў партызанам». Акрамя гэтага, ён выказваў наступныя спадзяванні: «У маіх рамесных вучылішчах я прымушу яўрэйскіх спецыялістаў навучаць свайму майстэрству кемлівых вучняў, каб затым можна было ў гэтых прафесіях абысціся без яўрэяў і ліквідаваць апошніх»[2].

[1] Розенблат, Е. С. Политика оккупационных властей по созданию органов еврейского самоуправления и регистрации населения на территории Западной Беларуси (1941–1942 гг.) / Е. С. Розенблат // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёна Беларусі: матэрыялы міжнар. канф., Брэст, 23–24 крас. 1998 г.: у 2 ч. – Брэст: Выд-ва С. Лаўрова, 1998. – Ч. II. – С. 206.

[2] Из отчета гебитскомисара Эррена об уничтожении евреев Слонима // Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг. – С. 87.



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Паводле дадзеных галоўнага аддзела III-эканомікі, у Генеральнай акрузе Беларусь на 31 снежня 1941 г. налічвалася прыкладна 29 600 працаздольных яўрэяў. 28 кастрычніка 1941 г. камісар Мінска Янецке выдаў распараджэнне аб іх працавыкарыстанні. Згодна з дакументам, адказнасць за гэта нёс юдэнрат. Ён атрымліваў звесткі аб запатрабаванай колькасці работнікаў ад біржаў працы. На тэрмін працы на прадпрыемстве яўрэям-спецыялістам выдавалася спецыяльнае пасведчанне. Адначасова яно служыла пропускам, па якім яўрэй мог пакінуць гета. Пасля заканчэння тэрміну дзеяння пасведчання яго трэба было вярнуць на біржу працы. Простарабочыя маглі пакідаць тэрыторыю гета толькі ў складзе калоны такіх жа рабочых. Калону фарміраваў юдэнрат. Начальнік калоны па пісьмовай заяўцы ад біржы працы дастаўляў калону на прадпрыемства. Кіраўнік прадпрыемства павінен быў адзначыць прыбыццё і колькасць рабочых. Затым заяўка вярталася на біржу працы.

Гэтае ж распараджэнне акрэсліла пытанні аплаты працы яўрэяў. Праца рамеснікаў і спецыялістаў аплачвалася таксама, як і праца беларусаў за вылікам 20% ад агульнай тарыфнай стаўкі на асобы рахунак. Сам яўрэйскі спецыяліст мог атрымаць наяўнымі толькі 30% валавога заробку. Астатнія 50% паступалі ў гарадскую казну, якая на гэтыя грошы забяспечвала харчаваннем гета. Лішкі сумы залічваліся на асобы «аднаўленчы рахунак».

Некваліфікаваныя рабочыя ўвогуле не атрымлівалі наяўных грошай. Ад кожнага з працуючых яўрэяў штодзённа адлічвалася на карысць горада 1,60 нямецкіх марак, якія ішлі на забеспячэнне, а лішак – у фонд «аднаўлення»[1].

Як жа адбывалася забеспячэнне яўрэйскага насельніцтва харчаваннем? Вядомы стан гэтай справы ў Пінску. Увосень 1941 г. яўрэйскае насельніцтва атрымлівала тут палову нормы неяўрэйскага насельніцтва на крупы і хлеб, зусім не атрымлівала мясных картак, картак на малако

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 665. – Арк. 5.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для дзяцей ва ўзросце ад 1 да 3 гадоў, кормячых маці і хворых, а таксама было пазбаўлена аднаразовых выдач цукру, мукі, тварагу, гародніны. У далейшым, на працягу 1941–1942 гг., назіралася тэндэнцыя да скарачэння забеспячэння прадуктамі харчавання ўсяго насельніцтва. Са студзеня 1942 г. хлебныя нормы для яўрэйскага насельніцтва Пінска знізілі да 100 г у дзень для дзяцей да 14 гадоў і 150 г для дарослых[1].

Зразумела, гэта ўплывала на ўзровень смяротнасці сярод дадзенай групы насельніцтва. Вялікая натуральная гібель яўрэяў была абумоўлена таксама напружанай працай, перанаселенасцю гета, недахопам якаснай пітной вады, холадам, нездавальняючымі асенізацыйнымі ўмовамі[2].

У далейшым нацысты распрацавалі спецыяльную праграму па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў з мясцовага насельніцтва для патрэб прамысловасці і рамеснай вытворчасці. Для гэтай мэты ствараліся рамесныя школы і вучылішчы. Напрыклад, па дадзеных на верасень 1942 г., у Пінску было адчынена 8 рамесных школ: па падрыхтоўцы шаўцоў, нарыхтоўшчыкаў, краўцоў, швачак, закройшчыкаў, слесараў, токараў, кавалёў, сталяроў і іншых спецыялістаў[3].

У літаратуры па генацыдзе на тэрыторыі СССР прынята вызначаць тры перыяды правядзення акцый знішчэння яўрэяў. Без якіх-небудзь выключэнняў яны поўнасцю характэрны і для Беларусі.

1. З 22 чэрвеня 1941 г. да пачатку зімы 1941–1942 г., калі большасць яўрэяў Беларусі ў яе межах да 17 верасня 1939 г. былі знішчаны. З наступленнем маразоў акцыі па ліквідацыі яўрэяў спыніліся, бо было праблематычна праводзіць захаванне астанкаў расстраляных людзей.

2. З вясны 1942 да канца 1942 г. У гэты час была знішчана большасць яўрэяў у заходніх раёнах Беларусі.

---

[1] Розенблат, Е. С. Нацистская политика геноцида... – С. 68–80.

[2] Розенблат, Е. Холокост на Полесье. 1941–1944 годы. – С. 203.

[3] Розенблат, Е. Пинские евреи. 1939–1944 / Е. Розенблат, И. Еленская. – Брест, 1997. – С. 128–130.



РЕПОЗИТОРИЙ БРГУ ИМ. А.С. ПУШКИНА

3. З пачатку 1943 г. да адступлення немцаў у чэрвені–ліпені 1944 г. знішчаны ўсе яўрэі, якія заставаліся ў жывых[1].

Акрамя айнзацгруп, частак вермахта да знішчэння яўрэяў прыцягваліся войскі СС, паліцэйскія фарміраванні, падраздзяленні паліцыі парадку.

У Беларусі немцы імкнуліся не далучаць да масавых акцый паліцыю з мясцовых жыхароў. Таму акцыі праводзіліся сіламі прывезеных сюды ўкраінскіх і літоўскіх паліцэйскіх батальёнаў[2].

Неабходна вызначыць агульнае і адметнае ў розных зонах акупацыі Беларусі (Рэйхскамісарыят «Остланд», Рэйхскамісарыят «Украіна», акруга Беласток і зона тылу групы армій «Цэнтр»).

Тэрыторыя заходнебеларускага Палесся ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі ўваходзіла ў склад Генеральнай акругі Валынь-Падолія (Рэйхскамісарыят «Украіна»). З чэрвеня 1941 да студзеня 1942 г. на гэтай тэрыторыі, як і амаль паўсюль у Заходняй Беларусі, да акцый ліквідацыі яўрэяў былі далучаны спецыяльныя аператыўныя атрады СД – айнзацгрупы, часткі вермахта, нямецкія паліцэйскія батальёны, а ў зоне палескіх балот і на тэрыторыі паўднёвай Беларусі – асобныя часткі «Вафен СС» (Waffen SS).

Існавалі адрозненні і ў адносінах нямецкіх улад да міграцыйных працэсаў яўрэяў. У Генеральнай акрузе Валынь-Падолія гэтыя адносіны былі дастаткова ліберальныя. Напрыклад, у Пінск перасяленцы працягвалі прыбываць да мая 1942 г. У акрузе Беласток акупацыйныя ўлады лічылі перамяшчэнне яўрэйскага насельніцтва немэтазгодным. Размяшчэнне яўрэяў кантралявала паліцыя. Толькі ў крайніх выпадках павятовыя ўлады па ўзгадненні з кіраўніцтвам Беластоцкай акругі маглі даць дазвол на перасяленне[3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] Арад, И. Катастрофа европейского еврейства в советской историографии / И. Арад // Холокост. Катастрофа европейского еврейства (1933–1945): Сб. ст. – Иерусалим, 1990. – С. 163.

[2] Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг.: Сб. материалов и документов. – Минск: Изд. Я. Б. Дремач; изд. Э. С. Гальперин, 1995. – С. 16.

[3] Розенблат, Е. С. Политика оккупационных властей по созданию органов еврейского самоуправления… – С. 204–211.

З канца чэрвеня да кастрычніка 1941 г. у Пінск прыбылі 776 яўрэяў. Палову з іх складалі бежанцы і рэпатрыянты з гарадоў розных акупацыйных зон. Пры гэтым ім забаранялася карыстацца чыгункай. Кожны з рэпатрыянтаў павінен быў мець спецыяльны праязны дакумент для перамяшчэння па акупіраваных тэрыторыях – пасведчанне юдэнрата горада, з якога накіроўваўся мігрант, і пасведчанне магістрата гэтага ж горада з адзнакай мясцовых нямецкіх улад. Перасяленне працягвалася да мая 1942 г., хаця рэгістрацыя асноўнай масы насельніцтва была праведзена да 30 верасня 1941 г. Рэгістрацыя з'явілася першым крокам да татальнага знішчэння яўрэяў[1].

На тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі існавалі «варыянты» правядзення акцый летам–восенню 1941 г. Вядомы даследчык праблем катастрофы яўрэйскага народа Яўген Разенблат вылучае наступныя.

1. Поўнае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва. Праводзілася ў месцах, дзе пражывала нязначная колькасць яўрэяў.

2. Знішчэнне значнай колькасці мужчынскага яўрэйскага насельніцтва. Праводзілася амаль ва ўсіх буйных абшчынах.

3. Знішчэнне часткі непрацаздольнага яўрэйскага насельніцтва. Праводзілася ў дастаткова буйных абшчынах.

4. Перасяленне яўрэяў з шэрага раёнаў у больш аддаленыя ад лясістых раёнаў гета.

5. Знішчэнне прадстаўнікоў яўрэйскай інтэлігенцыі[2].

Па меркаванні Я. Разенблата, страты яўрэйскага насельніцтва заходніх абласцей Беларусі ў першыя паўгода акупацыі склалі 90–100 тыс. чалавек, у сучасных межах заходніх абласцей ахвярамі сталі 50–60 тыс. яўрэяў[3].

---

[1] Розенблат, Е. С. Политика оккупационных властей по созданию органов еврейского самоуправления… – С. 204–211.

[2] Розенблат, Е. Холокост на Полесье. 1941 – 1944 годы. – С. 204–205.

[3] Розенблат, Е. «Окончательное решение еврейского вопроса» в западных областях Беларуси. 1941–1944 гг. / Е. Розенблат // Евреи Беларуси: История и культура: Сб. науч. тр. – Минск: Четыре четверти, 2000. – Вып. V. – С. 128.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З аператыўных зводак паліцыі бяспекі і СД па СССР вядома, што ўжо 5 ліпеня ў Гродне пачаліся яўрэйскія пагромы, 12 ліпеня ў заходняй частцы Мінска былі падпалены драўляныя дамы. Абвінавацілі ў гэтым яўрэяў. Частка з іх была ліквідавана. У створаным у горадзе лагеры для цывільных палонных была праведзена фільтрацыя. Спачатку расстралялі 1050 яўрэяў. У Гродне і Лідзе ў першыя дні вайны было забіта 96 яўрэяў. Са зводкі ад 1 жніўня вядома, што ў Стоўбцах ліквідавана 76 чалавек. У Вілейцы «не ўсё яўрэйскае мужчынскае насельніцтва ліквідавана праходзячымі вайсковымі часткамі. Праведзены вышук. Расстраляны толькі 5 чалавек». Да канца ліпеня ў Мінску былі «ліквідаваны ўсе слаі яўрэйскай інтэлігенцыі (настаўнікі, прафесары, адвакаты і іншыя, акрамя медработнікаў)»[1].

Назіраюцца асаблівасці ў тэмпах ліквідацыі яўрэйскага насельніцтва ва ўсходніх і заходніх абласцях Беларусі. Да канца 1941 г. яно амаль поўнасцю было ліквідавана на ўсходніх тэрыторыях: у Магілёве – 10 тыс., Віцебску і Бабруйску – па 20, Барысаве – 8, Полацку – 7 тыс.[2] У данясенні камандзіра 9-й роты 3-га паліцэйскага батальёна «Цэнтр» аб знішчэнні яўрэяў у г. Магілёве 3 кастрычніка 1941 г. чытаем: «Акцыя была праведзена ў нядаўна створаным Магілёўскім гета. У ходзе яе было арыштавана 2208 яўрэяў абодвух полаў. […] Акрамя 9-й роты ў акцыі ўдзельнічалі 23 афіцэры і салдаты ўкраінскай паліцыі, а таксама афіцэры і салдаты штаба Вышэйшага начальніка СС і паліцыі «Расія – Цэнтр». […] Экзекуцыя арыштаваных 2 кастрычніка 1941 г. была праведзена 3 кастрычніка ў першай палове дня. Усяго 9-й ротай было расстраляна 555 яўрэяў абодвух полаў»[3].

Дакумент звяртае ўвагу не толькі на масавасць забойстваў, але і на ўдзел у акцыі ўкраінскіх паліцэйскіх. Як ужо адзначалася, нямецкае камандаванне імкнулася не прыцяг-

[1] Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг. – С. 77–78.
[2] Тамсама. – С. 21.
[3] Тамсама. – С. 81.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваць да такіх аперацый беларусаў. Акрамя ўкраінцаў да гэтай справы мелі дачыненне і літоўцы. Сам спосаб правядзення акцый выклікаў жах і ў саміх немцаў. У рапарце ад 30 кастрычніка 1941 г. генеральнаму камісару Беларусі В. Кубэ гебітскамісар г. Слуцка Карль заўважаў: «Што датычыць самога спосабу правядзення акцыі, я павінен з глыбокім смуткам адзначыць, што ён межаваўся з садызмам. […] З неапісальнай жорсткасцю, як з боку нямецкіх паліцэйскіх, так і з боку літоўскіх, яўрэйскае насельніцтва, а таксама нямала беларусаў былі выведзены з дому і сагнаны ў адно месца. […] Мала таго, што з яўрэйскім насельніцтвам, у тым ліку і з рамеснікамі, абыходзіліся па-зверску прама на вачах у беларускага насельніцтва, але і само беларускае насельніцтва такім жа чынам падвяргалася біццю скуранымі дубінкамі і прыкладамі. […] Увогуле, уся карціна была больш чым жахлівая. […] Пры расстрэле, які адбыўся за горадам, я не прысутнічаў. […] Адзначу толькі, што на працягу доўгага часу пасля таго, як магілы былі засыпаны зямлёй, тыя, што засталіся ў жывых, спрабавалі з іх выбрацца»[1].

У тым жа дакуменце чытаем: «Адносна эканамічных страт заўважу, што мацней за ўсё пацярпела гарбарная фабрыка. Тут працавалі 26 спецыялістаў. 15 лепшых спецыялістаў з гэтай колькасці былі расстраляны, 4 іншыя саскочылі на хаду з машыны і зніклі, яшчэ 7 збеглі і не былі злоўлены. Прадпрыемства цяпер ледзь можа працягнуць працу. У майстэрні па вырабе драбінаў працавала 5 майстроў. З іх чацвёра расстраляны, і цяпер падтрымліваць вытворчасць павінен адзін чалавек. Не засталося таксама такіх рамеснікаў, як сталяры, кавалі і г. д.» У тым жа дакуменце адзначаецца: «Беларускае насельніцтва, чый поўны давер мы заваявалі, знаходзіцца ў разгубленасці. Хоць людзі напужаны і не адважваюцца адкрыта выказваць сваё меркаванне, ёсць падставы лічыць, што гэты дзень не забыты.

[1] Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг. – С. 83–84.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я лічу, што пройдзе яшчэ нямала часу, перад тым як мы вернем страчаны давер насельніцтва»[1].

Нягледзячы на вялікі імпэт з боку акупантаў, працэс ліквідацыі яўрэяў меў цяжкасці. Яны адзначаліся ў справаздачы аператыўнай групы 4 «А» паліцыі бяспекі і СД за перыяд з 16 кастрычніка 1941 г. да 31 студзеня 1942 г.: «Пытанне рашучай і поўнай ліквідацыі яўрэяў на тэрыторыі Беларусі пасля прыходу немцаў натыкаецца на вядомыя цяжкасці. Якраз тут яўрэі складаюць празмерна высокі працэнт спецыялістаў, якія ў гэтай галіне, у сувязі з адсутнасцю іншых рэзерваў, з'яўляюцца неабходнымі». Сярод іншых перашкод называюцца моцныя маразы, «якія вельмі перашкаджалі правядзенню масавых экзекуцый». Сваю ролю адыгрывала вялікая тэрытарыяльная раскіданасць яўрэяў, дрэнны стан дарог, недахоп аўтатранспарту, бензіну, недастатковасць сіл паліцыі бяспекі і СД. Аўтары справаздачы заўважаюць, што «камандзіру паліцыі па Беларусі, нягледзячы на цяжкае становішча, дадзены ўказанні – як мага хутчэй ліквідаваць яўрэйскае пытанне. Усё ж для гэтага спатрэбіцца каля двух месяцаў у залежнасці ад надвор'я»[2].

На заходніх тэрыторыях Беларусі працэс знішчэння быў больш працяглым. Яшчэ ў канцы 1942 г. тут пражывалі 30 тыс. яўрэяў[3].

Адным са складнікаў палітыкі генацыду было сістэматычнае рабаванне яўрэяў. Метады яго правядзення былі разнастайныя: кантрыбуцыі (прымусовыя грашовыя і натуральныя паборы), штрафы, сістэма падаткаабкладання, канфіскацыі. Камісар Мінскай акругі Кайзер 17 кастрычніка 1941 г. выдаў наступны загад:

«Яўрэйскія саветы павінны здаць наступны падатак:

1. Грошы дадзенай дзяржавы і замежных дзяржаў.

---

[1] Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг. – С. 83–84.

[2] Нюрнбергский процесс: сб. материалов. – М., 1954. – Т. 1. – С. 849.

[3] Рейн, Л. Отношение белорусского населения к евреям во время Катастрофы 1941–1944 гг. // Евреи Беларуси: История и культура: сб. науч. тр.; сост.-ред. И. Герасимова. – Минск: Четыре четверти, 2001. – Вып. VI. – С. 183.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Каштоўныя паперы, акцыі, абавязацельствы пазыкі і інш.

3. Каштоўныя рэчы і ўпрыгожанні.

4. Тэлефоны і радыёапараты.

5. Мэблю, вопратку, бялізну.

Пакідаецца:

а) Неабходная для жыцця частка хатніх рэчаў (неабходная мэбля, адзенне і адна змена бялізны).

б) Грошы ў звычайных памерах для падтрымкі жыцця. Яўрэі абавязаны паведамляць адпаведна прыкладаемай форме аб маёмасці коштам меней за 50 рэйхсмарак»[1].

Акупацыйныя ўлады ўжо з першых месяцаў вайны выкарыстоўвалі яўрэяў на прымусовых працах. У сярэдзіне ліпеня 1941 г. ваеннае ўпраўленне Палявой камендатуры Мінскага раёна разаслала наступнае ўказанне бургамістрам гарадоў свайго падпарадкавання:

«п. 21. Яўрэі ва ўросце ад 14 да 60 гадоў і жанчыны ва ўзросце ад 16 да 50 гадоў, якія пражываюць на занятай рускай тэрыторыі, падлягаюць залічэнню на прымусовыя працы […] Яўрэі для гэтай мэты пасля перапісу падзяляюцца на прымусовыя рабочыя аддзяленні […]

г) Усім працаздольным яўрэям строга забараняецца без пісьмовага дазволу палявой ці мясцовай камендатуры прадаваць, закладаць ці перадаваць іншай асобе рамесныя прылады, якія ім належаць.

д) Наяўную аплату яны не атрымліваюць, ім можна выдаваць харчаванне, калі яўрэй не зарабляе ў іншым месцы»[2].

Асобнай крыніцай даходу нацыстаў была маёмасць яўрэяў. З першых дзён вайны яе зборам займаліся зондэркаманды Альфрэда Розенберга, а таксама салдаты і афіцэры вермахта, паліцэйскія, служачыя розных ведамстваў, цывільная адміністрацыя. Улік і канфіскацыя рухомай яўрэйскай маёмасці ў асобных абласцях праводзіліся адпаведна «Папярэднім дырэктывам аб адносінах да яўрэяў у вобласці

[1] ДАМВ. – Ф. 623. – Воп. 2. – Спр. 1. – Арк. 155.

[2] Тамсама. – Арк. 183.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэйхскамісарыята «Остланд», выдадзеным Г. Лозэ 9 жніўня 1941 г. генеральным камісарам Эстоніі, Латвіі, Літвы і Беларусі з просьбаю пазбягаць іх апавяшчэння і даводзіць да ведама яўрэйскіх саветаў вусна[1]. 19 мая 1942 г. рэйхскамісар «Остланда» выдаў дырэктыву аб уліку і выкарыстанні рухомай маёмасці, канфіскаванай у яўрэяў. Дакумент ускладаў вырашэнне пытанняў па ўліку, кіраванні і выкарыстанні рухомай яўрэйскай маёмасці на абласных камісараў. Уся маёмасць павінна была папярэдне ацэньвацца і затым рэалізоўвацца шляхам продажу. Прыдатныя для абсталявання кватэр і ўстаноў рэчы прадаваліся ці здаваліся ў часовае карыстанне праз жыллёвае ўпраўленне[2].

Не можа не выклікаць абурэння цынізм распараджэння рэйхскамісара «Остланда» генеральным камісарам па пытанні выдачы часткі канфіскаванай маёмасці «для падтрымкі працаздольнасці яўрэяў» ад 25 верасня 1942 г. Пры гэтым звяртаецца ўвага на тое, «каб былі пакінуты для гэтай мэты і выдадзены яўрэям толькі малакаштоўныя рэчы і толькі ў такім памеры, які быў да канфіскацыі. Прадпрынятая мера павінна папярэдзіць зрыў працаздольнасці яўрэяў з-за недастатковага іх рэчавага забеспячэння»[3].

20 студзеня 1942 г. адбылася Ванзейская канферэнцыя, якая стала найважнейшай вяхой у гісторыі вынішчэння яўрэяў. Яе тэма: «Канчатковае рашэнне яўрэйскага пытання». На ёй было адзначана, што ў працэс канчатковага рашэння яўрэйскага пытання ў Еўропе ўключаюцца каля 11 млн яўрэяў. Сярод іх з Беларусі (з Беластоцкай акругай) было 446 484 чалавекі. Пры гэтым адзначалася, што ў лік яўрэяў уваходзяць толькі яўрэі па рэлігіі: яўрэі ж адпаведна расавым крытэрыям уключаны не поўнасцю[4]. На канферэнцыі былі разгледжаны пытанні практычнага ажыццяўлення «канчатковага рашэння» – ад стэрылізацыі да адпраўкі ў гета і фізічнага вынішчэння.

[1] НАРБ. – Ф. 378. – Воп. 1. – Спр. 698. – Арк. 7–11.
[2] Тамсама. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 468. – Арк. 18.
3 Тамсама. – Спр. 634. – Арк. 11.
[4] Катастрофа в документах. – С. 198–208.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля канферэнцыі дзеянні выканаўцаў сталі ўзгодненымі, атрымалі новы штуршок. 1942–1943 гг. былі кульмінацыйнымі ў працэсе вынішчэння. З канца студзеня 1942 і да восені 1943 г. працягваўся другі этап знішчэння яўрэйскага насельніцтва. 29 студзеня 1942 г. на нарадзе кіраўнікоў аддзелаў у Мінску было прынята рашэнне аб правядзенні новай хвалі акцый па ліквідацыі яўрэйскага насельніцтва ў Генеральнай акрузе Беларусь[1].

У пачатку сакавіка 1942 г. пачаліся першыя буйныя акцыі па знішчэнні яўрэяў. На працягу двух месяцаў іх загінула ад 2300 да 3400 чалавек у Баранавіцкім гета, 600 – у Івацэвічах, 860 – у Радашковічах, 2653 – у Докшыцах, 5670 – у Лідзе, ад 2500 да 3000 – у Іўі і г. д.[2]

Метады правядзення акцый па знішчэнні яўрэяў апісаны шмат у якіх дакументах. 1–3 сакавіка 1942 г. такая акцыя прайшла ў Мінску і Койданаве. Для захавання ў таямніцы сапраўдных намераў юдэнрату было паведамлена, што 5000 яўрэяў будуць «пераселены». Савет павінен быў адабраць неабходную колькасць людзей. З сабой кожнаму дазвалялася ўзяць не больш за 5 кг багажу. Неабходная колькасць была сабрана сілай, бо юдэнрат не прадставіў ніводнага чалавека. Людзей адправілі на станцыю Мінск-Таварны, дзе іх пагрузілі ў вагоны і адвезлі ў Койданава. Для акцыі паблізу Койданава былі падрыхтаваны траншэі. Спачатку яўрэяў выгрузілі з вагонаў, затым падзялілі на невялікія групы, і пад аховаю літоўцаў прывялі да траншэй. Людзям загадалі зняць паліто і верхняе адзенне, як цынічна заўважаюць аўтары дакумента, «для аблягчэння стральбы». Далейшае апісанне не можа не выклікаць жаху: «Затым яўрэям было загадана ісці ўздоўж траншэй, каля якіх стаялі стралкі, узброеныя пісталетамі. Каманда стралкоў налічвала 10–20 чалавек. Кожны стралок перыядычна выбіраў сабе ахвяру – пры гэтым ён загадваў чалавеку спыніцца ці

[1] Рус, Г. СД у Баранавічах (1941–1943) у кантэксце акупацыйнага рэжыму / Г. Рус // Беларус. гіст. агляд. – Чэрвень 1998. – Т. 5, сш. 1 (8). – С. 83.

[2] Тамсама. – С. 322; Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси. – С. 131.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спыняў яго рукой. Калі ахвяра знаходзілася ў зручнай пазіцыі, салдат страляў ёй у карак. Калі пасля выстралу чалавек не падаў у траншэю, яго піхалі ці ўкідвалі ў яе. Траншэі былі настолькі шырокія, доўгія і глыбокія, што маглі змясціць прынамсі шмат соцень трупаў». За адзін дзень нацысты не здолелі расстраляць усіх. Таму экзекуцыю працягнулі 3 сакавіка. Усяго былі забіты 3412 чалавек[1].

Для больш хуткага знішчэння яўрэяў увесну 1942 г. пачалі выкарыстоўвацца газавыя аўтамашыны – «душагубкі». Меркавалася, што людзі будуць у іх паміраць шляхам уздзеяння ўсыпляючых смяротных газаў. Аднак часта здаралася, што яны гінулі ў цяжкіх пакутах ад уздзеяння выхлапных газаў аўтамашыны[2].

Адпаведна справаздачы гаўляйтара В. Кубэ рэйхскамісару «Остланда» Г. Лозэ ў Генеральнай акрузе Беларусь з другой паловы мая да канца 1942 г. былі ліквідаваны каля 55 тыс. чалавек яўрэйскай нацыянальнасці. Начальнік паліцыі бяспекі і СД у Беларусі оберштурмфюрэр Штраўх у красавіку 1942 г. на адной з сакрэтных нарад заявіў, што на тэрыторыі генеральнай акругі па прыблізных падліках са 150 тыс. яўрэяў ліквідавана 130 тыс.[3]

У гэты ж перыяд прайшлі акцыі на беларускіх землях Генеральнай акругі Валынь-Падолія і акругі Беласток.

Адметным для гэтага перыяду з'яўляецца ліквідацыя малых гета і правядзенне знішчальных мерапрыемстваў у сельскай мясцовасці. Патрэба ў рабочай сіле для выканання ваенных заказаў вермахта не дазваляла праводзіць ліквідацыю вялікіх гета ў буйных гарадах.

Знішчэнне яўрэяў улетку 1942 г. набыло значна большыя памеры. У сваёй справаздачы рэйхскамісару «Остланда» Г. Лозэ ад 31 ліпеня 1942 г. генеральны камісар Беларусі В. Кубэ пісаў: «У Беларусі ліквідавана за апошнія

---

[1] Акция в Минске и Койданове 1–3 марта 1942 г. // Трагедия евреев Беларуси в 1941 – 1944 гг. – С. 88–90.

[2] Из отчета унтерштурмфюрера СС доктора Беккера о состоянии газовых автомашин // Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг. – С. 90–91.

[3] Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг. – С. 24.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10 тыдняў 55 000 яўрэяў. На тэрыторыі Мінскага раёна яўрэі былі поўнасцю ліквідаваны, але гэта не прывяло да страт у працоўнай сіле. У пераважна польскім раёне Ліды было ліквідавана 16 000 яўрэяў, Слоніме – 8000 і г. д. […] У самім Мінску 28–29 ліпеня было ліквідавана каля 10 000 яўрэяў. З іх каля 6500 складалі рускія яўрэі – у асноўным старыя, жанчыны і дзеці, а таксама непрацаздольныя яўрэі з Вены, Брно, Брэмена і Берліна, якія былі адпраўлены ў Мінск у лістападзе мінулага года загадам фюрэра. […] У Баранавічах, у самім горадзе, яшчэ застаецца 10 000 яўрэяў, з якіх 9000 будуць ліквідаваны ў наступным месяцы. У горадзе Мінску яшчэ застаецца каля 2600 яўрэяў з Германіі і, акрамя іх, – усе 6000 рускіх яўрэяў і яўрэек, якія падчас акцыі былі заняты на розных работах вермахта. […] Пасля запланаваных акцый у Мінску застанецца 8600 яўрэяў і каля 7000 яўряэў у 10 іншых раёнах, уключаючы свабодны ад яўрэяў Мінскі раён»[1].

У канцы 1942 г. былі ліквідаваны найбольш вялікія гета на тэрыторыі генеральных акруг Беларусь і Валынь-Падолія; 6 тыс. чалавек загінулі ў гета г. Баранавічы ў ходзе дзвюх акцый, праведзеных 22 верасня – 2 кастрычніка і 12–19 снежня 1942 г.[2] Акрамя гэтага, найбольш буйныя акцыі прайшлі ў Ашмянах (4000 чалавек), Маладзечне (3000 чалавек), Відзах (2708 чалавек)[3].

Аднак найбольш маштабныя акцыі праводзіліся на Палессі (акруга Валынь-Падолія): Дамачава – 2700 чалавек, гета «А» ў Бярозе-Картузскай – 3500, Кобрын – 4250, Антопаль – каля 2500, м. Лахва Лунінецкага раёна – каля 2000, Іванава – 1500, Лунінец – каля 3000 чалавек. 15–18 кастрычніка было поўнасцю ліквідавана гета ў Брэсце (каля 17 000 чалавек), а 29 кастрычніка – 1 лістапада 1942 г. – гета

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

[1] Из отчета генерального комиссара Белоруссии В. Кубе об уничтожении евреев и борьбе против партизан Белоруссии // Трагедия евреев Беларуси в 1941–1944 гг. – С. 94–95.

[2] Рус, Г. СД у Баранавічах... – С. 77.

[3] Розенблат, Е. «Окончательное решение еврейского вопроса»... – С. 131.

ў Пінску (каля 18 000 чалавек) – апошняе буйное гета на тэрыторыі Рэйсхкамісарыята «Украіна»[1].

2 лістапада 1942 г. у 4.30–5.30 раніцы пачалася акцыя па дэпартацыі яўрэйскага насельніцтва акругі Беласток у лагеры смерці[2]. Спачатку людзей размяшчалі ў транзітных лагерах. Няздольных да перамяшчэння расстрэльвалі на месцы. У транзітным лагеры Богуш было сабрана каля 9 тыс. чалавек, у Беластоку – 12–15, Ваўкавыску – каля 20, в. Калбасіна – каля 30–35 тыс. чалавек. З сярэдзіны снежня 1942 г. пачалася адпраўка людзей у лагеры смерці Трэблінка і Асвенцім. Большасць адразу трапляла ў дзень прыбыцця ў газавыя камеры і крэматорыі[3].

У 1943 г. працэс ліквідацыі яўрэяў працягваўся. З лістапада 1942 да сакавіка 1943 г. толькі ў Гродзенскім гета было праведзена 5 акцый па адпраўцы ў лагеры. 5 лютага 1943 г. павятовы камісар фон Плётц у сваёй справаздачы называў лічбу адпраўленых яўрэяў з падначаленай яму тэрыторыі ў 43 999 чалавек. На 5 сакавіка 1943 г. на тэрыторыі Гродзенскай акругі яшчэ знаходзіліся яўрэі (1061 чалавек), якія былі вывезены 12 сакавіка 1943 г.[4]

21 чэрвеня 1943 г. Г. Гімлер выдаў загад аб ліквідацыі ўсіх гета, якія засталіся на тэрыторыі Остланда. Працаздольных яўрэяў неабходна было перавесці ў канцэнтрацыйныя лагеры, што знаходзіліся пад кіраўніцтвам СС[5]. У гэты перыяд былі знішчаны гета у м. Ілля (каля 2000 чалавек), Глыбокім (4500 чалавек), Валожыне (каля 1500 чалавек)[6]. Апошнія акцыі ў заходніх абласцях Беларусі адбыліся восенню

[1] Розенблат, Е. «Окончательное решение еврейского вопроса»... – С. 131.

[2] Тамсама.

[3] Розенблат, Е. «Окончательное решение еврейского вопроса»... – С. 132; Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1945. Да 50-годдзя Вялікай Перамогі; рэдкал.: І. П. Крэнь (старш.) і інш. – Гродна, 1995. – С. 88.

[4] Розенблат, Е.. «Окончательное решение еврейского вопроса»... – С. 133.

[5] Уничтожение евреев СССР в годы немецкой оккупации (1941–1944): сб. документов и материалов; ред. И. Арад. – Иерусалим: Яд Ва-Шем, 1992. – С. 262.

[6] Трагедия евреев Белоруссии в 1941–1944 гг. – С. 173–176.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1943 г. 17–19 верасня 1943 г. 2700 чалавек з Ліды былі накіраваны ў Майданек і Сабібор. Пазней 350 яўрэяў расстраляны ў працоўным лагеры Навагрудка[1].

Выпрабаванні, што выпалі на долю яўрэйскага народа, не змаглі зламаць яго маральны дух. Нават перад тварам пагібелі людзі імкнуліся ў паэтычнай форме выказаць свае беды. Ствараліся непрафесійныя песні. Прывядзём частку «Песні Гродзенскага гета» ў перакладзе на рускую мову Навума Грабнёва:

Небо серое стало,
И на душе тяжелей.
В гетто согнали немало,
Много тысяч людей.
За проволоку колючую
Загнали нас всех как есть,
Забрали, что было лучшее.
Сказали: «Живите здесь!»[2]

Складана вызначыць лічбу знішчаных падчас акупацыі яўрэяў. У айчыннай літаратуры прыводзяцца лічбы ад 400 да 810 тыс. чалавек[3]. Вядомы даследчык праблемы Халакосту на тэрыторыі нашай краіны Я. Розенблат сцвярджае, што, па няпоўных звестках, страты яўрэйскага насельніцтва толькі ў заходніх абласцях краіны (у яе сучасных межах) складаюць ад 370 да 395 тыс. чалавек. Зразумела, што гэтыя лічбы не могуць быць поўнымі, бо не выяўлены ўсе месцы знішчэння і канцэнтрацыі яўрэяў, адсутнічаюць дакладныя звесткі па колькасці загінуўшых, не бяруцца ва ўлік дадзеныя па населеных пунктах з колькасцю жыхароў меней за 100 чалавек[4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[1] Розенблат, Е. «Окончательное решение еврейского вопроса». – С. 133.

[2] Песни былого. Из еврейской народной поэзии; пер. Наума Гребнева. – М.: Сов. писатель, 1986. – С. 250.

[3] Трагедия евреев Белоруссии в 1941–1944 гг. – С. 25; Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси. – С. 162.

[4] Розенблат, Е. «Окончательное решение еврейского вопроса»... – С. 140.

У выніку палітыкі генацыду фактычна было знішчана амаль усё яўрэйскае насельніцтва, якое ў даваенны час складала 10% жыхароў рэспублікі. Так, па дадзеных на 1944–1945 гг., у г. Брэсце пражывалі толькі 186 яўрэяў (0,45% агульнай колькасці гараджан), у той час як напярэдадні вайны тут налічвалася 25 000 яўрэяў (каля 40% жыхароў горада)[1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] Розенблат, Е. «Окончательное решение еврейского вопроса»... – С. 141.

# *Глава 8*

# СТАНОВІШЧА ЦЫГАНОЎ, ТАТАРАЎ, ЛІТОЎЦАЎ, ЛАТЫШОЎ

Шматлікія нягоды і выпрабаванні, якія прынесла вайна, як і ўсё насельніцтва Беларусі, перажылі цыганы, татары, літоўцы і іншыя нацыянальныя супольнасці. Увага, якая надавалася акупацыйнымі ўладамі гэтым групам насельніцтва, праяўлялася па-рознаму.

## 8.1. Цыганы

Для ідэалогіі гітлераўскай Германіі цыганскае пытанне стаяла на адным узроўні з яўрэйскім. Яшчэ ў снежні 1938 г. Гімлер выдаў пастанову, у якой выказаўся за разгляд «справы цыганоў у аспекце іх расавай чысціні». Ужо ў 1936 г. першыя цыганы з Баварыі патрапілі ў канцэнтрацыйны лагер Дахау. З інкарпарацыяй Аўстрыі ў чэрвені 1938 г. былі арыштаваны прадстаўнікі мясцовага цыганскага насельніцтва і затым вывезены ў Дахау. У верасні 1939 г. усе цыганы з тэрыторыі «Старога Рэйха», Аўстрыі і Чэхіі былі высланы на тэрыторыю Генеральнага губернатарства. У 1940 г. пачаліся рэпрэсіі супраць цыганоў на іншых акупіраваных тэрыторыях. Паводле падлікаў В. Калініна, на тэрыторыі Беларусі на пачатку вайны пражывала каля 7000 цыганоў[1]. У першыя месяцы вайны яны вялі звыклы лад жыцця, зарабляючы на хлеб спевамі і танцамі. У Мінску вясною 1942 г. нават быў створаны цыганскі ансамбль. Аб гэтым пісала газета «Беларуская старонка»: «У беларускім

[1] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган… – С. 95.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народным доме адбыўся канцэрт. У праграме былі харавыя нумары, сольныя спевы, выступленне струннага аркестра і цыганскага ансамбля»[1].

Па меркаванні некаторых даследчыкаў, ужо ў жніўні 1941 г. айнзацгрупам на новых акупіраваных тэрыторыях СССР было загадана распачаць забойства цыганоў, якія, як і яўрэі, лічыліся небяспечным элементам[2]. Шэф айнзацгрупы D, якая адносілася да 11-й Арміі і адказвала за вынішчэнне цыганоў у Крыме, на Нюрнбергскім працэсе даў такое тлумачэнне сваім дзеянням: айнзацгрупы мелі загад гарантаваць бяспеку ў тыле нямецкага войска. Цыганы (як і яўрэі) уяўлялі сацыяльную небяспеку для германскіх войскаў і навакольнага мірнага насельніцтва як паразітуючыя, непрацуючыя элементы. Іх таксама абвінавачвалі ў шпіянажы і дапамозе партызанам[3].

Як адзначае М. Цымерман, сістэматычнага палявання на цыганоў айнзацгрупы не праводзілі. У поле зроку апошніх цыганы маглі патрапіць толькі выпадкова – падчас правядзення карных акцый на пэўнай тэрыторыі, пераправеркі турмаў ці ўсяго цывільнага насельніцтва, у выніку даносу мясцовых жыхароў. Лёс затрыманых вырашаў канкрэтны нямецкі афіцэр. Іх маглі накіраваць на прымусовую працу ці знішчыць[4]. У вырашэнні «цыганскага пытання» акрамя айнзацгруп прымалі ўдзел і іншыя падраздзяленні. Затрыманнем цыганоў займаліся ахоўныя атрады, жандармерыя і паліцыя парадку. Пры гэтым жандармерыя і паліцыя парадку перадавалі іх паліцыі бяспекі і СД. Затрыманыя ж ахоўнымі атрадамі спачатку траплялі ў рукі жандармерыі ці паліцыі парадку, а ўжо адтуль – да паліцыі бяспекі і СД[5].

У жніўні 1941 г. прайшлі масавыя вынішчэнні цыганоў у Каўнасе, Смаленску, Лідзе[6]. У верасні 1941 г. пад Лепелем

[1] Беларуская старонка. – 1942. – 18 крас.

[2] Zimmermann, M. Rassenutopie und Genozid. Die nationalsozialistische «Lösung der Zigeunerfrage» / M. Zimmermann. – Hamburg, 1996. – S. 260.

[3] Тамсама. – S. 261.

[4] Тамсама. – S. 262.

[5] Тамсама. – S. 268–269.

[6] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган… – С. 96.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былі расстраляны 23 цыганы, якія быццам «тэрарызавалі мясцовае насельніцтва»[1]. Такая ж колькасць цыганоў была знішчана за два тыдні верасня 1941 г. у Мінскім раёне[2]. 25 лістапада 1941 г. камендант Генеральнага камісарыята Беларусь Густаў фон Бехтальсгайм выдаў загад № 24 аб неабходнасці знішчэння яўрэяў і цыганоў. У ім адзначалася: «...яўрэі павінны знікнуць з твару зямлі, таксама цыганы павінны быць знішчаны. Захопленыя цыганы падлягаюць расстрэлу на месцы. Пры выяўленні буйных цыганскіх лагераў ці качуючых табараў неабходна неадкладна апавясціць камендатуру вермахта ці начальніка СС і паліцыі з пазначэннем дакладнага месца і часу»[3]. Як піша В. Калінін, «у адрозненне ад яўрэяў, цыганы не вышукваліся айнзацкамандай «В» спецыяльна. Яны траплялі ў рукі карнікаў у асноўным у выніку аблаў беларускай паліцыі, па даносах, пры праверцы турмаў і часовых лагераў... У рукі карнікаў перадаваліся таксама і цыганы, папярэдне затрыманыя вайсковымі часткамі групы армій «Цэнтр»[4].

Палітыка акупацыйных улад да цыганскага насельніцтва Беларусі мела грунтоўнае адрозненне ад палітыкі, якая праводзілася на іншых тэрыторыях. 15 лістапада 1943 г. выйшла пастанова рэйхсміністра акупіраваных усходніх тэрыторый, у якіх праводзілася дваістая палітыка да цыганскага насельніцтва (сярод якога вылучаліся «чыстыя» цыганы (сінці) і «метысы» (мішлінгі)) у камісарыятах «Остланд» і «Украіна». Адпаведна з пастановай, да аселых цыганоў і «мішлінгаў» неабходна было ставіцца, як і да іншых жыхароў краю. Вандроўных цыганоў і «мішлінгаў» ставілі на адзін узровень з яўрэямі і накіроўвалі ў канцэнтрацыйныя лагеры[5]. Да выхаду пастановы ў 1942 г. было ліквідавана цыганскае насельніцтва Ліды, Вілейкі, Клецка.

---

[1] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган… – С. 97.

[2] Тамсама.

[3] Трагедия евреев Белоруссии в 1941–1944 гг. – С. 71.

[4] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган... – С. 96–97.

[5] Kenrick, D. Die Zigeuner. Verkannt, Verachtet, Verfolgt / D. Kenrick, G. Puxon, T. Zülch. – Hannover, 1980. – S. 105.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Дакументы захавалі паведамленні аб знішчэнні цыганоў у Ляхавіцкім і Глыбоцкім раёнах, Гарадзішчы[1].

Па звестках В. Калініна, на тэрыторыі цэнтральнай і заходняй Беларусі цыганы ў сваёй большасці ўтрымліваліся ў канцэнтрацыйных лагерах у Брэсце (на 800 чалавек) і Уздзе (на 260 чалавек)[2].

28 жніўня 1942 г. начальнік жандармерыі Нясвіжа ў рапарце на імя акруговага начальніка жандармерыі ў Баранавічах распавядаў аб вынішчэнні «банды цыганоў» з васьмі чалавек. Яе выкрыў паліцэйскі патруль з мястэчка Сноў каля в. Петухоўшчына. У «банду» ўваходзілі мужчына, дзве жанчыны і пяцёра дзяцей ва ўзросце ад двух месяцаў да 12 гадоў. Яны жылі ў шалашы. Цыганы паходзілі з Друі, а накіроўваліся ў Варшаву. Усіх іх прывезлі ў Сноў, дзе ўвечары расстралялі[3]. У ліпені 1942 г. 60 цыганоў былі расстраляны ў Клецку, а ў жніўні сям'я цыганоў з шасці чалавек – пад Ляхавічамі[4]. Пад Мазыром у маі–чэрвені 1942 г. украінскія карнікі знішчылі некалькі груп цыганоў. Захаваліся сведчанні аб тым, што ў снежні гэтага ж года ў лясах пад Хойнікамі ўкраінскія карнікі высачылі 12 цыганскіх сем'яў. Людзей прывезлі ў горад, прымусілі танцаваць і граць на музычных інструментах. Пасля гэтага апошніх на вачах у мірных жыхароў расстралялі[5]. У лістападзе 1942 г. у Міхноўскім лесе каля п. Калдычава быў расстраляны цыганскі табар, у якім знаходзілася каля 200 чалавек[6].

Цыганы былі аднесены да памочнікаў партызан і станавіліся ахвярамі карных антыпартызанскіх аперацый. Напрыклад, падчас аперацыі «Hamburg», якая праводзілася

[1] Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde… – S. 1065; Трагедия евреев Белоруссии в 1941–1944 гг. – С. 117.

[2] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган... – С. 97.

[3] Тамсама. – С. 98.

[4] Einsatz im «Reichskommissariat Ostland»: Dokumente zum Völkermord im Baltikum und in Weißrußland 1941–1944 / W. Benz, K. Kwiet; hrsg. von J. Matthäus. – Berlin, 1998. – S. 253f.

[5] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган… – С. 98.

[6] Артемчик, Н. Под Барановичами открыт памятник цыганам / Н. Артемчик // Комсомольская правда в Белоруссии. – 2004. – 7 июля.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў студзені 1942 г., у раёне Слоніма былі затрыманы 30 цыганоў з вялікай колькасцю прыпасаў[1]. Увосень 1943 г. у раёне Барысава расстраляны 100 цыганоў[2].

Вынішчэнне цыганоў праводзілася і на тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася ў вобласці армейскага тылу. Згодна з загадам № 25 палявой камендатуры 528 (г. Рагачоў) ад 8 кастрычніка 1941 г., усе цыганы падлягалі арышту і перадачы паліцыі бяспекі і СД[3]. У кастрычніку 1941 г. былі расстраляны 50 магілёўскіх цыганоў, у студзені 1941 г. – цыганы з Мар'інай Горкі[4]. У снежні 1941 г. у час карнай аперацыі ў ваколіцах Магілёва і ў самім горадзе былі затрыманы 1356 чалавек. Сярод іх – «качэўнікі, якія не мелі дакументаў». Колькасць апошніх склала 135 чалавек. З іх 127 асоб былі расстраляны на месцы[5].

У тылавых раёнах армейскіх груповак «Цэнтр» і «Поўнач» дзейнічалі інструкцыі, адпаведна з якімі цыганоў, што на працягу як мінімум двух гадоў вялі аселы лад жыцця, не чапалі, аднак за імі ажыццяўлялася назіранне; цыганы-вандроўнікі перадаваліся айнзацгрупам[6]. У красавіку 1942 г. спецкаманда № 9 расстраляла групу з 20 цыганоў пад Віцебскам. А за два тыдні верасня 1942 г. падчас карнай аперацыі ў раёне Магілёў–Рагачоў фашысты расстралялі 247 цыганоў. У гэтым жа годзе каля Пастаў сумесны карны атрад немцаў і літоўскай паліцыі расстраляў 28 цыганскіх сем'яў[7].

На думку В. Калініна, за гады Вялікай Айчыннай вайны ў выніку карных акцый акупантаў, а таксама на франтах загінула каля 40% цыганскага насельніцтва Беларусі[8]. Спасылаючыся на існуючыя дакументы, Х. Герлах лічыць, што нямецкія акупанты забілі не менш як 3000 цыганоў[9].

[1] Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde... – S. 902.
[2] Тамсама. – S. 1065.
[3] Тамсама.– S. 1063.
[4] Тамсама. – S. 1064.
[5] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган…. – С. 98.
[6] Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde... – S. 1064.
[7] Калинин, В. И. Загадка балтийских цыган… – С. 98.
[8] Тамсама. – С. 100.
[9] Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde... – S. 1066.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 8.2. Татары

Свае асаблівасці мела палітыка акупацыйных улад адносна татараў. Як і ўсё насельніцтва Беларусі, татары перанеслі ўсе нягоды і выпрабаванні, якія прынесла вайна. Разам з тым яны імкнуліся захаваць сваю самабытнасць і культуру. Аб гэтым сведчаць архіўныя дакументы.

Татары не заставаліся па-за ўвагай акупацыйных улад. Спачатку ў верасні, а потым у лістападзе 1941 г. генеральны камісар Беларусі аддаў распараджэнне ўсім абласным камісарам аб прадастаўленні звестак аб колькасці татараў, а таксама асобах мусульманскага веравызнання, «да якіх павінны быць прылічаны таксама і татары», і «што пра іх вядома»[1], а ў лютым 1942 г. усім абласным камісарам быў разасланы запыт рэйхскамісара аб прадастаўленні падрабязных звестак пра татараў. Апошні запыт быў накіраваны на вывучэнне настрояў татарскага насельніцтва, вызначэнне яго лаяльнасці да акупацыйных улад з мэтай прагназавання магчымасці ў будучым выкарыстання татараў у ваенна-палітычных і эканамічных інтарэсах[2]. Звесткі павінны былі ўтрымліваць наступную інфармацыю.

«1. Колькасць (калі яны жывуць ў невялікім раёне і нешматлікіх мясцовасцях, кампактна і замкнута, назву мясцовасці і імёны мусульманскага насельніцтва).

2. Народнасць (напрыклад, татары, туркі).

3. Колькасць мячэцей.

4. Класіфікацыя і склад абшчыны (напрыклад, муфцій – імамы – праўленне, хто зацвярджае імама, хто муфція?).

5. Дзяржаўнае фінансаванне перад і ў час бальшавіцкай улады.

6. Сувязі з замежнымі магаметанскімі краінамі (напрыклад, Турцыяй, Егіптам, Індыяй), вялікім муфціем Іерусаліма.

7. Ці маюць мясцовыя абшчыны вышэйстаячыя духоўныя інстанцыі за мяжою?

---

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 386. – Арк. 12.

[2] Тамсама. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 5. – Арк. 60.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Ці жадае татарская частка мусульманскага насельніцтва пасля вайны заставацца на тым жа месцы, што і цяпер, ці імкнецца перасяліцца ў Сярэднюю Азію?»[1]

Вынікі данясенняў даюць магчымасць аднаўлення статыстычных звестак аб колькасці татараў у асобных абласцях Беларусі на канец 1941 – пачатак 1942 г.

Паводле атрыманых паведамленняў на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь пражывалі 4149 татараў. Пры гэтым не былі падлічаны татары Лідскай, Вілейскай, Навагрудскай і Баранавіцкай акруг па прычыне адсутнасці звестак з месцаў.

Па выніках архіўных пошукаў нам удалося ўдакладніць звесткі. Татары па абласцях размяркоўваліся наступным чынам (гл. табліцу)[2]:

**Колькасць татараў на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь на канец 1941 – вясну 1942 г.**

| Тэрыторыя | Колькасць татараў |
|---|---|
| Мінск (горад) | 1172 |
| Мінск (вобласць) | 1048 |
| Слуцк | 76 |
| Барысаў | 44 |
| Глыбокае | 840 |
| Слонім | 380 |
| Навагрудак | 583 |
| Ганцавічы | 6 |
| Вілейка[3] | 463 |
| Баранавічы[4] | 668 |
| Ліда (на 09.12.1941)[5] | 509 |
| **Усяго** | **5789** |

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 386. – Арк. 4.
[2] Тамсама. – Арк. 29.
[3] Тамсама. – Спр. 425. – Арк. 6.
[4] Тамсама. – Спр. 386. – Арк. 27.
[5] Тамсама. – Арк. 14.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Як можна заўважыць, найбольшая колькасць татараў прыпадае на Мінск і акругу. Татарскае насельніцтва кампактна пражывала ў розных рэгіёнах Беларусі: на поўначы – у Глыбокім і Вілейцы, на захадзе – у Навагрудку і Лідзе, на поўдні – у Баранавічах. Цікава, што на ўсходніх тэрыторыях Беларусі (землях Савецкай Беларусі да 1939 г.) татараў было нашмат меней (Слуцк, Барысаў).

Як жа складвалася рэлігійнае жыццё гэтай супольнасці ва ўмовах акупацыі? Паводле архіўных звестак, у 1942 г. мусульманскія мячэці былі ў Мінску, Слоніме, Глыбокім, Докшыцах, Відзах. Асобнае татарскае пасяленне ў Смілавічах выказала жаданне пабудаваць мячэць. Існаваўшая раней у Слуцку мячэць была разбурана бальшавікамі. Там, дзе не было мячэцей, богаслужэнне праводзілася ў так званых малельнях. «Для веруючых, якія па прычыне вялікіх адлегласцей не могуць дабрацца да гэтых мясцовасцей (дзе былі мячэці ці малельні. – *Д. К.*), богаслужэнне праводзіцца на кватэры часова прызначанага святара»[1]. Кіраўнікамі абшчын усюды былі муфціі. У асобных мясцовасцях, такіх як Глыбокае, Слонім, Слуцк, былі святары (імамы). Вышэйстаячай духоўнай інстанцыяй «раней, у польскія часы, быў муфцій у Вільнюсе»[2], які падпарадкоўваўся галаве мусульманскага свету вялікаму муфцію Іерусаліма[3]. Усе мусульмане, якія пражывалі да 1939 г. на тэрыторыі БССР, былі падпарадкаваны таўрска-мусульманскаму духоўнаму ўпраўленню (муфцію) Крыма (Сімферопаля), «таму што мясцовыя мусульмане з'яўляюцца патомкамі крымска-татарскага насельніцтва»[4].

У дакуменце адзначаўся той факт, што «пры цары ўсе мусульмане карысталіся абаронай дзяржаўных законаў і былі ўраўняны ў праве несці дзяржаўную службу з прыхільнікамі праваслаўя»[5], што «аб дзяржаўных дапамогах ад бальша-

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 386. – Арк. 20.
[2] Тамсама. – Арк. 29.
[3] Тамсама. – Арк. 26.
[4] Тамсама. – Арк. 25.
[5] Тамсама. – Арк. 28.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

віцкіх часоў да сённяшняй пары нічога не ўдалося даведацца. У часы бальшавіцкай акупацыі не толькі не было ніякіх дзяржаўных дапамог, але мусульмане пераследаваліся і іх мячэці часткова зраўноўваліся з зямлёй, часткова – як гэта было ў Мінску – былі ператвораны ў шакаладную і іншыя фабрыкі»[1]. У польскія часы імамы атрымлівалі «ў залежнасці ад велічыні сваёй зямлі ў розных мясцовасцях ад 40 да 100 злотых у месяц. Муэдзін – ад 20 да 30 злотых у месяц»[2].

Мы даведваемся аб тым, што ў час вайны сувязей мусульман Беларусі з замежнымі мусульманскімі ўстановамі не існавала, як і не было вышэйстаячых духоўных інстанцый за мяжой. Устанаўліваліся толькі асобныя асабістыя кантакты паміж магаметанамі Мінска і Вільнюса. Імам мусульманскай абшчыны павінен быў прадстаўляцца генеральнаму камісару і звяртацца па зацвярджэнне.

Паводле звестак, што паступілі ад абласных камісараў, «татары выказваюць настойлівае жаданне заставацца на месцах сваіх даўніх пасяленняў і ацэньваюць патрабаванне перасяліцца ў Сярэднюю Азію як жудаснае і дзёрзкае». У дакуменце далей звяртаецца ўвага на наступнае: «Таму што большая частка татараў размаўляе толькі па-руску, польску ці беларуску, ужо па моўных прычынах не трэба чакаць празмернага перасялення»[3].

У данясеннях абласных камісараў утрымліваецца характарыстыка татарскага насельніцтва як «руплівых, працавітых і мэтанакіраваных людзей, якія пераважна не валодаюць ніякай прафесіяй, а займаюцца, напрыклад, дубленнем і вырабам скур у сваіх майстэрнях дома. Яны лаяльныя і добрасумленныя і не ствараюць ніякіх складанасцей»[4]. Акруговы камісар Навагрудка адзначаў, што «татарскі народ не цікавіцца палітыкай і, хаця і прадстаўляе ў маёй акрузе

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 386. – Арк. 29.
[2] Тамсама. – Арк. 27.
[3] Тамсама – Арк. 29 адв.
[4] Тамсама. – Спр. 425. – Арк. 14.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нязначную меншасць, адчувае сябе добра»[1]. Гэта дазваляла зрабіць вывад аб тым, што «ім спакойна можна дазволіць праводзіць іх мусульманскае богаслужэнне»[2].

Апошні вывад даў нагоду імперскаму міністру акупіраваных усходніх тэрыторый ужо летам 1942 г. выказаць зацікаўленасць у тым, каб «рэлігійнай дзейнасці мусульман не чыніліся ніякія перашкоды, ёй хутчэй трэба разнастайна садзейнічаць агульнымі намаганнямі»[3]. У сувязі з гэтым на тэрыторыі Генеральнага камісарыята Беларусь акупацыйныя ўлады імкнуліся садзейнічаць адпраўленню рэлігійных абрадаў магаметан, выдавалі неабходныя дазволы на такую дзейнасць.

У ліпені 1942 г. муфцію ў Вільнюсе Шынкевічу было дазволена распаўсюдзіць сваю душпастарскую дзейнасць у Беларусі на прыхільнікаў ісламу. «Доктару Шынкевічу далі зразумець, што супраць яго дзейнасці ў якасці вышэйшага царкоўнага кіраўніка магаметан у Беларусі няма ніякіх пярэчанняў. Пазней яму будзе дазволена правесці работу па інспектаванні дзейнасці мусульманскай абшчыны ў Мінску.

Наведванне больш аддаленых мусульманскіх абшчын у генеральнай акрузе пакуль не ўяўляецца магчымым па прычыне надзвычайнага становішча на шашы. Часовае абмежаванне яго задач было абмеркавана з др. Шынкевічам вусна, у выніку чаго ўзнікла ўражанне, што др. Шынкевіч са свайго боку правільна выконвае дырэктывы органаў улады»[4].

Увосень 1942 г. было адкрыта прадстаўніцтва муфцiята ў Мінску, якое ўзначаліў А. Смайкевіч[5]. Гэты чалавек дваранскага паходжання, як піша беларускі вучоны А. Каваленя, працаваў бухгалтарам санстанцыі і ў 1938 г. быў арыштаваны органамі НКУС у сувязі са справай яго брата Сулеймана, які быў выкрыты і арыштаваны як агент польскай разведкі. Пасля нядоўгага знаходжання пад следствам

[1] НАРБ. – Ф. 371. – Воп. 1. – Спр. 386. – Арк. 26.
[2] Тамсама. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 425. – Арк. 14.
[3] Тамсама. – Спр. 433. – Арк. 2.
[4] Тамсама. – Спр. 382. – Арк. 3.
[5] Тамсама. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 5. – Арк. 59.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Смайкевіч быў завербаваны і выпушчаны. У час вайны зблізіўся з акупацыйнымі ўладамі. Ён заняў пасаду ў гарадской управе, а затым арганізаваў татарскае паліцэйскае фарміраванне, якое і ўзначаліў. Гэтае падраздзяленне вызначалася ўзорным выкананнем сваіх абавязкаў, і яму была даручана ахова гарадской управы і іншых важных германскіх аб'ектаў. Сядзіба Смайкевічаў у Мінску па вул. Калгасная, 51 стала месцам, у якім з восені 1943 г. збіраліся прадстаўнікі татарскай моладзі. Было арганізавана вывучэнне нямецкай мовы, наладжана праца харавога і драматычнага гурткоў. Германскія ўлады падтрымалі такую актыўнасць татараў, і ім было выдзелена асобнае памяшканне, якое стала клубам татарскай моладзі[1].

У кастрычніку 1942 г. муфцій мусульман Літвы, Беларусі і іншых Усходніх абласцей звярнуўся да абласнога камісара Баранавіч і генеральнага камісара з просьбай аб арганізацыі мусульманскіх рэлігійных школ у Клецку і Мінску: «Бальшавікі імкнуліся знішчыць самае дарагое для татараў – іх рэлігію, так што татарская моладзь не магла вывучаць Закон Божы. Па той прычыне, што мы, мясцовыя татары, забыліся сваю родную мову, іслам – адзіная сувязь паміж намі. Важнейшая наша задача – увесці выкладанне Закона Божага для нашай моладзі і такім чынам знішчыць кінутае бальшавізмам шкоднае семя»[2].

Выкладаць мусульманскую рэлігію ў Клецку прасілі дазволіць М. Александровічу, які выконваў абавязкі імама мусульманскай мячэці ў горадзе. Меркавалася, што колькасць вучняў у клецкай школе будзе ад 25 да 30 чалавек.

Адносна Мінска муфцій заяўляў, што «ў муфціята адсутнічаюць сродкі на ўтрыманне выкладчыка, таму мы просім Вас прызначыць для выкладчыка (хаджы) мінскай мусульманскай рэлігійнай школы адпаведную зарплату, каб ён мог існаваць. Самі татары не ў стане ўтрымаць настаўніка, бо яны пацярпелі ад бальшавікоў»[3].

[1] Каваленя, А. Прагерманскія саюзы... – С. 166.
[2] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 382. – Арк. 31.
[3] Тамсама. – Арк. 33.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На заяву вельмі хутка быў атрыманы адказ наступнага зместу: «Ні ў якім выпадку не трэба перашкаджаць увядзенню выкладання Закона Божага для татарскай моладзі. Гэтым абвяшчаецца аб дазволе выкладаць Закон Божы»[1]. Аднак дзяржаўных сродкаў на падтрымку запланаваных заняткаў не было выдзелена.

У ліпені 1943 г. рэйхскамісар «Остланда» дазволіў мусульманскаму насельніцтву ўводзіць адзін выхадны дзень (за выключэннем тых выпадкаў, калі гэтаму пярэчаць асобыя ваенна-эканамічныя абставіны) на наступныя святы: Меўлід-Байрам (дзень нараджэння Прарока), Рамазан-Байрам (1 кастрычніка 1943 г.), Курбан-Байрам (8 снежня 1943 г.), Навагодняе свята (Узнясенне ці зыход Прарока, які прыпадаў на 28 снежня 1943 г.). Камісарам раёнаў, акруг і кіраўнікам прадпрыемстваў, на якіх мусульмане складалі большасць, дазваляўся перанос працоўных дзён на царкоўныя святочныя і выхадныя дні паводле грыгарыянскага ці юліянскага календара для працоўных-мусульман. Звярталася ўвага на тое, што выхадныя дні вызначаны толькі на 1943 г. і павінны кожны год вылічвацца нанава з-за несупадзення мусульманскага і еўрапейскага летазлічэння[2].

Працэсы беларусізацыі, якія адбываліся на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь, не маглі не закрануць і татараў. Восенню 1942 г. мула слонімскай магаметанскай парафіі паведамляў у рэлігійны рэферат мясцовай управы Беларускай народнай самапомачы аб тым, што «ўсе гутаркі з парафіянамі ў мячэці, а таксама абвесткі й павіншаваньні паза літургічнай арабскай мовай, вядзе ў беларускай мове, бо гэтая мова ёсць роднай мовай слонімскіх татараў»[3].

Асобна неабходна спыніцца на дзейнасці муфція Якуба Шынкевіча. Пачынаючы з лета 1942 г. ён вёў перамовы з генеральным камісарам Беларусі аб уключэнні прадстаўнікоў татарскай нацыянальнасці ў органы акупацыйнай улады

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 382. – Арк. 32.
[2] Тамсама. – Спр. 2376. – Арк. 10.
[3] Раніца (Берлін). – 1942. – 18 кастр. – С. 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і стварэнні Саюза татарскай моладзі і татарскіх камітэтаў[1]. У канцы лютага 1944 г. на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь налічвалася тры татарскія камітэты: Мінскі (старшыня Сулейман Канапацкі), клецкі (старшыня Мустафа Александровіч), ляхавіцкі (старшыня Аляксандр Варановіч)[2]. Дзейнасць камітэтаў была накіравана на выяўленне і ўлік татарскага насельніцтва, арганізацыю працы па захаванні нацыянальна-культурных традыцый і мусульманскай веры.

Больш складана было са стварэннем Саюза татарскай моладзі. Справа зрушылася з месца пасля правядзення адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы. 25 лютага 1944 г. да Генеральнай акругі Беларусь была далучана частка Генеральнай акругі Літва разам з Вільнюсам, а ў красавіку 1944 г. першую перадалі з адміністрацыйнага падпарадкавання Рэйхскамісарыяту «Остланд» у прамое падпарадкаванне рэйхсміністэрству акупіраваных усходніх тэрыторый А. Розэнберга[3].

У сакавіку 1944 г. пасля перагавораў генеральнага камісара Беларусі Готберга з Шынкевічам у Вільнюс быў накіраваны кіраўнік маладзёжнага аддзела Генеральнай акругі Беларусь обербанфюрэр Шульц. Яго задачай было вывучэнне магчымасці заснавання Саюза татарскай моладзі. Падчас камандзіроўкі Шульц атрымаў запэўненні гарадскога камісара Вільнюса Гінгстата ў надзейнасці муфція Я. Шынкевіча. Пасля адбылася сустрэча ў штаб-кватэры муфція, у час якой былі агавораны ўмовы стварэння Саюза татарскай моладзі. Шынкевіч прапанаваў прызначыць кіраўніком саюза Б. Халецкага. Адначасова вырашылі, што ў старшыні будуць два памочнікі: адзін – па справах мусульманскай моладзі ў Генеральнай акрузе Беларусь, другі – у Генеральнай акрузе Літва. Штаб-кватэру было вырашана пакінуць у Вільнюсе, які ў той час уваходзіў у склад Генеральнай акругі

[1] НАРБ. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 5. – Арк. 1, 3, 6, 81.

[2] Тамсама. – Арк. 4–5.

[3] Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков. – Минск, 1985. – Т. 3. – С. 173; НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 135; Спр. 534. – Арк. 1–3.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь[1]. Пасля падрыхтоўкі належнай службовай дакументацыі па стварэнні Саюза татарскай моладзі і яе ўзгадненне з генеральным камісарам Літвы і Беларусі Готбергам у маі 1944 г. быў атрыманы дазвол на стварэнне Саюза татарскай моладзі «Бірлік» («Адзінства»). Ганаровае адкрыццё арганізацыі адбылося ў літоўскім горадзе Алітус 19 мая[2]. Яе ўзначаліў намеснік муфція Бары Халецкі, беларускае аддзяленне, штаб якога знаходзіўся ў Баранавічах, – Хусейн Якубоўскі[3].

У прывітальнай прамове Якуб Шынкевіч адзначаў: «Гэты «Бірлік» з'яўляецца сімвалам аб'яднання не толькі моладзі, але і ўсяго нашага народа да светлага, болей прыгожага і шчаслівага будучага. Мэта – ўз'яднанне народа, асабістая нацыянальна-народная культура і моцная асоба.

Для ўтрымання адзінства і ўмацавання сваёй нацыянальнай культуры патрэбна здаровая, моцная воля і чэснасць. Толькі моцная асоба мае для народа вялікае значэнне. Таму выхаванне моцных характараў з'яўляецца асноўнай задачай»[4].

Супрацоўніцтва Шынкевіча з літоўскай і нямецкай адміністрацыяй не атрымала падтрымкі сярод большасці татараў-мусульман. Заслугоўвае, аднак, удзячнасці дзейнасць Шынкевіча па спыненні вынішчэння, якое пагражала караімам. Як усходазнавец, маючы кантакты з міністрам Гёбельсам, ён ініцыяваў стварэнне камісіі пад кантролем гестапа, якая прадставіла антрапалагічныя доказы (вымярэнні, вынікі даследаванняў груп крыві) аб тым, што караімы не адносяцца да групы яўрэяў, а з'яўляюцца турэцкай народнасцю. На карысць гэтага былі доказы мовы, культуры і антрапалогіі[5].

---

[1] НАРБ. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 5. – Арк. 44.

[2] Тамсама. – Арк. 81.

[3] Мігунова, А. Прапагандысцкія аспекты маладзёжнай палітыкі і школьнай справы нямецкай акупацыйнай улады... – С. 178.

[4] НАРБ. – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 5. – Арк. 13.

[5] Tyszkiewicz, J. Z historii Tatarów... – S. 147.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апрацаваны матэрыял дазваляе гаварыць аб лаяльнасці як татараў да акупацыйных улад, так і наадварот. Такая сітуацыя спрыяла захаванню культуры татарскага насельніцтва, пашырэнню і развіццю рэлігійнай адукацыі. У значнай меры апалітычнасць гэтага насельніцтва прадухіліла першапачатковыя планы германскай адміністрацыі аб высяленні татараў у Сярэднюю Азію.

## 8.3. Літоўцы

Нашмат менш звестак засталося пра літоўцаў на Беларусі. Прадстаўнікі гэтай этнічнай групы кампактна пражывалі на тэрыторыі паўночна-заходняй часткі Беларусі, якая ўвайшла ў склад акругі Беласток і Генеральнай акругі Літва. Напрыклад, на тэрыторыі Гродзенскага павета, па звестках на верасень 1942 г., пражывалі каля 10 тыс. літоўцаў, што складала каля 4,7% усяго насельніцтва[1].

Палітыка акупацыйных улад на акрэсленых тэрыторыях вызначалася скіраванасцю на разгортванне міжэтнічных сутыкненняў. Ахвярамі польскага шавінізму афіцыйныя ўлады імкнуліся прадставіць (побач з беларусамі) і літоўцаў. Аб гэтым ішла гаварылася ў папярэдніх раздзелах.

У снежні 1943 г. у Гародні і ваколіцах узмацнілася дзейнасць літоўцаў. Падпольныя арганізацыі дзейнічалі пад прыкрыццём афіцыйнага літоўскага камітэта, які імкнуўся да аб’яднання літоўцаў. Адным са спосабаў было распаўсюджванне ўлётак. Вось змест адной з іх:

«Суайчыннікі!

Нямецкія акупацыйныя ўлады накіравалі на Літву латышскія і эстонскія батальёны самаабароны і тут выкарыстоўваюць гэтыя батальёны для такіх мэт, якія выклікаюць у літоўскім грамадстве абурэнне адносна латышоў і эстонцаў (аблавы на тэрыторыі Свянцяншчыны, Ашмяншчыны, Трокскага павета і г. д.), у той час як аналагічныя літоўскія батальёны выкарыстоўваюцца для выканання падобных

---

[1] ДАГрВ. –Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 251.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

функцый у Латвіі і Эстоніі, што ў сваю чаргу настройвае мясцовых жыхароў супраць літоўцаў...»[1]

Літоўскі камітэт у такіх умовах звяртаўся да нямецкіх улад з просьбай аб адкрыцці літоўскай школы ў Гродне ў будынку Асканазі. Пры школе павінен быць інтэрнат. Камітэт займаўся распаўсюджваннем літоўскіх газет і часопісаў. Раённы камісар гродзенскай акругі адмоўна ставіўся да яго дзейнасці, лічачы, што камітэт непатрэбны і ў лютым 1943 г. хадайнічаў перад камандуючым паліцыяй бяспекі ў Беластоку аб роспуску апошняга, заўважаючы, што «было б неразумна садзейнічаць актывізацыі меншасцей дазволам такіх камітэтаў»[2]. Чым скончылася справа – невядома.

Ва ўмовах акупацыі германскія ўлады імкнуліся наладзіць дзейнасць на тэрыторыі Гарадзеншчыны літоўскіх школ. У сувязі са зменай мяжы паміж Рэйхскамісарыятам «Остланд» і адміністрацыйнай акругай Беласток (Усходняя Прусія) улетку 1942 г. 56 вучняў-літоўцаў не маглі працягнуць навучанне ў сярэдніх школах акругі Вільня. Для вырашэння праблемы былі ўжыты захады па адкрыцці сярэдняй школы непасрэдна ў Гродзенскай акрузе (Марцынконісе). Адначасова ў ведамства школьнага інспектара літоўскіх народных школ Гродзенскай акругі перадалі літоўскія народныя школы, якія раней дзейнічалі на тэрыторыях, што перайшлі ў адміністрацыйную акругу Беласток.

1942/43 навучальны год у літоўскіх народных школах пачаўся 21 верасня. Да 15 верасня школы мусілі быць прыведзены ў належны стан, аб чым дырэктары гэтых навучальных устаноў абавязваліся даць справаздачу інспектарам народных школ, ведамства якіх займалася ўсімі пытаннямі школьнай адукацыі. Інспекцыя забараняла выдаваць вызваленні ад заняткаў, заклікала да дысцыпліны і чысціні ў школьных будынках. Школьны інспектар звяртаў увагу на выпадкі зрыву настаўнікамі заняткаў ці спазнення на ўрокі. Дырэктары школ павінны былі адзначаць настаўнікаў,

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 193. – K. 130.
[2] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 26.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія прапускалі ўрокі ці спазняліся. Пасля кожнай чвэрці навучальнага года дырэктарам належала паведамляць пра такіх настаўнікаў школьнаму інспектару.

Як і ў папярэднія гады, перад кіраўніцтвам школ ставілася шмат гаспадарчых пытанняў: нарыхтоўка шарсцяных рэчаў для нямецкіх салдат на Усходнім фронце, лекавых раслін, грыбоў і ягад, збор металічнага лому. Часам збору ягад надавалася большая ўвага, чым непасрэдна заняткам. У лютым 1943 г. настаўнікі і вучні літоўскіх народных школ у акрузе Гродна былі закліканы прыкласці ўсе намаганні ў справе нарыхтоўкі журавін і ягад ядлоўцу. Настаўнікаў абавязвалі «зрабіць так, каб нарыхтоўцы ягад было адведзена як мага болей часу, а ў праграме больш увагі нададзена найбольш важным прадметам»[1]. Інспектар дазваляў праводзіць замест спеваў, фізкультуры і працоўнага навучання больш важныя ўрокі.

Значная ўвага надавалася арганізацыі вучэбнага працэсу. Распараджэннем генеральнага дарадцы па справах народнай адукацыі працягласць адной вучэбнай гадзіны складала 35–40 хвілін у школах, якія працавалі ў дзве змены і мелі электрычнае асвятленне, у школах без асвятлення – 30–35 хвілін. Забаранялася адмяняць заняткі. Іх можна было толькі скараціць з дазволу школьнага інспектара. Пачатак і заканчэнне заняткаў, а таксама перапынкі дырэктары школ маглі скарэкціраваць з улікам магчымасцей для пазменнай працы. Прапаноўвалася скараціць час за кошт змяншэння вучэбнага матэрыялу. «Паколькі яскрава відаць недахоп газы і толькі невялікай колькасці вучняў бывае дастаткова дзённай часткі сутак для падрыхтоўкі хатніх заданняў, асноўная праца павінна здзяйсняцца на ўроках для таго, каб садзейнічаць росту стараннасці вучняў»[2]. Абавязковым было патрабаванне наяўнасці ў настаўнікаў планаў заняткаў.

У выпадку, калі будзе заўважана якая-небудзь варожая дзейнасць, дырэктары школ і настаўнікі абавязаны неадкладна

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 173.
[2] Тамсама. – Арк. 169.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб гэтым паведамлялі школьнаму інспектару. Калі гэта немагчыма здзейсніць асабіста, то неабходна паставіць у вядомасць вясковага старасту ці іншыя органы ўлады.

У распараджэнні ад 28 кастрычніка 1942 г. школьны інспектар адзначаў неабходнасць клопату школ аб магілах нямецкіх салдат, якія «загінулі ў барацьбе супраць бальшавікоў». Гэта было звязана з набліжэннем Дня памінання памерлых. Магілы мусілі быць дагледжанымі і пафарбаванымі[1].

Уся дзейнасць літоўскіх народных школ была прасякнута ідэалагічнымі ўстаноўкамі. Напрыклад, пачынаючы другое паўгоддзе 1942/43 навучальнага года, школьны інспектар у цыркуляры да дырэктараў літоўскіх народных школ звяртаў іх увагу на тое, што «работа ў школах павінна праводзіцца яшчэ больш інтэнсіўна і грунтоўна. Мы пачынаем гэты новы год ва ўмовах вайны, калі наш маленькі народ пад кіраўніцтвам Германіі са зброяй у руках крочыць да карэннай перабудовы Еўропы, каб знішчыць бальшавізм і іудаізм. Усё гэта неабходна прыняць пад увагу і зрабіць арыенціры для настаўнікаў гэтых абласцей і развіцця ўсёй народнай асветы»[2].

## 8.4. Латышы

Аб латышскім насельніцтве Беларусі ў час акупацыі звестак амаль не захавалася. Акупанты не разглядалі латышоў як карэнных жыхароў гэтых зямель, таму іх палітыка была накіравана на рэпатрыяцыю латышскага насельніцтва на тэрыторыю Генеральнай акругі Латвія. Газета «Беларуская старонка», якая выдавалася ў Віцебску, 6 чэрвеня 1942 г. паведамляла, што горад «пакідае першая група латышоў, якія выязджаюць у Латвію». Гэтая група налічвала 1099 асоб. «Ад'язджаючыя праз грамадзянку Гранскалн перадалі Беларускай Народнай Самапомачы 400 кг мукі, з якіх 250 кг прызначаецца як дапамога для яшчэ няз'ехаўшых

[1] ДАГрВ. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. – Арк. 170.
[2] Тамсама. – Арк. 172.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

латышоў і іх сем’яў і 150 кг для беларускага насельніцтва гораду»[1].

У ліпені 1943 г. у Віцебску дзейнічала Рэпатрыяцыйная камісія Латвійскай Народнай Дапамогі. Усе ахвотныя вярнуцца на гістарычную радзіму павінны былі зарэгістравацца ў камісіі з 15 ліпеня да 4 жніўня. З 20 ліпеня да 4 жніўня прадстаўнікі камісіі разам з германскім СД праводзілі рэгістрацыю ў Полацку і Невелі. Латышы, якія пражывалі па-за названымі гарадамі, павінны былі звярнуцца да бургамістраў сваіх валасцей ці ў камендатуру з тым, каб атрымаць пропускі для праезду ў Віцебск. У Латвію рэпатрыянты маглі выехаць праз некалькі дзён пасля заканчэння рэгістрацыі. Дазвол на выезд атрымліваў кожны латыш ці латышка з усімі сямейнікамі[2].

Такім чынам, у перыяд акупацыі назіраюцца значныя адрозненні ў становішчы нацыянальных груп насельніцтва ў розных зонах акупіраванай Беларусі. Цыганскае насельніцтва патрапіла ў адну групу з яўрэямі і адчула на сабе ўсе праявы генацыду. Адносна татараў назіралася лаяльнасць акупацыйных улад. Такая сітуацыя спрыяла захаванню культуры татарскага насельніцтва, пашырэнню і развіццю рэлігійнай адукацыі. У значнай меры апалітычнасць гэтай этнічнай групы прадухіліла першапачатковыя планы германскай адміністрацыі аб высяленні татараў у Сярэднюю Азію. На тэрыторыі акругі Беласток у гады нямецкай акупацыі навучанне па-ранейшаму вялося на літоўскай мове, дзейнічаў Літоўскі камітэт, які займаўся вырашэннем пытанняў культурнага жыцця. На беларускіх тэрыторыях, якія ўвайшлі ў склад Генеральнай акругі Літва, акупанты праводзілі палітыку сутыкнення розных этнасаў: літоўцаў побач з беларусамі прадстаўлялі ахвярамі польскага шавінізму. Латышскае насельніцтва на беларускіх землях тылавога раёна групы армій «Цэнтр» адпаведна з планамі акупантаў павінна было перасяляцца на тэрыторыю Латвіі.

---

[1] «Беларуская старонка». Дадатак да газеты «Новый путь». – 1942. – 6 чэрв.
[2] Новый путь (Витебск). – 1943. – 18 июня. – С. 4.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны заўважны рост значэння фактару этнічнасці для насельніцтва Беларусі. Гэтая з'ява тлумачыцца рэакцыяй на «смутны час», на нявызначанасць і няўпэўненасць у будучыні. Пошук «сваіх» – звыклая з'ява для часоў магутных сацыяльна-палітычных канфліктаў.

Падчас нямецка-фашысцкай акупацыі (з дазволу акупацыйных улад) у розных зонах акупацыі назіраўся рост нацыянальных аб'яднанняў. Яны мелі ў асноўным культурна-дабрачынны характар. Гэта тлумачыцца, з аднаго боку, негатыўным стаўленнем акупацыйных улад да актывізацыі палітычнага жыцця ў рамках палітычных монаэтнічных аб'яднанняў, з другога боку – цяжкім матэрыяльным становішчам большасці карэнных жыхароў Беларусі ва ўмовах вайны.

На тэрыторыі Беларусі акупацыйныя ўлады ажыццяўлялі нацыянальную палітыку, якая была накіравана на дамінаванне арыйскай расы (у сувязі з гэтым мясцовае нямецкае насельніцтва – фольксдойчэ – знаходзілася ў прывілеяваным становішчы), анямечванне і эксплуатацыю насельніцтва. Пры гэтым жыхары-славяне падлягалі частковаму вынішчэнню, а яўрэі і цыганы павінны былі знікнуць увогуле.

Такая палітыка не была накіравана на дасягненне інтэграцыі розных культурна-этнічных супольнасцей. У планах акупантаў не было прадугледжана прызнання права кожнай этнічнай супольнасці на жыццё ў адпаведнасці са сваі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мі стандартамі, перабудова сваіх сацыяльных інстытутаў такім чынам, каб яны маглі адпавядаць запатрабаванням усіх этнасаў. Замест гэтага на акупіраваных тэрыторыях Беларусі (як і на іншых землях) германскія ўлады выкарыстоўвалі тактыку «падзяляй і ўладар». Яны імкнуліся падтрымаць нацыяналістычныя настроі ў шэрагах крайніх палітычных плыней і тым самым распальвалі міжнацыянальныя канфлікты.

Адносіны акупантаў да рускага насельніцтва вызначаліся дваістасцю. З аднаго боку, назіраліся працэсы змагання з рускай інтэлігенцыяй як распаўсюджвальнікам уплываў бальшавіцкай Расіі, што прыводзіла да страты ёй працы і знаходжання ў цяжкіх умовах выжывання. З другога боку, акупанты імкнуліся падтрымліваць рускія нацыяналістычныя, белаэмігранцкія арганізацыі. Падчас акупацыі насельніцтва Беларусі зноў атрымала магчымасць звярнуцца да рэлігіі. На тэрыторыі Генеральнага камісарыята Беларусь акупацыйныя ўлады садзейнічалі захаванню рэлігійных абрадаў магаметан, выдавалі неабходныя дазволы. Рэйхсміністр акупіраваных усходніх тэрыторый улетку 1942 г. выказаў зацікаўленасць тым, каб «рэлігійнай дзейнасці мусульман не чыніліся ніякія перашкоды, ёй хутчэй трэба разнастайна садзейнічаць агульнымі намаганнямі»[1]. Асноўная прычына такой палітыкі – лаяльнасць татарскага насельніцтва да ўлад.

Праз адкрыццё касцёлаў і цэркваў, мячэцей і евангелісцкіх збораў акупанты імкнуліся захаваць нацыянальную замкнёнасць часткі татараў, немцаў, палякаў, рускіх. У сваю чаргу, святары станавіліся праваднікамі нацыяналістычных ідэй, заклікалі да этнічнай кансалідацыі. Пры гэтым ворагамі абвяшчаліся прадстаўнікі іншых канфесій і нацыянальнасцей.

Няшмат звестак засталося пра латышскае насельніцтва. Акупанты не разглядалі латышоў як карэнных жыхароў

[1] НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 433. – Арк. 2.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтых зямель, таму іх палітыка была накіравана на рэпатрыяцыю латышскага насельніцтва на тэрыторыю Генеральнай акругі Латвія. У ліпені 1943 г. у Віцебску дзейнічала Рэпатрыяцыйная камісія Латвійскай Народнай Дапамогі.

Акупацыйныя ўлады ўмела выкарыстоўвалі супярэчнасці паміж рознымі этнасамі. Асабліва напружаным было становішча ў заходніх абласцях Беларусі. Нямецкая прапаганда настройвала беларусаў і літоўцаў супраць польскага насельніцтва, паказваючы апошніх шавіністамі, якія перашкаджаюць іх нацыянальна-культурнаму развіццю.

Германскія ўлады садзейнічалі распальванню нянавісці да палякаў з боку літоўцаў на беларускіх землях, далучаных да Генеральнай акругі Літва. Літоўскае грамадзянства распаўсюджвалася толькі на невялікую частку беларускіх зямель, далучаных да Генеральнай акругі Літва. Тыя, хто не меў грамадзянства, у першую чаргу падлягалі вывазу ў Германію, што вельмі старанна выкарыстоўвалі літоўскія органы самакіравання.

Як адну з дзейсных форм уплыву на свядомасць насельніцтва акупанты разглядалі школу. Адукацыйная палітыка мела сваю спецыфіку ў розных зонах акупацыі. Калі ва ўсходніх раёнах, якія знаходзіліся пад кантролем камандавання групы армій «Цэнтр», фактычна захавалася даваенная сетка рускамоўных навучальных устаноў з невялікай колькасцю школ з выкладаннем на беларускай мове, то на поўдні Беларусі (генеральныя акругі Валынь-Падолія і Жытомір) праводзілася ўкраінізацыя, у цэнтральных абласцях Беларусі (Генеральная акруга Беларусь) – беларусізацыя. Адзначаныя працэсы «нацыяналізацыі» школы ў раёнах, дзе пераважалі прадстаўнікі іншых этнасаў, не спрыялі паразуменню – насельніцтва байкатавала школы, праводзячы заняткі падпольна на сваёй мове.

Пытанне культурна-асветніцкай палітыкі нямецкіх улад адносна фольксдойчэ ў розных зонах акупацыі Беларусі доўгі час заставалася па-за ўвагай даследчыкаў. Школы для дзяцей фольксдойчэ адкрываліся ў розных зонах акупіра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванай Беларусі. Гэта справа лічылася першачарговай. Такія школы часам былі адзінымі, якія існавалі на пэўнай тэрыторыі. З рапарта Усходняй секцыі Дэпартамента Інфармацыі і прэсы Дэлегатуры ўрада Рэчы Паспалітай на акупіраваных тэрыторыях за перыяд з ліпеня да верасня 1942 г. можна даведацца, што «на Беласточчыне існуюць толькі нямецкія школы для фольксдойчэ, затое тайнае польскае школьніцтва апошнім часам сустракае перашкоды з-за таго, што настаўнікі баяцца рэпрэсій. Тайнае беларускае школьніцтва на гэтай тэрыторыі не арганізавана»[1].

Спецыфіка рэгіёну, а менавіта яго поліэтнічны характар, прымусіла акупантаў праводзіць карэкціроўку нацыянальна-культурнай палітыкі. Асабліва яскрава гэта праявілася на поўдні Беларусі (генеральныя акругі Валынь-Падолія і Жытомір). Пры правядзенні ўкраінізацыі акупанты не ўлічылі таго, што ўдзельная вага тытульнага этнасу на гэтых тэрыторыях не перавышала 1%. Намаганні ўлад не далі чаканага выніку – украінская мова заставалася вельмі абмежаванай ва ўжытку, насельніцтва не імкнулася адпраўляць дзяцей у школы з украінскай мовай выкладання. У выніку ў канцы 1943 – пачатку 1944 г. такая палітыка была практычна згорнута.

Намаганні акупантаў па культываванні напружанасці паміж рознымі этнасамі не далі чаканых вынікаў. Простае насельніцтва не імкнулася да ўдзелу ў палітычных гульнях калабарантаў, яно вымушана было супольна шукаць шляхі выжывання ў цяжкіх умовах акупацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] AAN. – Sygn. 202/III. – Teczka 201. – K. 26.

# КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Арад**, **И.** Катастрофа европейского еврейства в советской историографии / И. Арад // Холокост. Катастрофа европейского еврейства (1933–1945): сб. ст. – Иерусалим, 1990. – С. 137–163.

**Артемчик**, **Н.** Под Барановичами открыт памятник цыганам / Н. Артемчик // Комсомольская правда в Белоруссии. – 2004. – 7 июля.

**Барабаш**, **В. В.** Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. В. Барабаш; БГПУ им. М. Танка. – Минск, 1999.

**Барабаш**, **В**. Белорусско-польские отношения в Беларуси в период немецкой оккупации 1941–1944 гг. / В. Барабаш // Шлях да ўзаемнасці: матэрыялы міжнар. навук. канф.; адк. рэд. М. Кандрацюк. – Гродна: ГрГУ, 1999. – С. 149–157.

**Барабаш**, **В.** Поляки и другие национальные общности Гродненщины в годы гитлеровской оккупации (1941–1944) / В. Барабаш // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: материалы междунар. науч. конф., Гродно, 16–18 нояб. 2001 г. / Обществ. об-ние «Союз поляков на Беларуси». – Гродно: ОО «Союз поляков на Беларуси», 2003. – С. 205–211.

**Беларуская** газэта. – 1942. – 22 жн. – С. 4; 15 крас. – С. 4.

**Беларускае** слова (Віцебск). – 1943. – 15 лют. – С. 4; 15 мая. – С. 4.

**Беларуская** старонка. Дадатак да газеты «Новый путь». – 1942. – 6 чэрв.

**Беларусь** в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. коллектива), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко [и др.] – Минск: БЕЛТА, 2005.

**Блізнюк**, **Д. І.** З гісторыі нацыянальнай палітыкі нямецкіх акупацыйных улад на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. / Д. І. Блізнюк // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы навук. канф., Мінск, 6–7 снеж. 2001 г. / У. І. Навіцкі, М. С. Сташкевіч. – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 278–281.

**Блізнюк**, **Д. І.** Нацыянальная палітыка акупантаў на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. / Д. І. Блізнюк // Вес. НАН Беларусі. – 2003. – № 2. – С. 62–67.

**Бракель, А.** Межнациональные конфликты как следствие национальной политики советской и немецкой властей (1939–1944) / А. Бракель // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 22 крас. 2004 г. / гал. рэд. А. А. Каваленя, С. Я. Новікаў. – Мінск, 2004. – С. 77–84.

**Всенародная** борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков: в 3 т. – Минск, 1985. – Т. 3.

**Гольдзін, А. З.** Гета / А. З. Гольдзін, Э. Р. Іофе // ЭГБ: у 6 т.– Мінск: БелЭн, 1994. – Т. 2. – С. 525–526.

**Гродна** ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1945: Да 50-годдзя Вялікай Перамогі / рэдкал.: І. П. Крэнь (старш.) [і інш.]. – Гродна, 1995.

**Грыбоўскі, Ю.** Польска-беларускі канфлікт у Генеральнай акрузе «Беларусь» (1941–1944 гг.) / Ю. Грыбоўскі // Białoruskie Zesz. Historyczne. – 2006. – N 26. – S. 116–167.

**Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці** (ДАБрВ). – Ф. 199. – Воп. 1. – Спр. 22.

**ДАБрВ.** – Ф. 202. – Воп. 1. – Спр. 2, 3, 12.

**ДАБрВ.** – Ф. 203. – Воп. 1. – Спр. 1.

**ДАБрВ.** – Ф. 701. – Воп. 1. – Спр. 1.

**ДАБрВ.** – Ф. 708. – Воп. 1. – Спр. 1.

**ДАБрВ.** – Ф. 2120. – Воп. 1. – Спр. 1, 3, 5, 15, 17, 20, 24, 40, 54.

**ДАБрВ.** – Ф. 2135. – Воп. 1. – Спр. 7, 175–177, 200, 234, 238–241, 253, 254, 290, 325, 348, 360, 377, 399, 405, 624, 625, 678, 679, 704–708, 724–760, 764–768, 770, 783, 842–850, 878–879, 893, 894, 895–898, 911, 917–920.

**ДАБрВ.** – Ф. 2135. – Воп. 2. – Спр. 86, 91, 100, 101, 144, 163, 166, 167, 725–741, 832, 866–874, 1109, 1399.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ДАБрВ.** – Ф. 2136. – Воп. 1. – Спр. 7.

**ДАБрВ.** – Ф. 2149. – Воп. 1. – Спр. 2, 8.

**Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці** (ДАГрВ). **–** Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 33, 58, 100, 188, 271, 284, 289а, 292, 334, 574.

**ДАГрВ. –** Ф. 1332. – Воп. 1. – Спр. 2.

**Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці** (ДАМВ). **–** Ф. 623. – Воп. 1. – Спр. 1, 4, 6, 143, 145, 512.

**ДАМВ.** – Ф. 623. – Воп. 2. – Спр. 1.

**ДАМВ.** – Ф. 688. – Воп. 2. – Спр. 2.

**ДАМВ.** – Ф. 1039. – Воп. 1. – Спр. 22, 35.

**ДАМВ.** – Ф. 1549. – Воп. 1. – Спр. 34.

**Еленская, И. Э.** Документы госархива Брестской области о школьной политике оккупационных властей, 1941–1944 г. (источниковедческий обзор) / И. Э. Еленская // Брестский хронограф. – 1999. – Вып. 2. – С. 230–250.

**Еленская, И. Э.** Документы немецко-фашистских оккупационных органов управления и учреждений как исторический источник (по материалам Госархива Брестской области): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / И. Э. Еленская; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 1999.

**Еленская, И.** Немецкая политика украинизации Белорусского Полесья. 1941–1944 годы / И. Еленская // Загароддзе-3: матэрыялы навук.-краязн. канф. «Палессе ў XX стагоддзі», Беласток, 1–4 чэрв. 2000 г.; уклад. і агул. рэд. Ф. Д. Клімчука, А. Энгелькінг, В. А. Лабачэўскай. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – С. 208–215.

**Жумарь, С. В.** Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны / С. В. Жумарь. – Минск: БелНИИДАД, 1996.

**Жылінскі, М. Г.** Арганізацыя школьнай справы на тэрыторыі Баранавіцкай акругі (1941–1942 гг.) / М. Г. Жылінскі // 55 гадоў перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы: матэрыялы навук.-тэарэт. канф., Мінск, 4–5 мая 2000 г.: у 2 ч. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2000. – Ч. 1. – С. 39–42.

**Жылінскі, М. Г.** Адукацыя на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1944 гг.) / М. Г. Жылінскі; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск: БДПУ, 2006.

**Иеродьякон Василий (Костюк)**. История Полесской епархии (1922–1944) / Иеродьякон Василий (Костюк). – Брест: Брест. обл. тип., 1999.

**Иоффе, Э.** К вопросу об участии татар в Великой Отечественной войне на территории Беларуси / Э. Иоффе // Другая міжнар. навук.-практ. канф. «Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі»: Да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 19–20 тр. 1995 г. – Мінск: БДПУ, 1995. – Ч. 2. – С. 130–137.

**Иоффе, Э. Г.** Страницы истории евреев Беларуси: Краткий науч.-попул. очерк / Э. Г. Иоффе. – Минск: АРТИ-ФЕКС, 1996.

**Иоффе, Э. Г.** Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941–1945 / Э. Г. Иоффе. – Минск, 2003.

**Каваленя, А. А.** Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945) / А. А. Каваленя, А. Н. Мацко // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі. – Мінск, 1998. – С. 30–57.

**Каваленя, А.** Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць / А. Каваленя. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1999.

**Калаткоў, У.** Да пытання аб культурным жыцці ў горадзе Брэсце пад час нямецкай акупацыі (1941–1944 гг.) / У. Калаткоў // Загароддзе-3: матэрыялы навук.-краязн. канф. «Палессе ў ХХ стагоддзі», Беласток, 1–4 чэрв. 2000 г.; уклад. і агул. рэд. Ф. Д. Клімчука, А. Энгелькінг, В. А. Лабачэўскай. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – С. 216–219.

**Калинин, В. И.** Загадка балтийских цыган: Очерки истории, культуры и социального развития балтийских цыган // В. И. Калинин. – Минск: И. П. Логвинов, 2005.

**Калодка, А.** Беларуска-польскія адносіны ў Вялейшчыне пад час нямецкай акупацыі 1941–1944 гг. / А. Калодка // Зважай. – 1981. – № 1. – С. 2–4.

**Катастрофа** в документах. – Иерусалим, 1978.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Катастрофа** европейского еврейства. – Тель-Авив: Джоинт, 1995. – Ч. 1–2.

**Кичихин, А. Н.** Советские немцы: откуда, куда и почему? / А. Н. Кичихин // Военно-исторический журнал. – 1990. – № 8. – С. 32–38; № 9. – С. 28–38.

**Клец, В. В.** Украинские немцы в условиях оккупации в годы Великой Отечественной войны / В. В. Клец // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, современность): материалы междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 6–8 дек. 2001 г. – Витебск: Из-во ВГУ им. П. М. Машерова, 2001. – С. 135–138.

**Крывашэй, Д.** Насельніцтва нямецкага паходжання Беларусі ў 1941–1944 гг. / Д. Крывашэй // Białoruskie Zesz. Historyczne. – 2004. – N 22. – С. 155–174.

**Крывашэй, Д. А.** Архіўныя крыніцы па гісторыі нацыянальных супольнасцяў Беларусі ў 1941–1944 гг. / Д. А. Крывашэй // Гіст. альм. – 2005. – Т. 11. – С. 146–153.

**Крывашэй, Д. А.** Беларуска-польскія адносіны ў гады нямецкай акупацыі / Д. А. Крывашэй // Białoruskie Zesz. Historyczne. – 2005. – N 24. – С. 153–165.

**Крывашэй, Д. А.** Да гісторыі татар-мусульман Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / Д. А. Крывашэй // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць: зб. матэрыялаў міжнар. навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 кастр. 2004 г. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2005. – С. 38–41.

**Крывашэй, Д.** З гісторыі фольксдойчэ на Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны / Д. Крывашэй // Наука и инновации. – 2005. – № 3. – С. 33–39.

**Крывашэй, Д. А.** Польская супольнасць Беларусі падчас акупацыі / Д. А. Крывашэй // Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны: масавыя забойствы нацыстаў: матэрыялы міжнарод. навук.-практ. канф., Мінск, 2 ліп. 2004 г.; адк. рэд. В. Ф. Балакіраў, К. І. Казак. – Мінск: Гіст. майстэрня ў Мінску, 2005. – С. 139–148.

**Крывашэй, Д. А.** Архіўныя дакументы як крыніца для распрацоўкі гісторыі культуры нацыянальных меншасцей Беларусі ў час нямецка-фашысцкай акупацыі (Па матэрыялах архіваў Рэспублікі Беларусь) / Д. А. Крывашэй // Быў подзвіг і была Перамога: матэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыялы арх. чытанняў, прысвеч. 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчын. вайне, Мінск, 12 мая 2005 г.; адк. рэд. Ю. У. Несцяровіч, У. В. Фядосаў. – Мінск: БелНДІДАС, 2005. – С. 118–126.

**Крывашэй, Д. А.** Нацыянальныя меншасці Беларусі ў гады нямецкай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 г.) / Д. А. Крывашэй // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., Гродно, 8–9 дек. 2005 г.; отв. ред. М. А. Можейко. – Гродно: ГрГУ, 2006. – С. 104–108.

**Крывашэй, Д. А.** Нямецкія школы г. Гродна перыяду Вялікай Айчыннай вайны / Д. А. Крывашэй // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зб. навук. арт. / Гродз. дзярж. ун-т; рэдкал.: І. П. Крэнь, У. І. Навіцкі, В. А. Белазаровіч (адк. рэд.) [і інш.] – Гродна: ГрДУ, 2006. – С. 383–387.

**Крывашэй, Д. А.** Украінскі этнас Беларусі ва ўмовах акупацыі / Д. А. Крывашэй // Великая Победа: героизм и подвиг народов: материалы междунар. науч. конф., Минск, 28–29 апр. 2005 г.: в 2 т. / отв. ред. А. М. Литвин. – Минск, 2006. – Т. 2. – С. 80–84.

**Кузьменко, В. И.** Интеллигенция Беларуси в период немецко-фашистской оккупации (1941–1944 гг.). – Минск, 2001.

**Кузьменко, В. И.** Пропагандистское обеспечение оккупационного режима в Беларуси и особенности культурной политики нацистов (1941–1944 гг.) / В. И. Кузьменко // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 16 мая 2003 г.; гал. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск: МДЛУ, 2003. – С. 104–110.

**Кузьменко, В. И.** Германский нацизм и религия: аспекты оккупацонной ситуации в Беларуси 1941–1944 / В. И. Кузьменко // Другая сусветная вайна: новыя аспекты даследаванняў: матэрыялы міжнар. навук. семінара, Мінск, 1 верас. 2003 г.; адк. рэд. В. Ф. Балакіраў, К. І. Казак. – Мінск: НАРБ, 2004. – С. 96–115.

**Кузьменко, В. И.** Политика немецко-фашистских оккупационных властей в отношении научной интеллигенции Беларуси (1941–1944 гг.) / В. И. Кузьменко, Н. В. Токарев. – Минск: Белорус. наука, 2007.

**К'яры, Б.** Лёс беларускіх габрэяў у «Генеральным камісарыяце Беларутэніі». Спроба наблізіцца да незразумелага / Б. К'яры // Беларус. гіст. агляд. – 1999. – № 7. – С. 29–68.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Кьяри, Б.** Советские оккупированные территории, или размышления о немецком господстве в эпоху мировых войн / Б. Кьяри // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 22 крас. 2004 г. / гал. рэд. А. А. Каваленя, С. Я. Новікаў. – Мінск, 2004. – С. 133–142.

**К'яры, Б.** Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.) / Б. К'яры. – Мінск, 2005.

**Лебедева, Н. М.** Введение в этническую и кросс-культурную психологию / Н. М. Лебедева. – М.: Ключ-С, 1999.

**Літвін, А. М.** Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі / А. М. Літвін. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2000.

**Літвін, А. М.** Антысавецкія ваенна-палітычныя фарміраванні на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1944 гг. Вытокі. Структура. Дзейнасць: аўтарэф. дыс. ... д-р. гіст. навук: 07.00.02 / А. М. Літвін; НАН Беларусі, Ін-т гіст. – Мінск, 2000.

**Мігунова, А.** Прапагандысцкія аспекты маладзёжнай палітыкі і школьнай справы нямецкай акупацыйнай улады ў Генеральным Камісарыяце Беларусь у 1941–1944 гг. / А. Мігунова // Пытанні гісторыі, метадалогіі і методыкі выкладання: зб. навук. арт. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1998. – Вып. І. – С. 167–175.

**Мігунова, А. А.** Прапагандысцкая і культурна-асветніцкая дзейнасць нямецкай акупацыйнай улады ў генеральнай акрузе Беларусь (1941–1944): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. А. Мігунова; БДПУ імя М. Танка. – Мінск, 1999.

**Навіцкі, У.** Рэлігійнае жыццё ў гады Вялікай Айчыннай вайны / У. Навіцкі // Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.). – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998. – С. 216–234.

**Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь** (НАРБ). – Ф. 393. – Воп. 1. – Спр. 1, 13, 534.

**НАРБ.** – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 3, 5, 7а, 381, 382, 386, 425, 433, 441, 468, 561, 634, 665, 756, 2376.

**НАРБ.** – Ф. 370. – Воп. 30. – Спр. 381.

**НАРБ.** – Ф. 371. – Воп. 1. – Спр. 64.

**НАРБ.** – Ф. 378. – Воп. 1. – Спр. 698.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**НАРБ.** – Ф. 385. – Воп. 2. – Спр. 5, 20, 39, 64, 69, 73.

**НАРБ.** – Ф. 393. – Воп. 1. – Спр. 13.

**НАРБ.** – Ф. 393. – Воп. 3. – Спр. 42, 113, 114, 117.

**НАРБ.** – Ф. 393. – Воп. 4. – Спр. 6.

**НАРБ.** – Ф. 393. – Воп. 5. – Спр. 19, 20, 68.

**НАРБ.** – Ф. 412. – Воп. 1. – Спр. 19.

**НАРБ.** – Ф. 510. – Воп. 1. – Спр. 1, 13, 108.

**НАРБ.** – Ф. 750. – Воп. 1. – Спр. 353.

**НАРБ.** – Ф. 1370. – Воп. 1. – Спр. 386.

**НАРБ.** – Ф. 4683. – Воп. 3. – Спр. 938.

**НАРБ. Калекцыя «александрыйскіх» мікрафільмаў** (НАРБ. КАМ). – Т–175. – Ролік 235. – Кд. 724282, 724286, 724291, 724292, 724293, 724356–724359.

**НАРБ. КАМ.** – Т–177. – Ролік 380. – Кд. 473136–474147.

**НАРБ. КАМ.** – Т–312. – Ролік 278. – Кд. 839233, 839242.

**НАРБ. КАМ.** – Т–315. – Ролік 1586. – Кд. 000108, 000112.

**НАРБ. КАМ.** – Т–454. – Ролік 105. – Кд. 000987, 000991–000993, 000995, 001110–001112, 001196, 001197.

**Наше слово** (Брест). – 1942. – 12 лют. – С. 4; 5 квіт. – С. 4; 7 черв. – С. 4; 14 черв. – С. 4; 21 черв. – С. 4; 5 лип. – С. 4; 19 лип. – С. 4; 28 лип. – С. 4; 16 серп. – С. 4; 9 серп. – С. 4; 16 серп. – С. 4; 21 серп. – С. 4; 11 верес. – С. 4; 18 верес. – С. 4; 9 жовт. – С. 4; 13 листоп. – С. 4; 20 листоп. – С. 4; 22 груд. – С. 4; 1943. – 12 лют. – С. 4; 1944. – 14 черв. – С. 4; 21 черв. – С. 4.

**Новая дарога** (Беласток). – 1943. – 30 мая. – С. 1–2; 1944. – 5 сак. – С. 2, 6; 4 чэрв. – С. 1, 4.

**Новый путь** (Барановичи). – 1944. – 14 июня. – С. 4.

**Новый путь** (Бобруйск). – 1942. – 12 сент. – С. 4; 31 окт. – С. 4; 21 нояб. – С. 4; 19 дек. – С. 4; 1943. – 10 марта. – С. 4; 13 марта. – С. 4; 20 марта. – С. 4; 27 марта. – С. 4; 10 апр. – С. 4; 1 мая. – С. 4; 5 мая. – С. 4; 12 мая. – С. 4; 19 мая. – С. 4; 22 мая. – С. 4; 3 июня. – С. 3; 10 июня. – С. 3; 3 июля. – С. 4; 25 авг. – С. 3, 4; 11 сент. – С. 4; 1944. – 13 мая. – С. 2; 20 мая. – С. 2.

**Новый путь** (Витебск). – 1942. – 20 марта. – С. 4; 11 июня. – С. 2; 21 июля. – С. 4; 1943. – 18 июня. – С. 4.

**Новый путь** (Гомель). – 1943. – 14 авг. – С. 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Новый путь** (Могилев). – 1943. – 8 апр. – С. 3; 5 июля. – С. 3; 1 сент. – С. 4.

**Новікаў, С. Я.** Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі другой сусветнай вайны / С. Я. Новікаў. – Мінск: МДЛУ, 2004.

**Нюрнбергский** процесс: сб. материалов. – М., 1954. – Т. 1.

**Паўлаў, У.** Беларускія немцы ў Вялікай Айчыннай вайне / У. Паўлаў // Полымя. – 1996. – № 2. – С. 240–252.

**Песни былого.** Из еврейской народной поэзии / пер. Наума Гребнева. – М.: Сов. писатель, 1986.

